Андрэй
Макаёнак

АНДРЭЙ
МАКАЁНАК

# ЗБОР ТВОРАЎ

# Андрэй Макаёнак

## ЗБОР ТВОРАЎ У ПЯЦІ ТАМАХ

Рэдакцыйная калегія:

АЎСЯННІКАЎ Г. С.
БЫКАЎ В. У.
ДЗЯЛЕЦ М. І.
ЛАЎШУК С. С.
МАКАЁНАК Л. І.
МАКАЁНАК С. А.
ШАМЯКІН І. П.

# Андрэй Макаёнак

ТОМ
ТРЭЦІ

КІНАСЦЭНАРЫІ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1989

ББК 84Бел7
М 15

Укладанне і каментарыі
С. С. Лаўшука

В третьем томе Собрания сочинений Андрея Макаенка читатели познакомятся с кинодраматургией. Предлагаются литературные сценарии фильмов «Твой хлеб», «В единой семье», «Счастье надо беречь», «Кондрат Крапива», «Рогатый бастион», «После ярмарки», «Большая опасность» и «Не оставишь меня».

М $\frac{4702120203-053}{М302(03)-89}$ 95—89

ISBN 5-340-00096-6

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1989.

# Кінасцэнарыі

# ТВОЙ ХЛЕБ

СЦЭНЫ СЕЛЬСКАГА ЖЫЦЦЯ

На лузе. У азярыне каля дарогі Сямён з Хведарам ловяць таптухай рыбу. Паднялі таптуху, і твары ў абодвух заззялі. Хведар выцягнуў ладнага шчупака. Але радасць была нядоўгай: шчупак вертануў хвастом і выслізнуў у ваду. Сямён накінуўся на напарніка:

— Эх ты, разявень! Табе толькі курэй шчупаць і то каб хто злавіў.

— Чорт яго ведаў...— мірна апраўдваецца Хведар.

— Пад жабры, пад жабры трэба было браць. А ты...— гарачыцца Сямён,— цюха-мацюха!

— Цьфу! — плюнуў напарнік і вылез на бераг.— Не столькі той рыбы, колькі крыку.

— Куды ты, чорт цыбаты? Лезь назад, можа, зловім яго.

— Лаві сам,— пакрыўдзіўся Хведар.

Сямён паглядзеў на Хведара, прыгадаў яго ціхую ўпартасць і таксама вылез з вады. Міма праязджае воз з сенам.

— Сабе вязеш ці ў калгас?

— Сабе. Працэнты,— тлумачыць фурман.

Сямён і Хведар абмяняліся сур'ёзнымі позіркамі: «Бачыў?»

Хведар скінуў з плячэй торбу з уловам і вывернуў рыбу.

— Дзялі,— загадаў Хведар.

— Што тут дзяліць? У адзін кацёл ды зварым юшку...

— Навошта ў адзін кацёл? — запярэчыў Хведар.— Ты любіш у катле, а я, можа, на скавародцы. Не, дзялі!

Крычаць драчы. Мітуслíва праляцелі спалоханыя качкі.

Каля дзвюх кучак падзеленага ўлову Сямён і яго напарнік — Сямён выбірае з адной кучкі большага шчупака.

— Ты такога выпусціў?

— Бадай, большага,— нічога не падазраючы, адказвае Хведар.

— Ну, дык вось, гэты — мне, а твой — там,— Сямён паказаў на азярыну,— сваіго на волю выпусціў. Падрасце — возьмеш.

— Ну, што ж, хай расце,— Хведар нават не раззлаваўся на напарніка.

Сямён і Хведар валакуць таптуху. У зубах цыгаркі, а прыкурыць няма чым: запалкі падмоклі.

— Эх ты, бусел цыбаты! Не мог у шапку запалкі схаваць,— лаецца Сямён.

— Ну, забыўся. Махорку схаваў, а запалкі...— апраўдваецца Хведар.

Узбоч сцежкі ўзгорачак, густа ўсыпаны суніцамі. Буйнымі, ярка-чырвонымі. Рыбакі спыніліся, збіраюць ягады. Сямён набраў букецік сцебялькоў з суніцамі.

Міма праязджае воз з сенам.

— Эй, сусед! — аклікнуў фурмана Сямён.— Аганёк ёсць?

— Нешта не помню такога суседа,— адказвае фурман.— Ёсць аганёк.

— Мы з «Чырвонай паляны».

— Ад чаго гэта яна пачырванела? Ці не ад суніц? — пажартаваў фурман.

— Ад патугі,— падтрымаў жарты Сямён.— Косім, косім траву, а яна стаіць.

— Ды яно відаць, як вы косіце,— фурман кіўнуў на таптуху.

Прыкурылі.

— На працэнты ці ў калгас? — цікавіцца Сямён.

— На працэнты,— адказвае фурман.

— Чуў, Хведар? — пытае Сямён напарніка.

— Чуў.

— Ну, будзь здароў! — развітаўся Сямён з «суседам».— Пайшлі, Хведар.

Рыбакі пайшлі далей. Праз некаторы час зноў сустракаюцца вазы.

— На працадні? — пытае ўжо Хведар.

— На працадні,— весела адказваюць фурманы.

— Чуў, Сямён? — пытае Хведар.

— Чуў,— адказвае Сямён.

— Пойдзем браць за жабры свайго старшыню,— прапанаваў Хведар.

— Возьмем! — рашуча заявіў Сямён.— Закон — для ўсіх закон.

Лагер калгаса «Чырвоная паляна» на лузе. Звычайныя буданы. Непадалёку ад іх — вогнішча, дзе гатуецца вячэра. Каля аднаго будана старшыня калгаса Цесля і дырэктар МТС Хамякоў.

— Скора за жніво трэба брацца, а ў цябе палавіна лугоў стаіць. Ох і намыляць табе шыю ў райкоме,— прыгразіў Хамякоў.

Цесля чухае патыліцу.

— Народ у мяне такі, што... Другому хоць кол на галаве чашы — не ідзе на работу, і ўсё. А калі і пойдзе, дык робіць як мокрае гарыць,— шукае апраўдання Цесля.

— Не кол трэба часаць, а... Гэтым не апраўдаешся.

Падышлі Сямён і Хведар і перапынілі Хамякова пытаннем.

— Што такое закон, таварыш старшыня? — спытаў Сямён.

Цесля і Хамякоў недаўменна пераглянуліся.

— Ты што? Закон... ёсць закон,— няўпэўнена адказаў Цесля.

— А не дышла!

— Ты, Сямён, ізноў нешта мудрагеліш...

— Не я мудрагелю, а ты, таварыш Цесля. Чаму ў людзей працэнты выдаюць, а ў нас не?

— Якія працэнты?

— Растлумач, Хведар, яны забыліся, не помняць.

— Перад сенакосам вы ж самі праводзілі ў нас сход і чыталі пастанову. Тлумачылі: «Дзесяць працэнтаў скошанага сена выдаваць на працадні. З кожнага ўчастка»,— папракнуў Хведар.

— Савет Міністраў пастанавіў. Закон! — пагрозліва напомніў Сямён.

Адзін за другім падыходзяць касцы і жанчыны з граблямі.

Цесля пайшоў у наступ:

— Не магу. Хоць і закон, а не ма-гу! Для калгаснай жывёлы не хапае кармоў. Зразумеў? Раздаць сена на працадні, а фермы пакінуць без корму? Га?

— А маю карову можна пакінуць без сена? Га?

— Не-е да-ам! Прадай сваю карову.

— А дзецям малако дзе ўзяць?

— Хведара падоіш,— Цесля сказаў і раскаяўся. Зразумеў, што перагнуў.

Хмурыя, нават злыя позіркі Сямёна і Хведара скрыжаваліся на твары Цеслі.

— Чуў, Сямён? Будзеш сведкам,— пакрыўдзіўся Хведар.

— Чуў. Вось што, старшыня, ты можаш жартаваць з Ганнай, а тут гаворка сур'ёзная.

— Сур'ёзная? Калі фермы на зіму застануцца без сена, дык мне не толькі вымовы не мінуць,— мне суда не мінуць! Ясна? У мяне галава баліць за калгасную жывёлу. А пра сваю карову — сам думай. Тут хай твая галава баліць,— адрэзаў Цесля.

— Чуў Хведар?

— Чуў...

— Значыцца, падзяліў?

— Урозь, значыць,— удакладніў Хведар.

— Ну, калі ўрозь, калі аддзяліў мяне ад калгаса... Кацярына! Збірай манаткі. Пайшлі дахаты,— скамандаваў Сямён.

— Як? А...— Хведар не асмельваўся на такі круты паварот.

— Старшыня сам будзе касіць, зграбаць і стагаваць,— растлумачыў Хведару Сямён.

— Сямён! Не гарачыся! — папярэдзіў Хамякоў.

— Пайшлі, хлопцы, па хатах! — Сямён адчуў сябе атаманам.

Сямён, Хведар і яшчэ той-сёй з калгаснікаў, сабраўшы свае манаткі, ускінуўшы косы на плечы, збіраюцца ісці дахаты. Цесля разгублена глянуў на Хамякова.

— Хведар! — гукнуў Хамякоў.

Сямён і яго хаўруснікі чакаюць Хведара.

— У мяне, таварыш старшыня, таксама галава баліць.— Хведар, адчуўшы падтрымку калгаснікаў, не збаяўся дырэктара.

Цесля падышоў да Сямёна і скрозь зубы працадзіў:

— Ты што, Сямён? Сабатаж арганізоўваеш? Ты ведаеш, чым гэта пахне?

У вачах Цеслі блішчыць нядобры, злы агеньчык.

— Не палохай! — Сямён хацеў пайсці, але вярнуўся і дадаў:— Не я закон парушаю, а ты!

Воддаль згрудзіліся мужчыны і жанчыны. Яны гоманам і спрэчкамі праводзяць Сямёна, Хведара і другіх калгаснікаў, якія рушылі дахаты. Толькі дачка Сямёна, Кацярына, стаіць і не ведае, на што рашыцца: ці то падацца следам за бацькам, ці то застацца тут.

— Кацярына! Каму я кажу! — Сямён строга зыркнуў на дачку.

Кацярына вачыма шукае парады: слухаць бацьку ці не? Да яе падыходзіць Хамякоў.

— Кацярына! Ты — камсамолка! — напомніў Хамякоў.— Не слухай яго.

— Рвачы і сабатажнікі!..— Цесля аж пабялеў.— Не, я вам...

— І не рвачы, і не сабатажнікі... Праўда ўсё-такі на іх баку. І не гразі ім! — паківаў пальцам Хамякоў і адвярнуўся.

— Не праўда, а ты на іх баку. Працэнты ім аддай, а кармавы баланс...

— А ў «Дружбе» што? Фермаў няма? Твой сусед...

— Што ты мне ім вочы колеш? — перапыніў Цесля.— Ён гэтымі працэнтамі сваім калгаснікам патурае і маіх разлагае. Патурае прыватніцкім настроям і разлагае дысцыпліну. А ты — патураеш. Будуць мне загрывак мыліць, я не змоўчу.

Ён і сапраўды не змоўчаў. Назаўтра ў кабінеце старшыні райвыканкома Шугаева Цесля «каціў бочку» на суседа, ды спатыкнуўся.

Шугаеў. Значыць, працоўную дысцыпліну ў тваім калгасе разлагае старшыня перадавога калгаса?

Цесля. Таварыш Шугаеў...

Шугаеў. Бязглуздзіцу ты гародзіш, таварыш Цесля.

Цесля. Не магу я выдаваць гэтыя працэнты, Пётр Мікалаевіч. Не ма-гу! Ну памяркуйце самі. У мяне ёсць такі калгаснік Хведар. Усю зіму ён не злазіў з печы, усю вясну не выходзіў на работу, а на сенакос — пайшоў. Чаму? Восенню бульбу капаць таксама пойдзе. Ізноў — чаму? Працэнтамі чалавек жыве. Яму выгадна на працэнты жыць. Паразітаў мы разводзім гэтымі працэнтамі.

Шугаеў. Дык праз нейкага Хведара ты і чэсных калгаснікаў крыўдзіш? Тут, дарагі ты мой, разабрацца трэба.

Цесля. Дапамажыце разабрацца.

Шугаеў. Значыць, палавіна лугоў не скошана. Дзесяць працэнтаў эканоміш, а ўсе сто траціш?

Цесля. Не страчу. Пётр Мікалаевіч, пазваніце Хамякову, і за два-тры дні ўсё сена загатуем.

Шугаеў. Я не дыспетчар МТС. Сам дамаўляйся.

Цесля. Бачыце, таварыш старшыня, у мяне з Хамяковым...

Шугаеў. Што? Раней адмовіўся ад трактарных касілак. Не хацеў лішняй натуралаты здаваць. Эканоміў. А цяпер прыйшла каза да воза. Бяда мне з табой. *(Бярэ тэлефонную трубку.)* Мне дырэктара МТС, Хамякова. Хамякоў?

Кабінет дырэктара МТС Хамякова. Жэня перадае яму тэлефонную трубку, папярэдзіўшы шэптам:

— Старшыня райвыканкома.

Хамякоў падняў тэлефонную трубку.

— Я. Добры дзень, Пётр Мікалаевіч. *(Слухае.)* Ага-а! Ён жа адмовіўся. Прыпёрла? Ведаю. Гэта якраз пры мне было...

У кабінет заходзяць Міця і Юрка.

Міця. Таварыш дырэктар!..

— Ціш-ш,— сыкнула на іх Жэня.— Старшыня райвыканкома гаворыць.

Хамякоў. Цесля сам вінаваты. Абазліў людзей... Добра, я сёння ж пашлю яму трактарныя касілкі і стагамятацель... Ды хлопцы там *(глянуў на Міцю і Юрку)* — арлы. *(Хамякоў мякка паклаў тэлефонную трубку.)*

— Во такія — арлы? — здзівілася Жэня.

— Вось што, хлопцы! Сёння ж перавесці на луг трактары. За тры дні каб сена ўбралі,— распарадзіўся Хамякоў.

— Не магу. Дайце запчасткі. Яго трактар,— Міця паказаў на Юрку,— другі дзень загарае на полі.

— Ні тпру, ні ну... Як укопаны... Юрка нават паціснуў плячамі.

— Ох, гэтыя мне запчасткі...— цяжка ўздыхнуў Хамякоў.— Добра. Пайшлі на склад.

Міця падміргнуў Юрку. Юрка падміргнуў напарніку: ты, маўляў, ідзі, а я тут на хвіліну затрымаюся. Міця глянуў на Жэню, усміхнуўся і пайшоў следам за Хамяковым.

Жэня стаіць, абапёршыся рукамі на стол і патупіўшы долу вочы, нібы чакаючы нечага ад Юркі. Ён падыходзіць і асцярожна, пяшчотна накрывае сваёй рукой руку Жэні. Яна хавае свае рукі за спіной. Тады Юрка спрабуе абняць

Жэню, але тая ўпёрлася рукамі яму ў грудзі і, глыбока дыхаючы, са страхам прашаптала:

— Юрка! Юрка! Ты што, здурэў! Сярод бела дня? Увойдзе хто...

І якраз у гэты час нехта пастукаў у дзверы. Юрка і Жэня спалохана азірнуліся на дзверы. Стук у дзверы паўтарыўся больш настойліва. Юрка адпускае Жэню, заходзіць за стол і садзіцца ў крэсла дырэктара МТС.

— Калі ласка! — дазваляе Жэня зайсці.

У пакой уваходзіць маладая, прыгожая дзяўчына, апранутая па-гарадскому.

— Можна? — пытае яна.

— Вы да каго? — цікавіцца Жэня.

— Я хацела бачыць дырэктара МТС,— тлумачыць дзяўчына, пераводзячы позірк з Жэні на Юрку.

— Я дырэктар МТС,— маніць Юрка.— Што вам трэба, барышня?

— Я не барышня... Я — аграном,— дзяўчына падала Юрку паперу.

Жэня стрымлівае сваю ўсмешку.

— Та-ак...— разыгрывае з сябе дырэктара Юрка, уважліва чытае паперу.— Сапраўды аграном. А куды б вы хацелі, каб вас прызначылі? У кантору ці ў калгас?

— У калгас, вядома,— сур'ёзна адказвае дзяўчына.

— Цудоўна. А ў які калгас? Адсталы ці перадавы?

— Гэта ўжо ваша справа.

— Цудоўна, цудоўна,— хваліць Юрка дзяўчыну.— Ну, Жэня, дык, можа, у «Чырвоную паляну» накіруем? Горшага калгаса не прыдумаеш. Гэта такі калгас...

— Справа ваша,— уздыхнула дзяўчына.

— Што калгас такі — справа не толькі наша...— глыбакадумна зазначыў Юрка.— І яшчэ той-сёй вінаваты...

Вяртаецца Хамякоў разам з Міцем.

Юрка паспешна пакідае дырэктарскае крэсла.

— Я толькі на адну хвіліну замяшчаў вас, таварыш дырэктар,— апраўдваецца Юрка перад начальствам. А дзяўчыне тлумачыць: — Я — трактарыст. Працую ў «Чырвонай паляне». Выбачайце,— і прадстаўляе дырэктару дзяўчыну.— Гэта, Павел Сцяпанавіч, новы аграном.

— Юлія Андрэеўна Шыбан,— перадала дзяўчына тую ж паперку сапраўднаму дырэктару МТС, а Юрку сказала:— А з вамі, спадзяюся, хутка спаткаемся.

— Ужо прызначаеце спатканне? — падкалоў Юрка.

— Не, гэта я прызначаю. Будзеце разам працаваць у «Чырвонай паляне».

— Ну, пайшлі, Юрка. Запчасткі ёсць,— пазваў Міця.

Юрка і Міця, развітаўшыся, выходзяць.

* * *

На лузе. Цесля стаіць на пагорку і ў бінокль назірае за работай калгаснікаў і трактарыстаў.

Касец мянташыць касу.

Група касцоў кладзе пакосы.

Праязджае на трактары Міця. Каця, какетліва ўсміхаючыся, праводзіць яго вачыма.

Цесля вельмі задаволены. Работа спорыцца. Ён паварачваецца і глядзіць туды, дзе ў хмызняку па-над Дняпром каля вогнішча, гатуючы касцам абед, завіхаецца над катламі Ганна — паўнагрудая, яшчэ даволі свежая жанчына. Вочкі ў Цеслі масляцца, твар маладзее, і Ягор Пракопавіч, падправіўшы вусы, павольна рушыў да шалаша.

Ганна заўважыла Цеслю, і твар яе з ямачкамі на шчоках заззяў прыветлівай усмешкай.

— Ягор Пракопавіч, ці не пара вам паснедаць? — не спытала, а, бадай, прапела кухарка.

— Ды яно, бадай, так,— згадзіўся Цесля, усаджваючыся на калодачку.— Ну, цяпер, здаецца, пайшло на лад.

— Калі ласка, Ягор Пракопавіч,— кухарка паставіла перад Цеслем сняданак, нахіліўшыся так, што ледзь не вывалілася з-за пазухі ўсё яе багацце. Цесля, абхапіўшы яе за талію, прыгарнуў да сябе.

— Ой, што вы, Ягор Пракопавіч! — палахліва азірнулася па баках Ганна і... супакоілася,— яшчэ ўбача хто.

— А ты баішся каго?

— А каго мне баяцца? Я — удава,— яўна заігрываючы, прапела кухарка.— А вось ва-ам... Перасуды пойдуць, жонцы дапясуць.

— Жонка далёка адсюль.

— А чаму вы сваю сям'ю не перавозіце ў калгас?

— Мала сэнсу,— сур'ёзна адказаў Цесля.— Надакучыла вазіцца з калгаса ў калгас.— І, перайшоўшы на жартаўлівы тон, дадаў: — Ды і ты б тады стала пабайвацца.

— Я не з баязлівага дзесятка,— какетліва бліснула вачыма Ганна.

— І чаму ты замуж не выходзіш? — зжаваўшы кавалак мяса, пацікавіўся Цесля.

— Заму-уж? — уздыхнула кухарка і нібы жартам растлумачыла.— Не мела б я тады такой увагі вашай, Ягор Пракопавіч.

Цесля зарагатаў.

«Газік» з Хамяковым і Жэняй імчыць па палявых дарогах; паабапал каласуе жыта і пшаніца. «Газік» спыніўся каля поля рослай пшаніцы. Хамякоў вылез, любуецца збажыной.

— Добры старшыня ў «Дружбе»,— падумаў услух Хамякоў.

— І зусім не добры. Малады, а сярдзіты, сур'ёзны,— па-свойму ацаніла Жэня.

— Па ўраджаі відно, што сур'ёзны. Гаспадар. Не тое, што Цесля...

Жэня разглядае «Огонек». Раптам яна выпырхнула з машыны і падбегла да Хамякова.

— Павел Сцяпанавіч! Глядзіце! Брат Міці Каўко.

На развароце «Огонька» фотанарыс: «Выходной день шахтера Сергея Кавко». Фотонарыс Хамякоў прагледзеў без асаблівага захаплення і ўздыхнуў:

— Быў нядрэнным трактарыстам, ды... збег. За доўгім рублём пагнаўся.

«Газік» імчыцца між кустоў. Вось ён выскачыў з лесу, і перад Хамяковым і Жэняй адкрыліся шырокія прасторы заліўных прыдняпроўскіх лугоў. Недзе далёка спяваюць дзяўчаты.

Цесля і група калгаснікаў каля стогамятацеля. Да іх пад'язджае на «газіку» Хамякоў.

— Ну, бачыў, што твае хлопцы наварочалі? — з захапленнем гаворыць Цесля, трасучы руку Хамякову і паказваючы на сціргы сена.

Стракатым матыльком пырхае па лузе Жэня. Яна бяжыць да трактара, на якім працуе Юрка. Яе заўважаюць дзяўчаты, што паблізу ад Юркі варочаюць сена.

— Дзевачкі! Паглядзіце! Хто гэта? — звярнула ўвагу адна з іх.

— Юркава сакратарка,— прыставіўшы да лба далонь казырком, угадала другая.— Бач, засумавала, седзячы ў канторы.

— Дзевачкі! Ану, пяхай параўнуе! А? — прапанавала трэцяя.

Міма на трактары з касілкай па прычэпе праязджае Юрка.

— Юрка! Юрка! — спыняюць яго дзяўчаты.

— Ну, чаго там яшчэ, лялькі? — спыняе трактар Юрка.

— Глядзі! Што гэта? — падманваюць хлопца дзяўчаты, паказваючы ўніз.

Юрка падыходзіць да дзяўчат. Тыя хапаюць яго і валяць у сена. Доўга валтузяцца, жартуюць, Жэня бачыць усё гэта. Засмуціўся яе заўсёды вясёлы тварык, патускнелі ад крыўды яе вочкі, якія дагэтуль наіўна і з захапленнем успрымалі акаляючае хараство.

Дзяўчаты не адпускаюць Юрку. Ён заўважыў Жэню і стараецца вырвацца ад дзяўчат. Юрка пачынае злавацца. А дзяўчаты пяюць:

Ах ты, Юрачка!
Што не жэнішся?
Усе дзеўкі выйдуць замуж,—
Дзе ты дзенешся?

Нарэшце з рогатам дзяўчаты адпускаюць Юрку.

Юрка падыходзіць да Жэні. Твар ягоззяе радасцю.

— Жэня! Вось не чакаў...

— Бачу, што не чакаў...

Юрка апраўдваецца:

— Яны самі прычапіліся... Наўмысля, каб пасмяяцца.

— З каго?

— З мяне.

— Вось дажыў!..

— Э-эй! Трактарыст! Вечарам любезнічаць будзеш, а цяпер касіць трэба! — крычаць дзяўчаты.

Юрка не без злосці глянуў у іх бок.

— Ты надоўга сюды? Заставайся на вечар, Жэня. Тут так хораша...

— Пагляджу... Калі пасміхацца не будуць... з цябе.

— А мне пачхаць...

Да іх далятае залівісты смех дзяўчат.

Жэня як бы на злосць дзяўчатам вельмі прыветліва згаджаецца:

— Абавязкова астануся, Юрачка... А дзе Міця?

Удзячны Юрка паказаў, дзе гуркоча трактар Міці.

Жэня тым жа стракатым матыльком бяжыць да Міці; абмінае Кацю, якая варочае сена. Тая спыняецца, ацэнь-

вае Жэніна пляцце і зноў энергічна раскідае граблямі сена. Раптам Каця насцярожваецца: гул трактара заціх. Каця быстра павярнула галаву.

Каля Міці — Жэня. Вось ён саскочыў з трактара, падбег да Жэні, прывітаўся.

На твары Каці расце трывога, у вачах бліснуў нядобры агеньчык.

Хаваючы за спіной «Огонек», Жэня патрабуе:

— Патанцуй — аддам!

Міця спрабуе абняць Жэню.

— Жэнечка, павалю і адбяру!..

Дзяўчына адбіваецца.

— Міця, Міця! Перастань! *(Адпіхнула яго.)* Як табе не сорамна?! — і аддала яму «Огонек».

Каця адвярнулася і неахвотна стала варочаць сена.

Хамякоў і Цесля наглядаюць за працай Юркі. Ён праязджае міма і на хаду крычыць:

— Ну, старшыня, на вячэру паўлітра! Праз паўгадзіны канчаю.

Цесля, вельмі задаволены, звяртаецца да Хамякова:

— Ну і малайцы! А то б загараў. Жніво на носе. А тут было... ф-фу-у!..

Ён выцер лысіну, нібы стаміўся, нібы ён сам скасіў луг...

Сонца хаваецца за лес. Панарамай пейзаж.

Лепш не напішаш, як у Гогаля: «Чуден Днепр при тихой погоде...» Недзе спяваюць дзяўчаты. І ў песні гучыць сум. Не той сум, што агортвае душу жалем, а той, які выказвае тайну нараджэння кахання ў дзявочым сэрцы. Кліча гэта песня, заманьвае...

Ля кастра заканчваюць вячэру Цесля, Хамякоў, Міця, Юрка і Жэня з кухаркай.

Цесля, наліўшы ў стаканы, запрашае:

— Прыгубім!.. Ну, хлопцы! Па апошняй! Вялікае вам дзякуй за... Ды што гаварыць. Арлы вы, хлопцы. Будзьце здаровы!

Усе чокаюцца:

— На здароўе.

— А цяпер, хлопчыкі, ідзіце адпачываць,— праяўляе клопат старшыня.

— Дзе там адпачываць? — пасміхаецца Хамякоў.

Міця, зразумеўшы намёк, таксама ўсміхнуўся, падміргнуў Цеслі, падняўся, закасаў вышэй рукавы белай сарочкі і рушыў ад кастра. За ім падняліся Юрка і Жэня.

Жэня, адышоўшы крыху ад кастра, папрасіла Юрку:

— Спяваюць як! А? Пойдзем туды.

— Жэня, пабудзем лепей самі...

— Будзем маўчаць і сумаваць?

— З табою і маўчаць прыемна, і сумаваць весела...

— Э, не! Сумаваць не згодна. Бяжым?

І пабегла туды, дзе спяваюць дзяўчаты. За ёю пабег і Юрка.

Над Дняпром, каля сігнальнага ліхтара, звесіўшы ногі з круч, сядзяць дзяўчаты і спяваюць. Каля дзяўчат некалькі хлопцаў: хто сядзіць, а хто прылёг.

Па рацэ плыве пасажырскі параход з агнямі.

Панарамай: дзяўчаты над кручай. Тут і Жэня. На ўзлакотках каля яе ляжыць Юрка. Дзве дзяўчыны, пашаптаўшыся, перамігнуліся. Адна з іх тайком ушчыпнула Юрку. Юрка азірнуўся і, не пазнаўшы гарэзніцу, адсунуўся.

А ў другім месцы, за кустамі — Міця і Каця адасобіліся ў зацішку каля капы сена. Ён ляжыць, а яна сядзіць побач, з замілаваннем варушыць яго валасы. А ён — нібы тоўі кот на прыпеку.

— Сёння дзень мне здаўся такім до-оўгі-ім... А вечар праляціць, і не заўважыш...— Каця млела.

Міця прыгарнуў да сябе дзяўчыну і пацалаваў.

* * *

Падпімаецца над вёскай ранняе летняе сонца. Шчабечуць вераб'і. Кукарэкнуў певень і скочыў з плота. Дружна курадымяць коміны. Ля калодзежа дзве жанчыны. Яны заўважылі Юлю.

— Глядзі ты! А наша аграномша — ранняя птушка,— здзівілася адна.

— Абзавядзецца ўхажорам, ды як прасядзіць да зоркі, то не ўскруціцца так рана.

Юля, праходзячы каля іх, павіталася. Жанчыны ветліва адказалі ёй.

Юля выходзіць на поле.

На роснай траве след ад яе ног. Гэта яе першы выхад у поле. Выхад не на прагулянку, не. Гэта — першыя са-

мастойныя крокі маладога спецыяліста пасля падакучлівых лекцый у інстытуцкіх аўдыторыях, пасля экзаменацыйных сесій, абароны дыплома. Колькі светлых мар, светлых надзей і колькі шчасця свеціцца на яе мілым твары. Гэта яе поле, яе зямля, яе шчасце, надзея і мара. Лёгкі ветрык забаўляецца яе валасамі і стракатай шаўковай касынкай і так пяшчотна ласкоча яе шчокі. Заліваецца серабрыстай песняй жаваранак.

Юля і не заўважыла, што даўно ідзе па полі і па яе нагах ніжэй калена сцёбаюць ячменныя каласкі на маленькіх, кволенькіх, недарослых сцяблінках. Юля спыняецца, і на яе твары відно, як адно пачуццё змяняецца другім: недаўменне, здзіўленне, потым насцярожанасць, непакой і, нарэшце, трывога. Яна павольна апускае галаву, глядзіць сабе пад ногі. Прысела. Асцярожна і далікатна дакранаецца да кволенькіх сцебялькоў ячменю.

Так, напэўна, маці дакранаецца да свайго хворага дзіцяці. Юля абдымае рукамі некалькі каласкоў і пяшчотна гладзіць іх знізу ўгору.

І сумна, сумна стала на полі. Нават жаваранак змоўк.

Потым Юля паднімаецца, і яе твар робіцца суровым, рашучым. Яна энергічна пайшла па полі. Не шкадуе кволых сцебялькоў ячменю: жаласлівасць прапала. Вось яна заўважыла свірэпку, са злосцю вырвала яе з коранем.

— Перагной і торф трэба...— шэпча яна.

Заўважыла васілька, скруціла яму блакітную галоўку.

— Чулыя рукі трэба...

Заўважыла кусцік хвашчу, вырвала і парвала на шматкі.

— Вапна трэба...

Сямён з кустоў назірае за Юляй...

Юля крочыць хутка, размашыста. Вось яна выйшла на дарогу і накіравалася ў вёску. Юля сарвала з шыі касынку і, сціснуўшы яе ў кулаку, ідзе, размахваючы рукамі, шпарка, часам пераходзячы на подбег.

Юля праходзіць міма кустоў і не заўважае Сямёна, які арудуе там сярпом: жне траву і складае ў мяшок. Сямён заўважыў Юлю, выходзіць з кустоў ёй насустрач.

— Пабачыла наша поле? — пытае ён.

— Пабачыла,— абыякава адказвае яна.

— А вось, пабач, суседняга калгаса, «Дружбы»,— Сямён паказаў на поле цераз дарогу.— Гаспадар там...

Юля маўчыць, гледзячы на рослую пшаніцу суседняга калгаса.

— Ідзі паснедай,— ласкава гаворыць Сямён.— Там жонка чакае. А то прастыне ўсё.

Юля глядзіць на серп у руках Сямёна, на мяшок з травой. Сямён перахапіў яе позірк і тлумачыць:

— К зіме сена гатую...

— Сярпом?

— А з касой тут не размахнешся.

— А ці толькі тут?

Сямён уздыхнуў:

— Старшыня сказаў: «Не дам». І не дасць — ён такі.

Юля ідзе па вёсцы. Падыходзіць да праўлення. Старая жанчына, прыбраўшы ў памяшканні, змятае ўжо смецце з ганка.

— Старшыня дома? — пытае ў яе Юля.

— Ды не. Ён сёння тут не начаваў. Можа, да жонкі паехаў. А можа...— жанчына хітравата, нават яхідна ўсміхнулася,— можа, у той начаваў, у Ганны. Не ведаю, галубка.

Вясковая вуліца. Вароты і веснічкі Ганнінага двара. Адчыняецца калітка, і высоўваецца галава Ганны. Глянуўшы ў адзін канец вуліцы і ў другі, яна выпускае з двара Цеслю. Ён таксама азірнуўся па баках і пайшоў праз пляцень. Калі Цесля схаваўся за паваротам, Ганна выйшла на вуліцу, пацягнулася і пазяхнула, як сытая кошка. Да яе падыходзіць Юля.

— Скажыце, вы не бачылі старшыню? — спытала Юля.

— А ці я яго пасу, мілая? Што ён мне, кум ці сват, што вы ў мяне пытаеце?

Юля крышачку пастаяла, нядобра глянула на Ганну і пайшла. Ганна правяла яе вачыма і, ціха пасмяяўшыся, таксама схавалася за каліткай.

Юля сядзіць за сталом у хаце Сямёна. Яго жонка, Марфа, ставіць снядакак перад Юляй.

— Ты маладая, табе здароўя трэба. Нельга так — нашча ў поле,— па-мацярынску ўшчувае яна Юлю.

Жанчына прысела на лаўцы і склала рукі. Каля жанчыны прыніклі двое малых: дзяўчынка гадоў сямі, хлапчук гадоў пяці. Яны з цікавасцю разглядаюць кватарантку.

— Ты налівай, налівай малако,— запрашае Юлю гаспадыня.

Юля бярэцца за гладышык з малаком і падносіць да кружкі. Дзеці праводзяць вачыма гладышык. Юля заўважыла гэта. Заўважыла і маці. Яна шлёпнула адно і другое, праганяючы іх.

— А вы пайшлі прэч!

Юля адстаўляе гладышык з малаком убок.

— Дзякую, цётка...

— Ды што ж ты? Ты на іх не глядзі, яны не галодныя.

— Дзякую, дзякую. Я пад'ела. Пайду.

Сямён заходзіць на двор і вытрасае з мяшка траву.

З хаты выходзіць Юля. З вуліцы заходзіць на двор Каця.

У хаце дзеці кідаюцца да стала, дзе стаіць не даедзеная Юляй яешня.

Каця. Тата! Сёння поїдзеш прычэпшчыкам на трактар. Брыгадзір загадаў.

Сямён. Не пайду! Пыл глытаць? А за што? Бачыў, што расце на полі...

Юля. А на каго ж вы спадзяецеся? На бога?

Каця. То я пайду за цябе.

Сямён. Ідзі, ідзі. А што сеяць будзеце? Унука ці ўнучку?

На полі ідзе трактар. Арэ папар. На трактары за рулём сядзіць Каця. Поруч з ёй Міця. Каця вучыцца вадзіць трактар.

— Стоп! — крычыць Міця.— Хопіць.

Трактар спыняецца. Шчаслівая Каця павярнулася да Міці.

— Ну, што? Умею трошкі?

— Як бог! — жартуе Міця.— А цяпер, Кацюша, ідзі па плугі. Ды глыбока не пускай. Перарасход гаручага.

Каця цалуе Міцю ў шчаку.

Трактар рушыў з месца значна шпарчэй, чым вяла яго Каця. Адвалы трактарных плугоў выварочваюць шырокія і тонкія скібы зямлі.

Трактар праязджае міма Юлі, якая набірае зямлі ў банку.

— Што гэта вы калдуеце, Юля Андрэеўна? — пытае Міця.

— Трэба праверыць глебу на кіслотнасць. Для лабараторыі. Мел трэба вазіць на поле. Хвашчу многа...

— Ну, ну...

Міця спыняе трактар. З радыятара шугае пара, як з паравоза. Верхам на кані пад'язджае Цесля.

— Што такое? Чаму стаў?

— К чортавай мацеры такія парадкі. Па паўдня вады чакаю.

Старшыня зразумеў, што за парадкі лаюць яго, і здзівіўся:

— А дзе Хведар? Няўжо не прывозіў?

— Стары пяхцер!..

На трактары стаіць Каця і ўглядаецца ўдаль.

— Вунь ён, здаецца, вязе! — нарэшце крычыць яна.

Міця і Цесля глядзяць туды, куды паказала Каця.

Міця рашуча адабраў у старшыні паводдзе:

— Дайце мне каня!

Па дарозе, адбіваючыся ад надакучлівых сляпнёў і ваднёў, скубучы прыдарожную траву, ледзь переастаўляе ногі кабылка, запрэжаная ў двухкалёсную бочку з вадой. Прымасціўшыся каля бочкі, клюе носам цыбаты Хведар. Кабыла час ад часу спыняецца, каб грызнуць сябе за бок — адагнаць сляпня.

Пад'язджае Міця. Саскочыў з каня. Зачапіў паводдзе. Асцярожна здымае вядро з бочкі. Вымае шпунт. Налівае ў вядро ваду. Падыходзіць да Хведара, паглядзеў, падумаў і выплеснуў яму на галаву паўвядра вады. Кабыла спынілася. Хведар прачнуўся, павольна выцерся і, павярнуўшыся да Міці, сказаў:

— От бандзіт! — і нечакана для Міці сцёбнуў яго пугай.

Да трактара пад'язджаюць з бочкай Міця і Хведар.

— Ваду вазіць не буду,— катэгарычна заяўляе Хведар Цеслі.— Хуліганства.

Цесля смяецца. Каця таксама пырскае ад смеху.

Хмуры і пакрыўджаны Хведар глядзіць услед Міцю, потым пераводзіць позірк на баразну — вельмі ж яна мелкая. Прысеў, памераў — на палец. Устаў, азірнуўся наўкола. Заўважыў Юлю. Рушыў да яе.

На гэты ж участак разам з Хведарам пераходзіць Юля. Яна вымярае глыбіню ворыва, і твар яе становіцца хмурым, нават злым. Прайшла далей і зноў прамерала.

Яна рашуча накіроўваецца насустрач трактару. Падпімае і апускае руку, загадваючы Міцю спыніць трактар.

— Спыніцеся! — крычыць яна.

Трактар стаў. Міця заглушыў матор.

— Вы што робіце? Што вы робіце?! — сур'ёзна, з сілай і цвёрдасцю ў голасе пытае яна Міцю.

— Ды вось, ад нечага рабіць Кацю катаю па полі,— з яўнай насмешкай адказвае Міця.

— Што гэта за ворыва? — у голасе Юлі гучыць металічная цвёрдасць.

— Папар. Чорны папар,— тлумачыць Міця. Гэта злуе Юлю:

— Хто вам дазволіў так псаваць зямлю?

— Чаму вы такая сур'ёзная? Маладая і сур'ёзная...— кпіць Міця.

— Міця! Кінь дурня строіць! — умяшалася Каця.

— А я хацеў яе сёння вечарам на танцы запрасіць,— павярнуўшыся да Каці, жартуе Міця.

Каця, нібы ўсур'ёз, пляснула Міцю рукой па адной шчацэ і па другой.

— А цяпер не буду,— папрасіўся Міця.

Да трактара падыходзяць Цесля і Хведар.

— Гэта шкодніцтва, а не работа. Штрафаваць трэба за такую работу,— заключыла Юля і села пісаць акт.

— Ух, якая строгая. Як міліцыянер. Свістка толькі не хапае,— здзекуецца Міця.

— Нечага зубы скаліць! Табе дзела гавораць! — ушчувае Хведар.

— Дзядзька Хведар! Ідзі ты... паспі вунь там пад бочкай,— агрызнуўся Міця.— Тут не твая справа.

— Як не мая справа?! Як не мая справа?! — нечакана для ўсіх грозна закрычаў на Міцю Хведар, пасунуўся да трактарыста.— Праз такіх, як ты, чарцей паласатых поле лысае. Ці ж гэта работа?!

— Ша! Ша! Работнік! — агрызаецца Міця.— Чыя б кароўка мычала, а твая б маўчала. Можа, праз такіх гультаёў, як ты, поле лысае. Ты ж на хаду спіш. І хочаш, каб я за цябе рабіў.

Пачуўшы скандал, сюды падыходзяць Юрка і Сямён.

— Ты за сябе рабі! Табе тэхніку далі, машыну не для таго, каб глуміць зямлю,— шуміць Хведар.

— Ты машыну не чапай, Хведар. Яна тут ні пры чым,— перапыняе Хведара Цесля.

— Як ні пры чым? — усхапіўся Сямён.— Мы за гэту тэхніку чорт ведае колькі натуроплаты здаём. Дык хай апраўдвае сябе.

Юля піша: «Акт».

— Правільна! — хваліць Юлю Хведар.— Не на кулака батрачыць!

На твары ў Міці збянтэжанасць. Знік яго гонар.

— Падпішыце акт,— Юля падае паперку Цеслі, і той падпісвае. Юля перадае акт Міцю.— Падпішыце.

Міця ўзяў акт і не ведае, што рабіць: падпісваць ці не.

— Давядзецца за свой кошт перааараць,— рэзюміруе Цесля.

— А-а, прыпякло! — зларадпічае Хведар.— Не на таго нарваўся.

Бездапаможны Міця глядзіць на Юрку і потым падпісвае акт і вяртае яго Юлі. Потым заводзіць трактар, ставіць на большую глыбіню плугі, садзіцца за руль. Трактар натужна зароў і рушыў з месца. Плугі выварочваюць тоўстыя скібы зямлі.

— Вось гэта работа,— усклікнуў Сямён.

Юля ідзе з поля. Каля нізкарослага ячменю яе даганяе Юрка.

— Юлія Андрэеўна!

— А-а, «дырэктар».

— Крыўдуеце?

— Ну, што вы. Я таксама люблю жарты.

— А... Няпраўда. Вы злая.

— Вы так думаеце?

— Скажыце, вы сур'ёзна... думаеце перадаць акт начальству?

Юля спынілася:

— А-а-а... А што?

— Міця — харошы хлопец. Крыху напужалі, і хопіць. Ён болей не будзе.

— Не, Юра, тут справа сур'ёзная. Сам разумееш.

— Юлія Андрэеўна! Не падводзьце хлопца, я вас прашу. Колькі мы тут заробім, яшчэ невядома, а вылічаць з яго столькі, што... А ён збіраецца жаніцца.

— На Kaці?

— На Kaці.

— Юра, у вас вельмі чулая душа і вы добры друг, але... Паглядзіце,— яна паказала на нізкарослы ячмень.— Вось яго работа. А што Каця заробіць? Зразумей, Юрка, не мне гэта трэба, а людзям. Абавязкова перадам акт. Іначай не магу, Юра.

— Я ж казаў — злая.

— Вы мяне крыўдзіце, Юра.

— Што сказаў праўду?

— Юра! Вы прасіце ў мяне што хочаце, толькі не гэта.

Юрка паглядзеў ёй у вочы і ўбачыў: хадайнічаць за Міцю больш нельга. Юля мае рацыю.

* * *

Кабінет дырэктара МТС Хамякова. Ён гаворыць па тэлефоне.

— Ды зразумейце вы: уборачная пачынаецца, а ў мяне дванаццаць трактароў стаяць як укопаныя. Што значыць: не крычы? Тут ваўком выць трэба. Як сабе хочаш, а я еду. Што? Выйдзе. У абком пайду. Сакратар вам паможа шукаць! Алё! Алё! База! *(Пахукаў у трубку і кінуў яе на апарат.)* От бюракраты!

У кабінет заходзіць Юля.

— Таварыш дырэктар, прашу вас, паедзем у «Чырвоную паляну».

— Не магу. Я еду ў вобласць.

— Але ж там бяда. Там няшчасце.

— А што там такое?

— На полі... ячмень... Вось такі ячмянёк. (Юля аж прысела, каб паказаць.) Вы б толькі глянулі...

— ...і ён бы стаў вось такім? — Хамякоў падняў руку вышэй галавы.

— Павел Сцяпанавіч! Там не да жартаў,— папракнула Юля.

— Я і не жартую. У мяне большы клопат ёсць. Запчасткі! — Хамякоў пакіраваўся да дзвярэй.

— А ўраджай? — Юля не пускае яго, загарадзіўшы выхад.

— Дарагая Юлія Андрэеўна! Нам даведзены план уборкі. І калі мы яго не выканаем, мне сківіцу звернуць на патыліцу і скажуць, што так было. Дванаццаць трактароў стаіць. Запчастак чакаюць. Перад самай уборкай. Вы разумееце гэта?

— А што ж там убіраць? Пра ўраджай думаеце?

Хамякоў здзівіўся яе смеласці і напорыстасці.

— О-а! Пра ўраджай? А... а... Па гэтай лініі, дарагая Юлія Андрэеўна, вы мая правая рука, так сказаць, мой першы памочнік у калгасе. Вы ж участковы агранам, вам такія правы дадзены, што... І навуку далі... Так што дзейнічайце ваўсю... А як жа?.. Мне запчасткі, а вам ураджай! — Сказаўшы гэта, ён абышоў Юлю і ўжо ў дзвярах выгук-

нуў: — Па ўраджаю — вы мой першы намеснік... у сваім калгасе...

— Я — намеснік? Тады вось...— Юля перадае Хамякову акт.— Прымайце меры.

Хамякоў бярэ ў Юлі акт і прабягае яго вачыма.

— Да-а... Па закону, відаць, штрафаваць трэба? — пытае Хамякоў.

— Вы паслухалі б, што калгаснікі пра МТС кажуць...

— От пягоднік... А лічыўся перадавіком... Эканомія гаручага... І ўсё-такі нельга штрафаваць.— Хамякоў цяжка ўздыхнуў.

— Чаму?

— Збяжыць. Кіне трактар, і ўсё. Дзе я зараз знайду трактарыста?

— Значыць...

— Нічога не значыць! Я з ім пагавару. А вы там не давайце ім спуску,— Хамякоў, адчыніўшы дзверы ў суменжны пакой, гукнуў: — Жэня! Нясі зводкі.

Заходзіць Жэня з папкай папер. Хамякоў акунаецца ў іх. Адны падпісвае і адкладвае ўбок, а другія кладзе сабе ў палявую сумку.

Юля выходзіць з кабінета.

Жэня сочыць, як матылёк б'ецца аб шкло ў акне. Нарэшце Жэня пашкадавала гэтае бездапаможнае стварэнне і, расчыніўшы акно, выпусціла матылька на волю.

Да канторы пад'ехала «Пабеда». З машыны вылез Сяргей. Жэня войкнула, пазнаўшы Сяргея, ці то ад нечаканасці, ці то ад захаплення і радасці.

Хамякоў, адарваўшыся ад папер:

— Што з табой? Накалолася?

Жэня з захапленнем:

— Ён!

— Хто? — зацікавіўся Хамякоў.

У кабінет заходзіць Сяргей. Ён, відаць, рады сустрэцца з былым сваім начальнікам.

— Павел Сцяпанавіч! Можна?

— О-о! Сяргей! Ну заходзь, шахцёр, заходзь.

Сяргей вітаецца з Хамяковым. Шчыра трасуць адзін другому рукі.

— Не забываеш землякоў. У водпуск? Даўно?

— Толькі што еду.

— На сваёй «Пабедзе»?

— Сваім ходам.

— Чытаў, чытаў я, брат, пра цябе. Герой?А?

— Які там герой. Ну, а як у вас тут?

— «У вас»? Бач ты! У нас па-старому: аром, сеем, жнём, малоцім.

— Ну, а як тут Міцька наш?

— Брат? Трэба было б праехаць туды, ды няма калі. У вобласць спяшаюся, па запчасткі. Вось, на, пачытай. Пагавары там з ім,— Хамякоў падаў шахцёру акт.

Сяргей уважліва чытае акт і хмурыць лоб.

— Камандзіроўку не забудзьце, Павел Сцяпанавіч,— напамінае Жэня.

Хамякоў *(хаваючы ў кішэню паперу, да Сяргея)*. Ты яшчэ не ажаніўся?

Сяргей. Пакуль што не.

Хамякоў. Аставайся тут. Мы цябе ўраз ажэнім. Брыгаду трактарную дам такую, што...

Сяргей. Не, Павел Сцяпанавіч. Ад дабра дабра не шукаюць.

Хамякоў *(глянуўшы на гадзіннік)*. Толькі, Сяргей, глядзі, не ўздумай зманьваць маіх трактарыстаў на свае шахты. Ну, я паехаў. Будзь здароў. Прыязджай заўтра, пагутарым, а сёння, выбачай, дыхнуць няма калі.

Сяргей праводзіць Хамякова да яго «казла». Хамякоў сеў на машыну і паехаў.

Жэня з акна пазірае на Сяргея.

Сяргей. Колькі ўжо год яму няма калі дыхнуць...

Жэня. Вы зараз дадому?

Сяргей. Без перасадкі.

Жэня. А можна мне з вамі пад'ехаць?

Сяргей *(змерыўшы яе, ацаніўшы)*. Калі ласка! А мы не заблудзім з вамі?

Жэня. Не. А што, вы за тры гады дарогу забылі?

Сяргей. Забыць не забыў, а выпадкова збочыць не на той прасёлак магу.

Па прасёлачнай дарозе, міма бярозак і кустоў, імчыцца «Пабеда». Поруч з Сяргеем Жэня.

— А я ў «Огоньку» чытала пра вас. І фота там былі.

Сяргей задаволены. Дастае металічны сундучок з манпансье:

— Прашу.

— Дзякую! — Жэня ахвотна частуецца цукеркамі.

Машына вільнула задам і схавалася ў кустах.

Па дарозе ў лесе Юля. Яе даганяе «Пабеда».

— Аграномша з «Чырвонай паляны»,— папярэдзіла Жэня Сяргея.

— Гэта яна на Міцю акт напісала?

— Яна.

Машына наязджае на Юлю. Юля саступае ўбок, але машына зноў на яе наязджае і спыняецца. Сяргей высоўваецца з дзверак.

— Сядайце, падвязём, таварыш агроном.

Юля не рашаецца.

— Па дарозе. Мы таксама ў «Чырвоную паляну».

Юля заўважыла побач з Сяргеем Жэню і садзіцца ў машыну.

— Вы хоць бы пазнаёмілі нас,— звяртаецца Сяргей да Жэні.

— Гэта — брат Міці,— знаёміць Жэня.

— У мяне сваё імя ёсць: Сяргей. А вас? Юлія Андрэеўна Шыбан?

— Адкуль вы ведаеце? — натуральна здзівілася Юля.

— Чытаў ваш акт на Міцю.

Машына фыркнула і паехала.

Да трактара Міці на полі едзе «Пабеда». Спыняецца. З машыны вылазяць Сяргей, Жэня і Юля. Міця заўважыў і пазнаў брата. Спыняе трактар і скочыў з радасным крыкам:

— Сяргей!

Браты абнімаюцца, цалуюцца, а пасля з нейкай няёмкасцю і шчырай цікаўнасцю аглядаюць адзін другога.

— А гэта — Каця...— нарэшце гаворыць Міця і, не чакаючы дагаварваючы, ізноў паўтарае, каб Сяргей сам дагадаўся.— Каця...

Сяргей разглядае Кацю, якая крыху збянтэжылася ад такога знаёмства. Нарэшце, задаволены агледзінамі, Сяргей ветліва і па-сваяцку вітаецца:

— Ну, здарова, Каця,— і паціскаюць рукі.— Якая вырасла!

Міця ажывіўся пасля труднага знаёмства сваёй нявесты з братам, падыходзіць да Жэні, паціскае руку, павяртаецца да Юлі і... не вітаецца, не падае рукі. Яны пасярожана глядзяць адно другому ў вочы. За імі сочаць Сяргей, Каця і Жэня. Чакаюць, што ж будзе. Нарэшце Каця, якая стаяла за спіной Міці, тайком тыцкае кулаком яму ў бок. Міця падае руку Юлі:

— Добры дзень.

Юля ўсміхнулася, падала руку, але заўважыла:

— Мы з вамі сёння бачыліся...

Міця на нейкі момант разгубіўся, але ўспомніў:

— Але не віталіся.

Сяргей падыходзіць да баразны, вымярае і рэзюміруе:

— Глядзі ты! Памагло, значыць? А? — і смяецца.

— Ужо і табе нагаварыла? — пытае Міця.

— Не. Яна нічога мне не гаварыла. Мне Хамякоў акт паказаў,— растлумачыў Сяргей, каб Міця не думаў, што наябеднічала Юля. Міця сярдзіта паглядзеў на Юлю.

— Толькі без скандалу,— папярэдзіў Сяргей.— А то сапсуеш нам сёння вечар. Запрашаю і вас,— звярнуўся да Юлі Сяргей,— і вас, Каця, і абавязкова вас, Жэня.

— А мяне? — падбег Юрка і ветліва вітаецца з Сяргеем.

— Ну, якая вечарынка без Юркі?

І калі сонца схавалася за небасхіл...

Калі светлы вечар спусціўся над вёскай...

Скрозь расчыненыя насцеж вокны лілася мелодыя старой шахцёрскай песні. Баян расказваў, як:

Маладога канагона
Нясуць з разбітай галавой...

Калі падысці бліжэй да хаты, разгарнуць пышныя кусты вяргіняў у палісадніку і зазірнуць у акно, дык можна ўбачыць, што на стале ўжо мала засталося закускі, што бутэлькі апарожнены, а Сяргей іграе на баяне шахцёрскую песню. Жэня, як зачараваная, глядзіць на Сяргея і слухае плач баяна. Юрка заўважыў гэта і занепакоіўся. Ён выглянуў у акно і ўбачыў залітую срэбрам Сяргееву «Пабеду». І зашчымела Юркава сэрца. Ён нахіліўся да Жэні і прашаптаў:

— Жэня! Выйдзем на вуліцу. Паглядзі, як там хораша!

— Пачакай,— адказала Жэня, не адводзячы вачэй ад Сяргея.

А Сяргей кончыў іграць.

Уздыхнула і спытала ціха:

— А, відаць, страшна ўсё такі ў шахце пад зямлёй?.. А раптам абваліцца...

Сяргей усміхнуўся.

— Не, Жэнечка, гэта старая песня. Цяпер на шахце парадкі другія. Там цяпер такая тэхніка і такая... мебліроўка, што... не шахта, а падземны палац. Туды такія капіталы ўкладаюць...— Сяргей падміргнуў.

— Відаць, здорава зарабляюць шахцёры, а? — наперад ведаючы адказ, спытаў Міця.

— Не ўкраў жа я сабе «Пабеду». Шахцёрам, брат, чэсць і пашана. Не абы-што дабываем, а хлеб для прамысловасці.

— І калі ўжо нам будзе такая ж чэсць і пашана? — спытала Каця.

І тое, што сказала гэта Каця, было нечаканасцю для ўсіх прысутных. Каця, як бы апраўдваючыся, дадала:

— Мы ж таксама не абы-што, для людзей хлеб дабываем.

— Будзе, Кацюша, будзе і нам чэсць і пашана. Пачакай,— абняўшы Кацю, сказала Юля.

Сяргей усміхнуўся, сціснуў баян, і ён жаласліва войкнуў.

Па дарозе бяжыць грузавік з чырвоным палотнішчам: «Лепшы хлеб — дзяржаве!» Праязджаюць фурманкі з поўнымі мяхамі. Насустрач — вазы са снапамі.

Паабапал дарогі — даспяваючыя збажына, бабкі, копы.

Жніво ў разгары.

Недзе рытмічна махаюць крыллямі-граблямі жняяркі.

Услед за жняяркамі кланяюцца жанчыны — вяжуць снапы.

Хведар едзе на возе са снапамі. Выязджаючы з поля на дарогу, крыва пакладзены воз яго перакуліўся ў кювет. Крэкчучы, падняўся Хведар, ад злосці плюнуў і вылаяўся. Адной рукой пашкроб патыліцу, а другой пачухаў спіну і шпурнуў выспяткам адзін, другі сноп, нібы яны былі вінаватыя ў яго бядзе.

Да няўдачніка Хведара падыходзіць Цесля.

— Што ты робіш? Што ты робіш, расцяпа! — накінуўся ён на Хведара.— Колькі таго дабра, дык і тое хочаш раструсіць па дарозе. Як ты возіш?

— Скажы дзякуй, што і гэтак важу,— хмура адказаў Хведар.

— Ты каму возіш? Чорту лысаму ці сабе? — крычыць Цесля.

— То-та што чорту лысаму,— бурчыць Хведар.

— А потым будзеш гарлаціць: «Чаму хлеба мала па працадзень выдаюць?»

— А то не? Хваробу тут атрымаеш, а не хлеб. З чаго? З гэтага? — Хведар падхапіў невялічкі снапок нізкарослага ячменю і ледзь не тыцнуў ім пад нос Цеслі.

— Паразіт ты, вось хто ты! Ты і гэты ўжо абмалаціў. Цьфу! — разгневаўся Цесля і пайшоў ад Хведара.

Следам за жнinfoяркамі вяжуць снапы Марфа, Ганна і другія жанчыны.

Ганна працуе ляніва, нібы адбываючы павіннасць. Вось яна звязала сноп і, вялая, разморапая ад спёкі, пайшла к другому. К снапу, вязанаму Ганнай, падыходзіць Юля і заўважае шмат каласоў, рассыпаных каля снапа. Юля нагінаецца, збірае каласы. Потым падыходзіць да Ганны са жменяй каласоў у руцэ. Правярае: на новым месцы Ганна пакінула каласоў не менш.

— Паглядзіце, што пасля вас астаецца на полі,— стрымліваючы хваляванне, гаворыць Юля, паказваючы каласы.

Ганна разгінаецца і, цераз плячо глянуўшы на Юлю, пагардліва пытае:

— Ну?

— Каго ж вы абкрадаеце? Вы ж сябе абкрадаеце,— з нейкім болем у голасе ўшчувае Юля Ганну.

Жанчыны, унюхаўшы сварку, збіраюцца каля Юлі і Ганны.

— Ну, сябе. А табе што, мілая? — ізноў з той жа пагардлівасцю адказвае Ганна.

— На квадратным метры ў вас па восем каласоў. На гектары астаецца па два цэнтнеры хлеба,— спакойна тлумачыць Юля.

Ганна крута павярнулася да Юлі і змерыла яе ад галавы да ног варожым позіркам. Юля ўжо звяртаецца да другіх жанчын:

— Калі па ўсім полі будзем так раскідацца каласамі, мы страцім каля трох тысяч пудоў хлеба,— і, павярнуўшыся да Ганны, запытала: — Што вы па працадзень атрымаеце?

— Мілая! Не твой гэта клопат. Ты сваю зарплату ўсё роўна будзеш мець.— Ганна адвярнулася ад Юлі, выказваючы гэтым поўную пагарду да дзяўчыны, Юля нават сумелася. Нібы шукаючы падтрымкі, яна глянула на Марфу.

— Не, мая рыбка, наш гэта клопат! — ваяўніча ўмяшалася Марфа.— На сваім гародзе як хочаш, а тут...

Зашумелі, загаманілі жанчыны, беручы пад абарону Юлю.

Воддаль стаіць Цесля і, пасміхаючыся, пазірае за жанчынамі. Ён рашыў не ўмешвацца... Бараніць яе — перад людзьмі грэх. А паўшчуваць перад жанчынамі — сам потым пашкадуеш, бо страціш ласку яе — грахаводніцы. Так і пайшоў у поле, нібы нічога не чуў.

* * *

Стаіць трактар Юркі. Стаіць на прычэпе да трактара і камбайн. Юрка корпаецца ў машыне. Падыходзіць Юля. Нарэшце, перапэцканы, Юрка павярнуўся і паказвае Юлі незразумелую ёй і невядомую нейкую дэталь ад машыны.

— Ну, вось і ўсё. Будзем стаяць,— сказаў ён і пхнуў трактар, як жывую істоту.— У-у, старая бандура.

— А я так спадзявалася, што сёння кончым гэты ўчастак. Узаралі б пад азімыя. Каторы год севазварот парушаецца.

Невясёлы Юрка стаіць і разглядае на руцэ дэталь.

— А без яе трактар не можа пайсці? — наіўна спытала Юля.

— Не,— усміхнуўся Юрка яе наіўнасці.

— Можа, у майстэрні запасныя ёсць?

— Наўрад,— сумняваецца Юрка.

— А ўсё ж такі трэба было б з'ездзіць. А можа, і ёсць,— нясмела сказала Юля.— З'ездзі ў МТС, Юра,— параіла яна.

Юрка паглядзеў на Юлю, успомніў, што там у МТС Жэня, уздыхнуў і згадзіўся:

— Добра, паеду.

— Вазьмі мой веласіпед,— прапанавала яму Юля.

Жанчыны вяжуць снапы. Міма Ганны праходзіць Марфа і коса пазірае на ржышча: ці не пакідае за сабой Ганна каласы. Ганна заўважыла гэта; у гэтую хвіліну яна нечым вельмі нагадвае раззлаваную кошку.

— Праўяральшчыца! — іранічна кідае Ганна.

Марфа моўчкі праходзіць міма, а на твары ўсмешка.

Юрка едзе на веласіпедзе па дарозе ў МТС.

У кабінеце дырэктара МТС каля акна стаіць Жэня. Раптам яна заўважае Юрку на веласіпедзе. Ён пад'язджае да канторы. Жэня захінулася за сцяну, каб не трапіць на вочы Юрку. А потым палахліва азірнулася кругом і схавалася ў куце паміж сцяной і шафай з паперамі. Адчыняюцца дзверы. Заходзіць Юрка. Агледзеў пакой, пастаяў хвілінку і выйшаў. Нарэшце Жэня з палёгкай уздыхнула.

На двары каля майстэрні Хамякова акружылі трактарысты і ўчастковыя механікі. Кожны з іх патрабуе ад дырэктара той ці іншай дэталі. Відаць, хлопцы зусім вывелі яго з раўнавагі. Побач стаіць трактар на рамонце. Каля яго сядзіць сумны трактарыст.

— Ну, дзе я вам вазьму, дзе я вазьму вам запчасткі. Наце, разбярыце, развінціце мяне на запчасткі. Ліміт увесь зрасходвалі. Дакапаецеся, без нажа вы мяне зарэжаце! — крычыць раз'юшаны Хамякоў.

Да яго падыходзіць Юрка.

— Павел Сцяпанавіч! — звяртаецца да яго Юрка.

— Ну, што табе?

— Мне трэба рэле. І трактар, і камбайн стаяць.

Хамякоў, даведзены да адчаю, апусціў рукі.

— Цябе яшчэ не хапала?! Дзе я табе вазьму рэле? Дзе? — крычыць ён.

— А дзе я вазьму?

— Дзе хочаш вазьмі! Знайдзі, купі!

— Куплю! Дзе?

— Украдзь! — грыміць Хамякоў.

Юрка абвёў вачыма ўсіх прысутных. Яго позірк на хвіліну спыніўся на трактары, што стаіць побач. Вочы яго сашчурыліся, па твары мільганула ўсмешка.

Хамякоў пакрочыў да канторы. За ім пацягнуліся і трактарысты.

Юрка падышоў да трактара, накорпаўся там, затым, сунуўшы нешта ў кішэнь, хуценька сеў на веласіпед і драпануў.

Вечар.

На лавачцы перад палісаднікам Сяргей іграе на баяне лірычны матыўчык. Тут жа сядзяць Міця і Юля з Кацяй. Толькі Юрка і Жэня адасобіліся. У іх зараз вельмі сур'ёзная размова. Збянтэжаная, апусціўшы долу вочы, стаіць Жэня перад Юркам.

— Ну, Жэня, што ты скажаш мне? — пытае ён, і голас у яго ад унутранага напружання крыху ахрып.

— Ну, як ты, Юра... Ну, што ты, Юра... Я проста... Ты толькі...— заблыталася ў словах Жэня.— Я не ведаю.

— Ты падумай і скажы... Толькі не доўга думай.

— Ну, якія мы... Рана мне яшчэ замуж, Юра...

— Пойдзем адсюль, Жэня,— просіць Юрка.— Пойдзем пагаворым.

— Не, я не пайду. Пасяджу тут,— і яна хуценька пайшла да лавачкі.

Залівае месячык вёску халодным святлом. Свеціць, а не грэе. І ў душы Юркі знікла цяпло.

А Юля заспявала... заспявала чыста, мякка, задушэўна.

Стаіць Юрка, абапёршыся на палісаднік, слухае песню і раз-пораз уздыхае. Пакуль Юля спявала, Сяргей падышоў да Жэні і прапанаваў шэптам, таямніча:

— Жэнечка! Давай з табою сядзем у машыну і праедзем.

Здзівілася Жэня яго прапанове і ўзрадавалася. Прамільгнула на яе тварыку вінаватая ўсмешка.

— Куды? — спытала яна.

— Проста ў ноч,— сказаў ён.

Жэня доўга і сур'ёзна глядзела Сяргею ў вочы. Потым страсянула сваімі кудзеркамі і, нібы перад нырцом, заплюшчыла вочы.

— Паехалі! — нарэшце адважылася яна.

Пакуль пела песню Юля, Сяргей і Жэня селі ў машыну. І калі Юля скончыла пець, машына фыркнула і паехала. Юрка заўважыў профіль Жэні ў машыне. Нейкая сіла адштурхнула Юрку ад палісадніка, але ногі былі нібы прыпаяныя да зямлі.

Юля схапіла Юрку за руку і папрасіла:

— Сядзь каля мяне, Юра. Крыху пасядзім і пойдзем. Ты ж правядзеш мяне?

Юрка бязвольна апусціўся на лавачку.

І Міця з Кацяй пераглянуліся. Учапілася яна ў Міцеву руку і заціхла, нібы чакаючы пейкага крыку.

А Юрка пасядзеў крыху і сказаў Юлі:

— Пойдзем. Я вас праваджу.

І яны падняліся з лавачкі і пайшлі.

Юрка і Юля моўчкі ідуць па вуліцы. Раптам ён спыніўся і ціха сказаў:

— Як яна магла? — і ў гэтых словах вялікі сум пакрыўджанага кахання.

— Не трэба аб гэтым... Не варта,— сказала Юля і, па-

маўчаўшы крыху, дадала: — Глядзі, як дрыжаць зоркі... Вунь адна паляцела.

Раптам пачуўся сігнал, і з-за павароту выбліснулі фары аўтамашыны. Юрку аж перадзёрнула. Юля заўважыла гэта. Міма праехаў грузавік.

Усю дарогу яны не праранілі ні слова. І толькі калі падышлі да дома, Юля сказала:

— Ну, вось мы і дома. Заўтра рана ўставаць. Будзем дабываць хлеб для людзей.

А Юрка маўчаў.

— Ну, Юрка,— падала на развітанне руку Юля.— Ідзі і спакойна спі.

— Харошы вы чалавек, Юлія Андрэеўна! — з удзячнасцю сказаў Юрка.

— А не злая? — прыгадала Юля Юркавы словы.

Юрка вінавата ўсміхнуўся, шчыра паціснуў ёй руку і паплёўся дахаты.

Доўга не мог заснуць у тую ноч Юрка. Круціўся, варочаўся з боку на бок, уздыхаў, нават плакаў. Горкі камок крыўды захрас у горле, душыў, не даваў пракаўтнуць слязу. Нарэшце хлопец заснуў.

І прысніўся яму надзіва рэальны сон. Нібыта ён ідзе па нейкім балоце, па мутнай вадзе. Густая, высокая трава сцёбае яго па твары. Юрка спяшаецца, бо чуе: недзе там, наперадзе, плача дзяўчына, адбіваецца, просіцца. Нарэшце Юрка выбіраецца на круты бераг шырокай ракі і бачыць, як на тым баку Сяргей камячыць Жэню. У яе распушчаныя валасы, аголеныя ногі, расшпіленая кофтачка.

— Пусці, пусці, Сярожа! — з апошніх сіл супраціўляецца Жэня. Але Сяргей прыпаў да яе вуснаў і прагна цалуе дзяўчыну.

— Пусці! Гад! — Юрка хоча крыкнуць на ўсю моц, але голасу яго не чуваць. Замест крыку чуваць толькі хрыплы стогн.

Нарэшце Сяргей адпускае дзяўчыну. Яны азіраюцца на Юрку і ніколькі не бянтэжацца. Наадварот, Жэня нават папракнула Юрку:

— І не сорамна табе падглядаць?

Юрка папоўз у траву... Услед яму ляцеў нейкі непрагодны смех — падобны на курынае квохтанне.

Юрка спаў на сенавале.

Нехта побач патрывожыў курэй на куросадні.

Ранне. Яшчэ толькі ўзышло сонца.

Міця выносіць з хаты вядро вады і, скінуўшы майку, пачынае мыцца.

З сенавала выходзіць Сяргей.

Міця. Ты што так рана?

Сяргей. Прывычка... Міця!

Міця. Ну?

Сяргей *(як бы не адважваючыся спытаць)*. Ты Жэню добра ведаеш? Як яна?.. Ну... *(Не знаходзячы слоў, ён быццам бы нешта ўзважвае на руцэ.)*

Міця. Дзяўчына нішто сабе.

Сяргей. І я так думаю.

Міця. Юрка наш сохне па ёй. Жаніцца хоча. Восенню, відаць, вяселле згуляем. Як толькі на працадні з калгасаў атрымаем.

Сяргей. Наўрад.

Міця. Што?

Сяргей. Не пойдзе яна за яго.

Міця. За Юрку? За Юрку любая дзяўчына пойдзе.

Сяргей. Любая, а яна не.

Міця. А табе адкуль гэта вядома?

Сяргей. Чуў. Усе сарокі стракочуць... Дый вяселле вам не будзе за што спраўляць.

Міця. Слухай, Сяргей. Не вельмі задавайся сваімі заработкамі.

Сяргей *(абыякава)*. А вам і пазадавацца няма чым. Быў я на палях вашага калгаса.

З калгаснага свірна выходзяць Цесля і Шугаеў, а пасля і Юля.

— Ну і калі ж ты закончыш хлебаздачу? — пытае Шугаеў у Цеслі.

— Думаю, што...— хацеў нешта сказаць Цесля, але Шугаеў перапыніў.

— Ты не думай, а здавай хлеб.— І, азірнуўшыся, каб не пачула Юля, дадаў: — Хай думае конь. Даю табе апошні тэрмін — два дні.

Цесля на гэта толькі плячамі паціснуў. Шугаеў і Цесля пайшлі да «Масквіча».

Пад'язджае грузавік да свірна. На бартах чырвонае палотнішча. З машыны злазіць Сямён. Ён цягне мех з буханкамі хлеба.

— Дзе вы так позна былі, Сямён? Ужо можна было дру-

гі рэйс адправіць. Цераз вас мяне тут начальства лае,— накінуўся Цесля на Сямёна.

— Ды цябе, таварыш старшыня, кругом лаюць... затрымаліся во чаму,— Сямён паказаў на мех з буханкамі хлеба.— З горада хлеб возім... абратным рэйсам.

Падыходзіць Хведар і пытае ў Сямёна:

— Узяў?

Сямён дастае з мяшка дзве буханкі і аддае Хведару.

— Ты чаму аванс па працаднi не выдаеш? — строга пытае Шугаеў у Цеслі.— Што гэта за парадкі?!

— Днямі буду выдаваць. Ведамасць склалі,— паабяцаў Цесля.

Сямён выняў пару буханак хлеба і перадаў дзяўчынцы:

— Нясі дамоў.

Каля калгаснага свірна група калгаснікаў і адна-дзве падводы. Калгаснікі атрымліваюць збожжа. Тут жа стаіць і Цесля. Каля Цеслі Юрка і Міця.

— Трактарыстам чэсць і пашана,— гаворыць Цесля і падае ім ведамасць. Калгаснікі ахвотна ўступаюць ім сваю чаргу.

— Распісвайцеся ў ведамасці і насыпайце ў мяхі,— распараджаецца Цесля.

Міця правярае ведамасць, а Юрка, глянуўшы ў засек, ківае ўбок галавой і пытае:

— Што насыпаць? Гэта?

— Тое, што ўсім.

— Не, гэта мы браць не будзем! — катэгарычна заявіў Юрка.

Міця падышоў к засеку, набраў у прыгаршчы зярнят і выйшаў к дзвярам, каб пры святле разглядзець збожжа.

— Да-абро-о! — іранічна прамовіў ён.— Не, таварыш старшыня, гэта — не плата.

— Не за гэта мы цэлае лета пякліся на сонцы, глыталі пыл, моклі пад дажджом,— Юрка пачаў злавацца.

— Няма за што распісвацца! — згадзіўся Міця.

— Ніхто вас не прымушае,— спакойна заўважыў Цесля.— Можаце не браць. Толькі майце на ўвазе — другога ў мяне няма. Ці гэта, ці ніякага.

— Ах, так?! Міця! — клікнуў Юрка і, зняўшы з галавы шапку, загадаў: — Сып у шапку, едзем к дырэктару МТС!

Міця высыпаў прыгаршчы зярнят у шапку раз, зачэрпнуў яшчэ раз, і хлопцы амаль пабеглі з кладовай.

Яны выйшлі на вуліцу. Міма праязджае грузавая машына. Хлопцы яе спыняюць, улазяць у кузаў.

Машына газанула, фыркнула сізаватым дымком і сарвалася з месца.

Не зводзячы вачэй з хлопцаў, Цесля выйшаў з кладовай. Да яго падыходзіць Ганна.

— Мне атрымліваць ці пачакаць? — хітравата пытае яна.

— Паспееш...— адмахнуўся Цесля і адышоў.— Не спяшайся.

Каля канторы МТС стаіць «газік». Хамякоў садзіцца ў машыну і кідае на хаду адпаму з трактарыстаў:

— Потым, потым разбяромся. Прыеду з райвыканкома, тады...

Пад'язджае грузавік, на якім прыехалі Юрка і Міця. Кратаецца з месца «газік» Хамякова.

Юрка і Міця саскочылі з машыны і спяшаюцца да дырэктара, баючыся, што той зараз паедзе.

— Стой! Стой! — крычыць Міця.

— Таварыш дырэктар! — крычыць Юрка.

Яны падбягаюць да машыны Хамякова. «Газік» спыніўся.

— Ну, што такое? — незадаволена пытае Хамякоў.

— Вось! — паказвае Юрка.

— Паглядзіце! — гаворыць Міця.

— Ну, што там? — моршчыцца Хамякоў.

— Якая нам плата за работу? — Юрка трасе шапкай са збожжам перад носам Хамякова. Хамякоў глядзіць у шапку.

— Гэта Цесля так?— пытае Хамякоў.

— Цесля,— пацвердзіў Міця.— К чортавай мацеры такую...

— Ціха, не хулігань! — перапыніў Хамякоў і, паглядзеўшы на хлопцаў, спытаў:— Ну, што? — і ўздыхнуў.

— Што? — перапытаў Міця.— Вы нас пасылалі туды рабіць, з вас і спрос!

Хамякоў яшчэ раз глянуў на аднаго, потым на другога і энергічным жэстам запрасіў у машыну:

— Сядайце! Едзем у райвыканком!

Хлопцы не чакалі, каб іх запрашалі другі раз, хуценька селі ў машыну, і «газік» ірвануўся з месца.

Кабінет старшыні райвыканкома. На стале кіпы папер — поўная неразбярыха. Старшыня размаўляе з некім па тэлефоне.

— Што ў цябе за апарат такі, калі вы своечасова зводку не можаце скласці? Слухай, ты мне зубы не загаварвай! Ясна? Як жа можна аператыўна працаваць, калі пад рукамі лічбы за мінулую пяцідзёнку? Якраз і ў лічбах справа! Зводка — наш манометр! Манометр! Вобласць збіраецца рапартаваць аб заканчэнні, а мы, наш раён, не можам дабраць якую сотню тон... Ну-ну, пабачым... Так бы раней. *(Кладзе трубку.)*

У дзверы пастукалі.

— Заходзьце! — дазваляе старшыня.

У кабінет заходзяць Хамякоў, а за ім Юрка і Міця. Заходзяць, вітаюцца.

— От, бунтуюць хлопцы,— паўжартам сказаў Хамякоў.

— Як бунтуюць? — нічога не разумее старшыня.

— Пакрыўдзіў іх Цесля. Бачыце, што выдае на працадні механізатарам,— Хамякоў узяў шапку са збожжам і падсунуў старшыні.

— Так...— старшыня нічога дзіўнага не заўважыў у шапцы.

— Год рабілі як валы, і вось — плата...— з абурэннем сказаў Юрка.

— Дзе вы рабілі? — проста спытаў старшыня.

Хлопцы здзіўлена пераглянуліся.

— Як дзе? На полі,— адказаў Міця.

— У «Чырвонай паляне»,— дадаў Юрка.

— Так... І што, Цесля і калгаснікам такое ж дабро выдае на працадні? — дапытваецца старшыня райвыканкома.

— Усім,— адказвае Юрка.

— Значыць, што? Дрэнны ўраджай быў? — цікавіцца старшыня.

— Нікудышны,— адказвае Міця.

— Значыць?..— пытае старшыня.

Хлопцы недаўменна пераглянуліся. А старшыня стаў тлумачыць. І ў голасе яго загучалі ноткі непрыязні.

— Значыць, дрэнна рабілі. Значыць — нізкая якасць палявых работ у механізатараў. Вы падводзіце і калгаснікаў. Дзе ж вам Цесля возьме лепшага хлеба? Які вырасцілі, такі і спажывайце.

— І гэта ўсё? — памаўчаўшы крыху, пытае Міця.

— Усё,— адказвае старшыня.— Цесля тут не вінаваты.

— Ну, дык вось, таварыш дырэктар! Можаш даваць нам

разлік. На чорта мне такая работа, што не дае карысці ні мне, ні людзям? Не хачу таўчы ваду ў ступе. Вунь брат мой, Сяргей, тры гады папрацаваў у шахце і — сваю «Пабеду» мае. А я што маю? Скулу? Пайшлі, Юрка! — Міця насунуў на лоб шапку і пайшоў да дзвярэй. Юрка няпэўна топчацца на месцы, пазіраючы то на дырэктара, то на старшыню райвыканкома.

— Вось, таварыш Хамякоў, якая свядомасць у тваіх механізатараў! — папракнуў старшыня.

— Свядомыя таксама есці хочуць,— кінуў з парога Міця.

— Можаце ісці! — абарваў старшыня, і хлопцы выйшлі з кабінета.

Па вуліцы ідуць Міця і Юрка.

— Куды гэта? — пытае Юрка, паказваючы на шапку з зярнятамі.

— Сып вунь курам!

Юрка высыпаў зярняты туды, дзе ўзбоч дарогі корпаліся куры. Тыя зараз жа пачалі разграбаць смецце, выбіраючы з пяску зярняты.

— Сяргей праўду казаў, што нам не будзе па што вяселле справіць,— успомніў Міця.

А ў кабінеце старшыня райвыканкома адчытваў Хамякова.

— Аб чым гаворыць такі факт? Аб тым, што выхаваўчая палітычна-масавая работа сярод механізатараў вашай МТС наладжана з рук вон. І ты нечага варты! Прывёў! Што ў мяне тут — кладовая? Патураеш шкурніцкім настроям, а не патрабуеш якасці работ.

— З такімі парадкамі — да якасці рукі не даходзяць,— хмура апраўдваецца Хамякоў.

— З якімі парадкамі? — пытае старшыня.

— А з такімі, што дзень і ноч кручуся, шукаючы запчастак. Усе мае клопаты толькі аб тым, каб трактары хоць не стаялі.

— Мала! Не ведаеш ты сваёй галоўнай функцыі.

— Ведаю, Пётр Мікалаевіч, ды... З мяне патрабуюць і выканання трактарных работ па ўсіх відах, і агратэхнікі... Патрабуюць, а забяспечыць запчасткамі — ніхто не дадумаецца.

— Та-ак... Мелка, мелка бярэш. Не ведаеш сваёй галоўнай функцыі.— Шугаеў глыбакадумна паківаў галавой.— Твая задача — даць дзяржаве сельскагаспадарчую пра-

дукцыю. Узяць з поля і перадаць дзяржаве. У-зяць! Вось за што нам зарплату выдаюць.

— Таварыш Шугаеў! Пашліце мяне назад у калгас. Там я дакажу, што...

— Дазволь нам самім ведаць, куды цябе пасылаць, а куды не пасылаць,— суха перапыніў Шугаеў.

Хата Сямёна. Каля акна за сталом сядзіць Юля і складае план работы агратэхнічнага гуртка.

Жонка Сямёна сядзіць на ложку і неразборчыва мурлыча калыханку, калышучы за почапку люльку з малым.

Адчыняюцца дзверы, і ўваходзіць Сямён: ён нясе на плячах мех са збожжам. Каця ззаду дапамагае бацьку. Сямён скінуў з плячэй мех, выйшаў на двор і праз хвіліну прынёс другі.

— Ну, от і ўвесь наш заработак...— Сямён падышоў да калыскі, нахіліўся над малым.— Ну, што, не спіцца?

Юля сочыць за Сямёнам. Сямён скінуў шапку на лаўку, падыходзіць да Юлі і моўчкі глядзіць ёй у вочы. Відаць, ён хоча нешта сказаць.

— От так, таварыш агpackаном... Зараз пакажу, якім хлебам дзяцей гадаваць будзем...

Сямён развязаў мяшок, набраў прыгаршчы зярнят і высыпаў перад Юляй на стол. Грубыя пальцы мазолістай, абветранай рукі не гнуцца, разгортваючы па стале дробныя маршчыністыя зярняткі, перамешаныя са смеццем.

Юля, пакусваючы карандаш, хмура глядзіць на кучку зярнят на стале, потым пераводзіць сумныя вочы на мазолістую далонь Сямёна. На хвіліну яна ўспомніла, і перад яе вачыма яскрава паўстала карціна: яна ідзе па нізкарослаunion ячменю.

— Каторы ўжо год вось так... Робіш, робіш ад зімы да зімы, спіны не разгінаеш, а прыйдзе восень — от што на працадзень атрымаеш...— Сямён высыпаў зярняты на стол.— Дзе ж тут будзе ахвота рабіць?

— Ураджай у нас вельмі нізкі,— з сумам у голасе сказала Юля.

— А чаму суседзі вунь ураджаі бяруць, як на Кубані. А што ў іх, зямля лепшая? Такая ж, як у нас. Толькі ў гаспадарскіх яна руках. А ў нас што?..— спытаў, разгарачыўшыся, Сямён, а потым зразумеў, што крычаць на Юлю па меншай меры неразумна. І ён загаварыў па-другому: у голасе яго чулася скарга і крыўда.— От і пракармі сям'ю на гэты заработак... Толькі і жывеш, што з агарода... У су-

седзяў вунь — толькі грашыма па пяць рублёў на працадзень...

— А нам яшчэ і сена купляць трэба... Не хопіць на зіму,— папярэдзіла жонка.

Рыпнулі дзверы, і ў хату ўваліліся Юрка і Міця.

— От тут мы і закурым. Праўда, дзядзька Сямён? — падміргнуўшы Каці, звярнуўся Міця да Сямёна. І той моўчкі палез у кішэню, дастаў капшук з самасадам і газету.

А вечарам у Сямёнавай хаце схіліліся над сталом Сямён, Юрка, Міця і Юля. На стале перад імі спісаны ліст паперы. Пры лямпе яны пішуць нейкае пісьмо. Сямён дыктуе, Юрка піша.

— І гэтак каторы год падрад. А старшыня нашага калгаса таварыш Цесля не жыве калгасам, а служа пры ім. У яго галава мала баліць аб тым, як жывуць калгаснікі. Пры такіх парадках гаспадарка занепадзе, а ў калгаснікаў рукі апускаюцца... Напісаў?

Міця. Напісаў.

Сямён. Так парушаюць у нашым калгасе галоўны закон сацыялізму.

Міця. Які?

Сямён. Галоўны. У брашуры Сталіна вычытаў. І закончым так: падпёрла нам пад самае горла і што далей так нельга.

Да іх падыходзіць жонка Сямёна і сварліва гаворыць:

— Ну, канчайце, грамацеі! Вячэра даўно астыла, чуеце?

— Зараз,—адмахнуўся Сямён.

Юрка вырывае з сшытка двайны ліст паперы і просіць Міцю:

— Бяры ты перапішы, твой почырк лепшы.

Міця бярэ паперу, макае пяро ў чарніліцу і акуратна, старанна піша: «Масква, Крэмль...»

— Ну, калі і з гэтага нічога не выйдзе, я кідаю МТС,— грозіць Юрка.

З вуліцы пачуўся сігнал аўтамашыны. Юрка выглянуў у акно і заўважыў: побач з Сяргеем у машыне сядзіць Жэня.

Кабінет дырэктара МТС Хамякова. Перад Хамяковым Сяргей і Жэня.

— Дык мы просім вас, Павел Сцяпанавіч, сёння ж к нам... Ну, на наша вяселле,— нарэшце прагаварыў Сяргей.

— Вяселле? Ваша? — здзівіўся Хамякоў.— А як жа Юрка? — павярнуўся ён да Жэні, і тая яшчэ ніжэй апусціла галаву, а чырвань густа заліла яе твар. Хамякоў зразумеў недарэчнасць і бястактнасць свайго пытання, зразумеў пачуццё няёмкасці дзяўчыны і, штучна засмяяўшыся, жартаўліва дадаў:

— Э, дык ты ўсё-такі, Сяргей, звозіш мае кадры. Як жа я абыдуся без сакратара? А? Я ж прасіў цябе, каб ты не зманьваў маіх работнікаў.

— А я не зманьваў,— апраўдваецца Сяргей.— Яна сама...

— Дык, значыць, ты сама? — пытае Жэню Хамякоў.

— Сама...— яшчэ больш чырванеючы, яшчэ ніжэй апускаючы галаву, ледзь чутна прагаварыла Жэня.

На Сямёнавым двары Міця і Каця, апранутыя па-святочнаму. Яны запрашаюць Юлю на Сяргеева вяселле.

М і ц я. Дык вы прыйдзеце, Юля Андрэеўна?

Ю л я. Не ведаю.

М і ц я. Сяргей прасіў. Усё-такі — вяселле ў яго...

Ю л я. Перадайце яму: дзякуй, але... відаць, не прыйду.

М і ц я *(да Каці)*. Можа, і Юрку паззваць?

Ю л я *(рэзка павярнулася да Міці)*. Нельга так, Міця.

М і ц я. А што?

Ю л я. Нічога. *(І Юля адвярнулася.)*

Міця пацiснуў плячыма і, узяўшы пад руку Кацю, пайшоў.

Сонца схавалася за небасхіл, і вечар павольна ахінае вёску.

Юля выйшла на вуліцу, прыслухалася. Недзе ў другім канцы вёскі заліваецца гармонік, чуваць мелодыі вясельных песень. Але не да іх прыслухоўваецца Юля. Скрозь пералівы гармоніка і вясельных песень прарываецца далёкае гурчанне трактара на полі.

— Гуркоча...—сказала яна сама сабе.

На трактары Юрка. Здаецца, ён увесь аддаўся працы. Здаецца, уся ўвага яго, увесь слых яго скіраваны на работу трактара. Ён углядаецца ў цемру. Але гэта толькі здаецца. Час ад часу вецер даносіць урыўкі вясельных мелодый і пералівы гармоніка. Юрка насцярожваецца, прыслухоўваецца. Вось ён страсянуў кудрамі, каб адагнаць ад сябе тое, што прыносіць вецер. Але мелодыя вясельных песень гучыць больш поўна і ярка.

Нарэшце Юрка не вытрымлівае, спыняе трактар, глушыць матор і бяжыць насустрач ветру.

Юля насцярожылася. Гул трактара змоўк.

Міма хат, паўз плятні і палісаднікі па вуліцы крадзецца Юрка. А вясельная музыка ўсё расце і шырыцца. Яна глушыць Юрку. Вось ён асцярожна прабіраецца каля палісадніка. Юля яго заўважыла ў той момант, як ён, адхінуўшы кусты вяргіняў, зазірае ў акно, дзе, узняўшы чаркі, п'яныя хорам крычаць:

— Горка! Горка!

І Сяргей цалуе Жэню.

Юркавы рукі сутаргава камячаць крывава-чырвоныя кветкі вяргіняў. Буйнымі кроплямі падаюць на зямлю чырвоныя пялёсткі...

Юрка палахліва азірнуўся і, сарваўшыся з месца, пабег. Вось ён пераскочыў цераз плот і з усёй сілы пабег у поле.

Юрка бяжыць па полі. А ў кулаку заціснута чырвоная вяргіня.

Хлопец садзіцца на трактар, заводзіць яго. Свірэпа завыў матор, ірвануўся з месца трактар. Не чуваць больш музыкі, не перасіліць ветру гэты раз'юшаны гул матора.

Раптам перад трактарам у пучку святла мільганула дзявочая фігура. Гэта ўразіла Юрку. Ён рэзка затармазіў.

Спыніўся трактар.

Змоўк матор.

Да Юркі падыходзіць Юля.

— Гэта ты? — ці то здзівіўся, ці то раззлаваўся Юрка.

— Гэта я... прыйшла...— разгубілася Юля.— Я хачу з табой... Я ні разу ноччу на трактары не ездзіла... Можна?— просіць яна.

Юрка доўга і недружалюбна глядзіць на Юлю, так доўга, што Юля не вытрымала і апусціла галаву. Юрка з палёгкай уздыхнуў і проста сказаў:

— Можна.

Недзе далёка палыснула па небе маланка.

А назаўтра каля хаты Сяргея стаяла «Пабеда» з адкрытым багажнікам. На скорую руку справіўшы вяселле, Сяргей і Жэня збіраліся ад'язджаць.

У багажнік ставяць кошыкі з яблыкамі, чамаданы і кладуць розныя пакупкі і пакупачкі.

* * *

А ў той час каля акна сядзіць Юрка і глядзіць на адваротны бок фотакартачкі, дзе напісана рукою Жэні:

Калі любіш — хрstates,

А не любіш — парві.

Ён перавярнуў картачку і глядзіць на мілы какетлівы твар Жэні.

Па вуліцы праехала «Пабеда» з Сяргеем і Жэняй. Жэня ехала, апусціўшы галаву ўніз, каб, крый бог, не сустрэцца вачыма з Юркам.

Юрка заўважыў іх, але нават і не зварухнуўся, толькі вачыма правёў машыну.

Нізка гойдаюцца шэрыя лахманы хмар на вераснёўскім небе. Сонца рэдка выглядвае з-за хмар, зрэдку прабяжыць па полі светлая палоска, і зноў усё наўкола сыра і шэра. На дарозе лужыны і размешаная машынамі, вазамі і трактарнымі плугамі гразь.

Развярнуўшыся каля дарогі, праходзіць трактар, вывар очваючы пласты сырой зямлі. На трактары Юрка.

Непадалёку Міця сваім трактарам цягне бульбакапалку. Поруч з Міцем Каця. Яна вучыцца вадзіць трактар. Следам ходзяць жанчыны і носяць бульбу ў кошыках к капцу, каля якога тупае Хведар.

На ўскраіне лесу гарыць касцёр.

Шырокае поле зялёнай руні. Па полі ідуць Юля і Цесля. Юля правярае ўсходы азімых. Вось яна нагнулася і выцягнула з карэннем кусцік руні, разглядае сама і паказвае Цеслю.

— Вось бачыце, што значыць ранняя сяўба азімых?

— Кгм...— адкашляўся без патрэбы Цесля.

— А вы гаварылі...— злёгку папракнула Юля.

— На тое вы і аграном...— Цесля глянуў на поле і скептычна зазначыў:— Цяпер-та густа... толькі... пабачым налета, каб не было пуста.... Куранят, як кажуць, увосень лічаць.

Да іх пад'язджае Юрка на трактары. Ён спыняецца і, не глушачы матора, падыходзіць да Цеслі і Юлі.

— Ну, як? — пытае ён.

— Як бачыш,— гаворыць Юля.

— Ну, я пайду туды, к капцам,— сказаў Цесля і пайшоў.

— І ахвота вам, Юля Андрэсўпа, хадзіць на полі ў такую слякаць...— задушэўна і ласкава папракнуў Юрка, глянуўшы на запэцканыя Юліны боты і запырсканае знізу граззю асенняе паліто.

— Вельмі сумна адной дома сядзець.

— Замёрзлі? — спагадліва пытае Юрка.

— А што? — адказвае пытаннем Юля, а ў вачах яе ўдзячнасць.

— Вунь там мы касцёр расклалі... Прыходзьце пагрэцца. Дарэчы, на печаную бульбу паспееце.— Юрка пайшоў да трактара.

— Дзякую, Юра,— паўшэптам прамовіла Юля.

Па дарозе, распырскваючы гразь, імчыць «Масквіч». Вялікая брудная лужына перагарадзіла яму дарогу. Машына спыняецца перад лужынай. Аб'ехаць па ўзараным полі немагчыма. У машыне Пётр Мікалаевіч Шугаеў.

«Масквіч» фыркнуў і з адчаем рынуўся ў лужыну: была не была. Яшчэ злей загурчаў маласільны матор, бездапаможна закруціліся колы ў гразі: засела машына, захліпнуўся матор.

Пётр Мікалаевіч з маўклівым дакорам глядзіць на маладога шафёра.

К «Масквічу» падыходзіць Цесля. Заглядае ў машыну і пазнае Пятра Мікалаевіча. Вітаецца.

— Заселі? Зараз выручым,— абяцае Цесля і азірнуўся ў той бок, дзе каля падводы завіхаюцца жанчыны, нагружаючы ў кош бульбу. Каля воза Сямён і Хведар.

— Гэй, мужчыны! Давайце сюды! — крычыць Цесля.

На яго крык азірнуліся Сямён і Хведар.

— Што там такое? — пытае Сямён.

— Відаць, нейкае начальства ў лужу села,— выказаў сваю здагадку Хведар.

— Начальства? Госць рэдкі — трэба дапамагчы,— сказаў Сямён і разам з Хведарам, не спяшаючыся, накіраваўся да машыны.

І калі, нарэшце, «Масквіча» выцягнулі на сухое месца, Пётр Мікалаевіч вылез з машыны. Прывітаўшыся за руку з усімі, ён па-дзелавому заўважыў Цеслю:

— Ну і гаспадар! Няўжо нельга направіць дарогу?

— Тут хоць бы паспець да замаразкаў бульбу выкалупаць з зямлі. Дарога пачакае,— сказаў Цесля.— Не выходзяць на работу, і ўсё... Другому хоць ты ў лоб страляй.

— А чаму? — спытаў яхідна Сямён.

Пётр Мікалаевіч глянуў на Сямёна і ў яго спытаў:

— А чаму?

— Чаму? — перапытаў Сямён.— Тут механіка простая. Хто ў праўленні засядае? Брыгадзір, кладаўшчык, загадчык фермы, старшынёў намеснік — яны на сталай рабоце. Капае ён бульбу ці не капае, а працадні ідуць. І жонкі іхнія дома сядзяць. Дык ім не хочацца выдаваць працэнты, скажам, яму,— Сямён кіўнуў пальцам на Хведара,— ці мне. Ім жа самім тады на працадні меней перападзе. Вось чаму. Яны, значыцца, дома сядзяць ці на сталай рабоце, а я — капай бульбу, калупайся вось тут у гразі. А ты кажаш, у лоб страляй,— закончыў Сямён, звярнуўшыся да Цеслі.

— А ты хочаш працэнтамі жыць? — акрысіўся на Сямёна Цесля.

— Я хачу за сваю працу плату палучаць! — цвёрда і чотка адказаў Сямён.

— Ваша прозвішча Каліна? Сямён Каліна? — спытаў Пётр Мікалаевіч.

— Каліна. Ну дык што? — насцярожыўся Сямён.

— Так... А вы можаце ісці, таварыш...— адпусціў Хведара Шугаеў. І калі Хведар адышоўся, Пётр Мікалаевіч зноў павярнуўся да Сямёна.— Гэта вы пісалі ў Маскву, у Крэмль?

— Я пісаў,— не струсіў Сямён.

— Разам з трактарыстамі?

— Разам,— з верай у сваю праваду адказаў Сямён.

— Так... А дзе гэтыя... механізатары? — Пётр Мікалаевіч павярнуўся да Цеслі.— Далёка?

— Тут яны. Вунь зараз сюды пад'едуць,— Цесля паказаў на адзін трактар з аднаго боку дарогі і на другі трактар на бульбянішчы.

Па бульбянішчы ідзе Хведар. Раптам ён спыніўся, павёў носам, прынюхаўся і павярнуў да кастра. Падышоў, пагрэў рукі над полымем, пацёр імі. Расхінуў полы пінжака, пагрэў жывот, павярнуўся к полымю спіной. Потым падняў качаргу, пакалупаўся ў вуголлі, выгарнуў печаную бульбіну. Перакінуў яе з рукі ў руку, пацёр аб палу, здзьмухнуў з яе попел і, разламаўшы папалам, пачаў есці сопкую, апетытную бульбу.

Каля «Масквіча» Пётр Мікалаевіч канчае гутарку з Сямёнам, Юркам і Міцем. Непадалёку стаяць Каця і Юля.

Трымаючы ў руках канверт, Пётр Мікалаевіч ушчувае хлопцаў.

— Вы толькі загружаеце цэнтральныя органы сваёй пісанінай,— і, павярнуўшыся да Цеслі, распарадзіўся: — А наконт выдачы дзесяці працэнтаў бульбы калгаснікам ты таго... Не мудруй, калі не хочаш, каб на зіму бульба не засталася на полі. Чуеш, таварыш Цесля? Заўтра каб арганізаваў выдачу!

— А як жа рашэнне праўлення? — нясмела запярэчыў Цесля.

— Я адмяняю. Табе гэтага мала?! — строга запытаў Пётр Мікалаевіч.— Ці ты хочаш, каб табе асабіста з Крамля дырэктыва прыйшла?

— Я што... Я не супраць...— неахвотна згадзіўся Цесля.

— А вам,— Пётр Мікалаевіч глянуў на Юрку і Міцю,— не паперу псаваць трэба, а добрасумленна працаваць, калі хочаце атрымліваць на працадзень. Нізкі ўраджай — ваша віна. Ясна? Другога адказу не чакайце. Масква мне даручыла разабрацца і даць вам адказ,— Пётр Мікалаевіч накіраваўся да машыны.

Юрка і Міця абмяняліся позіркамі.

Юрка. Ясна...

Міця. Таварыш старшыня райвыканкома! Вы міма МТС паедзеце?

Пётр Мікалаевіч. Ну?

Міця. Перадайце там нашаму дырэктару, каб шукаў на наша месца трактарыстаў.

Пётр Мікалаевіч змерыў поглядам Міцю, затым, нічога не сказаўшы, з сілай зачыніў дзверцы «Масквіча». Машына кранулася і паехала.

Юрка. Міця, пайшлі бульбу есці. Юля Андрэеўна, Каця! Пайшлі грэцца.

І яны накіраваліся да кастра.

А каля кастра канчае трапезу Хведар. Перад ім лушпаек і корак ад з'едзенай бульбы цэлая куча. Вось Хведар пачуў гоман Міці, Юркі і дзяўчат. Хведар цераз плячо крадком глянуў на іх, потым падняўся і, ссутуліўшыся, пасунуўся ад кастра. Пайшоў, не азіраючыся.

Да кастра падыходзіць Міця, Юрка, Каця, Юля.

Убачыўшы лушпайкі, Юрка і Міця пераглянуліся і не-

чакала зарагаталі. Смяяліся да слёз. Нават Каця і Юля заразіліся весялосцю. Раптам хлопцы сціхлі, і Міця сказаў:

— Ну і шукай пасля гэтага праўду на зямлі...

Юрка выняў з кішэні папяроску, прыкурыў ад галавешкі, хвіліну пастаяў, падумаў, потым са злосцю кінуў галавешку ў касцёр і сказаў:

— Усё! Паеду! К чортавай мацеры!..

— Куды ты паедзеш? — спакойна спытала Каця.

— Куды вочы глядзяць, у горад, на будоўлю, завярбуюся куды-небудзь,— выпаліў Юрка.

— Была б шыя, а хамут знойдзецца,— заспачыў Міця.

— Я не горшы за другіх,— Юрка павярнуўся ад кастра і пайшоў да трактара. За ім рушыў і Міця.

Каця і Юля пераглянуліся.

Каця. Ён такі, можа з'ехаць у белы свет.

Юля *(з трывогаю)*. Ты думаеш?

Каця. Ты пагавары з ім, Юля...

Юля накіравалася да Юркавага трактара.

Юля з Юркам каля трактара.

Юля. Значыць, рашыў?

Юрка. Рашыў.

Юля. Я думала, я спадзявалася, што ты мяне... паслухаеш... *(Юля з дакорам глянула на Юрку і намерылася пайсці.)*

Юрка *(памкнуўся за ёй)*. Юля, паслухай!.. Юля, я цябе вельмі, вельмі паважаю, але...

Юля *(спынілася)*. Ах, паважаеш!.. *(Рэзка павярнулася і пайшла.)*

Юрка. ...вы ж самі бачыце: задарма працую...

Юля. Бяжы, уцякай, кідай... Поле хай бур'яном зарастае...

Юрка. Пачакай!

Юля. Я таксама магла збегчы, магла ўстроіцца дзе-небудзь у горадзе, у канторы... А не ўцякла, засталася... *(Раптам спынілася, павярнулася да Юркі.)* Помніш нашу сустрэчу ў МТС? «Дырэктар»... Я дала сабе слова, як бы цяжка ні было, я буду разам з... Разам з табой памагаць калгасу... *(Пайшла.)*

Юрка. Юля, ці ж я табе раўня? Ты атрымліваеш зарплату, а я...

Юля. Ах, вось як!..

Юля не стала больш размаўляць і хутка пакрочыла ад Юркі. Ён спыніўся, пастаяў і, апусціўшы галаву, паплёўся да трактара.

Двор Сямёна. Над галавою зорная ноч. І ціха, ціха... З хаты выйшаў Сямён, накінуўшы на плечы кажушок. Пастаяў, прыслухаўся. Да яго даляцеў дзявочы прыглушаны голас: «Не гавары глупства...»

Сямён прыгледзеўся ў цемру.

— Ты, Каця? — спытаў ён і падышоў да палісадніка. Там, абняўшыся, сядзелі Каця і Міця.

— Я,— адказала дзяўчына, хуценька знімаючы з пляч́эй Міцеву руку.

— З кім ты? — і, пазнаўшы Міцю, па-старэчы бурчліва запракнуў маладых.— Што вы па начах туляецеся па завуголлю. Жаніцеся, ці што, а то...— і паплёўся ў хату.

— Я і рад бы ў рай, ды грахі не пускаюць! — выгукнуў Міця наўздагон Сямёну.— Каця не хоча, кажа, мала зарабляю.

— Не балбачы лішняга! — Каця заціснула Міцю рот рукой.

— А праўда, Каця. От пайду, уладкуюся дзе-небудзь на работу, падзараблю капейку, і згуляем вяселле. А?

— Нікуды ты не пойдзеш! — катэгарычна заявіла Каця.

— Не, пайду! — заўпарціўся Міця.

— Не, не пойдзеш!

— Пайду!

— Ну і ідзі!

— І пайду!

— Ну і ідзі! Падумаеш, нехта плакаць па табе будзе. Без цябе зямля незасеянай застанецца,— Каця яўна насміхалася з Міці.

— А калі ты такая патрыётка, можаш ісці на маё месца. Уступлю свой трактар табе...

— І пайду!

— Ну і ідзі!

— І пайду! Не спужаюся!

— А на Юркава месца агранома? — яхідна спытаў Міця.

Раніцой на вуліцы каля варот Сямёнавага двара стаіць Юля. Чакае некага. Міма праходзіць Міця.

— Міця! Можна на хвілінку? — гукнула яна.

Хлопец спыніўся.

— Сакрэт? — пытае Міця.

— Сакрэт,— адказвае з усмешкай Юля.

Міця. Шапчы свой сакрэт.

Юля. І ты?

Міця. Што?

Юля. Кідаеш трактар?

Міця. Ды вось пойдзем з Юркам да дырэктара...

Юля *(задушэўна і ласкава)*. Міця, а калі я цябе вельмі папрашу...

Міця *(недаўменна)*. Мяне?

Юля. Цябе, Міця.

Міця. А чаму не Юрку?

Юля. А што мне Юрка? Я хачу, каб ты... Я прашу цябе, каб... *(Юля апусціла галаву.)*

Міця *(глянуў на яе скоса, недаверліва)*. Ну...

Юля. «Ну, ну»... Не кідай трактар.

Міця. І ўсё?

Юля. Пакуль што ўсё. *(І Юля схавалася ў двары.)*

Міця *(правёў яе вачыма)*. Цікава!.. *(І падкруціў уяўны вус.)* Цікава...

Каля канторы МТС. З канторы выходзіць Юрка. Яго сустракае Міця.

Міця. Ну?

Юрка. Вольны казак. А ты?

Міця. Я падумаю. Ну і куды цяпер?

Юрка. Пакуль што ў бальніцу.

Міця. Захварэў?

Юрка *(сур'ёзна)*. Рухавічок там нейкі ёсць. Казалі, механік трэба. Трыста пяцьдзесят рублёў аклад.

Міця. Так...

І хлопцы разышліся.

На полі. Міця працуе на трактары. А Юркаў трактар стаіць сіратою.

Міця, седзячы на трактары, заўважыў Юлю, якая чакала яго ў канцы поля. Міця зашпіліў каўнер, прыгладзіў валасы, паправіў кепку. Юля прывітальна памахала Міцю рукой. Задаволены Міця ўсміхнуўся і паслаў ёй рукой пацалунак.

— Як справы? — крычыць Юля.

Міця спыняе трактар, саскочыў з сядзення, падбег да Юлі.

— Гудзім, Юлеııька, гудзім. Сёння паўтары нормы дам, кроў з носа,— абяцае Міця.
— Малайчына, Міця,— хваліць яго Юля.
— Для цябе, Юля, я гатоў на ўсё,— прызнаецца Міця.
— Ну, ну! — Юля адразу пасур'ёзнела.— А то Каці скажу.
— Што мне Каця цяпер! — адмахнуўся Міця.
— Перастань, Міця! Сядай на трактар! — загадала Юля.
— Слухаю! — Міця жвава ўзабраўся на трактар і рушыў.
Следам за трактарам ідуць радковыя сеялкі.
А Юркаў трактар стаіць сіратою.
Вось да яго падышла Юля, засмучоная, пакрыўджаная. Ласкава дакранулася рукой да халоднай машыны, пастаяла, уздыхнула... Прысела на трактар і ціха, вельмі ціха заспявала тую ж песню, што некалі пела перад хатай Сяргея. Толькі па-новаму гучала мелодыя песні — журботна, сумна...

А той, па кім Юля сумуе,— Юрка; пад невялічкай паветкай каля бальніцы калупаецца ля рухавіка. І па ўсім відаць, што занятак Юрка знайшоў сабе не па душы.
Каля Юркавага трактара Хамякоў і Каця. Некалькі калгаснікаў засыпаюць жыта ў сеялкі. Тут і Сямён. Каця выцірае анучай рукі.
— Ну, спрабуй,— дазваляе Хамякоў.
Каця садзіцца на трактар. Хамякоў крутануў за ручку, і трактар зароў. Каця павольна кранаецца з месца. Паехала. Хамякоў ідзе побач з трактарам, нібы баіцца пакінуць Кацю адну. Нарэшце ён спыняецца. Каця паехала адна.
Хамякоў бачыць поспехі Каці, але сумны, вельмі сумны.

Каця вядзе трактар, а на прычэпе сеялкі. Каля сеялак і Юля.
З радыятара ідзе пара. Каця спыняе трактар, набірае з бочкі вядро вады і залівае ў радыятар. Потым спрабуе завесці трактар. З цяжкасцю круціць ручку раз, другі. Трактар не заводзіцца. Каця спрабуе яшчэ. І раптам заведная ручка пры аддачы назад моцна ўдарыла Кацю па назе. Каця войкнула і села. З нагі сочыцца кроў. Збялелая Каця моршчыцца ад болю. Да дзяўчыны падбягаюць Юля і кал-

гасніцы, якія абслугоўвалі сеялкі. Юля заўважыла акрываўленую нагу Каці і перапужалася.

— Каця! Што з табой? Што такое? — крычыць перапалоханая Юля і нахілілася над Кацяй.

— Ой! Не кратай! — просіць Каця.

— Эй! Эй! Дапамажыце! — крычыць у панічы адна з калгасніц.

Гэты панічны крык чуюць Хамякоў, Сямён і другія. Хамякоў з Сямёнам і другія калгаснікі бягуць да трактара.

Над Кацяй згрудзіліся людзі. Нехта крычыць:

— Хутчэй да доктара!

— Ну, што вы стаіцё! У бальніцу!

Бальніца. Каля акна стаіць Юрка і пазірае на вуліцу. Раптам ён заўважыў, як да бальніцы пад'язджае падвода, а на ёй Юля, забінтаваная Каця і Хамякоў. Нібы токам жыганула Юрку невядомая трывога. Ён куляю выскачыў на двор і падбег да падводы.

— Што з табой, Каця? — пытае ўсхваляваны Юрка.

У адказ ён бачыць толькі дакорлівыя, непрыязныя позіркі Каці, Хамякова і Юлі.

Хамякоў моўчкі прывязвае да канавязі павады. Юля дапамагае Каці злезці з калёс. Юрка таксама хацеў падтрымаць Кацю з другога боку. Каця адхіляе яго рукі.

— Ідзі... там трактар твой стаіць... А ты — санітар! — ціха гаворыць яна.

— Тут без цябе абыдуцца,— гаворыць Хамякоў.

Юрка сарваўся з месца і пабег пад паветку. Яму было вельмі крыўдна.

Егіпецкімі пірамідкамі ўзвышаюцца на полі адзінокія сцірты саломы.

Усё менш і менш на полі людзей: канчаюцца палявыя работы.

Гуртамі стаяць капякі з бульбай.

У полі стаіць адзінокі трактар.

З бальніцы выходзіць Юля. Праз акно відаць, як Каця на развітанне махае ёй рукой і крычыць:

— Перадавай прывітанне!

Юля ідзе дадому па полі міма адзінокага трактара.

Юля спыняецца, прыслухоўваецца. Свішча асенні вецер. Яна доўга стаіць і слухае.

Па другі бок трактара сядзіць Юрка. Раптам ён занепакоіўся.

Юрка заўважыў Юлю. Усхапіўся. Стаяць адно перад адным і не ведаюць, з чаго пачаць гаворку.

— Каця прывітанне перадавала,— нарэшце гаворыць яна.

— Папраўляецца? — пытае Юрка.

— Хутка выпісваецца...— паведамляе Юля.

І зноў маўчаць. Нарэшце Юля намерылася пайсці.

— Юля! — нясмела гукае Юрка.

Юля спыняецца. Юрка падыходзіць да яе.

— Ты ўсё яшчэ крыўдуеш на мяне? — пытае ён.

— Не,— гаворыць яна.

— Дзякую!

— Толькі... ці раўня я табе, не ведаю...

— Даруй, Юля. Але ж вельмі крыўдна. Несправядліва з намі...

— Цярпі, казак, атаманам будзеш. Прыйдзе і справядлівасць.

— Калі ж я дачакаюся? — Юрка памкнуўся да Юлі, але тая пагразіла яму пальцам і адступіла. А ў вачах яе радасць.

— Ну, ну! Ідзі на трактар, а то ў радыятары вада хутка замерзне.

* * *

З рэпрадуктара каля праўлення чуюцца пазыўныя важных паведамленняў...

З трывогаю на твары слухае сігналы Цесля, седзячы за сталом у канторы.

Па вуліцы ідзе Хведар.

Падымае вочы і скептычна глядзіць на рэпрадуктар; спыніўся, выплюнуў недакурак, яшчэ раз азірнуўся на радыё. Стаіць, слухае.

Па вуліцы ідзе Юля. Насцярожылася. Прыслухалася. Падыходзіць бліжэй да слупа з рэпрадуктарам.

Да праўлення калгаса падыходзяць новыя людзі. Сярод іх Каця, Ганна і Міця.

Бяжыць туды і Сямён. Спяшаецца Юрка.

Слухае ў сваім кабінеце Шугаеў і чухае патыліцу.

Цесля выглядвае ў акно, пераводзіць разгублены позірк з твару аднаго калгасніка на другі.

Слухае пазыўныя Міця.

Каля праўлення сабраўся натоўп. Усе моўчкі чакаюць.

Гучаць пазыўныя.

Даўно чакалі гэтых пазыўных.

Доўга чакалі.

Цярпліва. Моўчкі.

Пазыўныя гучаць мацней, званчэй, бліжэй на матыў «Широка страна моя родная...».

Рассейваюцца хмары на асеннім небе.

*Студзень, 1954*

# У АДЗІНАЙ СЯМ'І

### СЦЭНАРЫЙ ДАКУМЕНТАЛЬНАГА КІНАФІЛЬМА

Зробім з вамі невялікае падарожжа па гарадах і сёлах заходніх абласцей Савецкай Беларусі...

Пагранічны Брэст — горад, з якім звязаны гераічны подзвіг неўміручага гарнізона Брэсцкай крэпасці.

На берагах раздольнага бацькі-Нёмана раскінуўся старажытны Гродна, дзе калісьці Пётр Першы ўзводзіў рэдуты супраць шведаў...

Днепра-Бугскі канал — водны шлях, які звязвае Беларусь з братняй Украінай і Народнай Польшчай.

Наведаем з вамі і наша «беларускае мора» — бурлівую Нарач.

Адзін з самых маляўнічых запаведнікаў краіны — Белавежская пушча з яе магутнымі ўладарамі— зубрамі...

Помнікі на авеянай сівой мінуўшчынай зямлі сведчаць аб яе адзіным, непарыўным лёсе з Расіяй.

Домік у Кобрыне, дзе жыў Сувораў.

У гэтым невялікім доміку ў Кобрыне некалі жыў легендарны рускі палкаводзец Сувораў...

Адкрыццё помніка Ф. Э. Дзяржынскаму. Івянец — радзіма Фелікса Дзяржынскага, палымянага рыцара рэвалюцыі...

Домік, дзе нарадзіўся Янка Купала. Тут дарагія сэрцу мясціны, звязаныя з імёнамі Янкі Купалы і Якуба Коласа — вялікіх песняроў беларускай зямлі...

Дом урада БССР. У зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета БССР сядзяць дэлегаты.

Шчаслівы і светлы лёс беларускага народа, навечна ўз'яднанага ў адзінай сям'і!

Вярхоўны орган беларускай дзяржавы абмяркоўвае пытанні далейшага ўздыму і росквіту народнай гаспадаркі рэспублікі...

Выступае Гарбуноў. У прэзідыуме сядзяць Цімашэнка, Мазураў, Казлоў і Аўхімовіч. Сярод дэлегатаў Гродзеншчыны начальнік цэха мастоўскага фанернага завода Масюк і дырэктар гасцініцы Дэмях. Сярод дэпутатаў і пасланцы працоўных заходніх абласцей.

Камуніст, былая падпольшчыца Шчасная з Маладзечанскай вобласці...

Старшыня калгаса з Піншчыны, Герой Савецкага Саюза Корж...

Герой Савецкага Саюза Маркаў...

Былы батрак, зараз сакратар райкома партыі Анішчык...

Сакратар Маладзечанскага абкома партыі Прытыцкі... Суровы яго жыццёвы шлях... Вось ён, дваццаць пяць гадоў назад, мужны падпольшчык-рэвалюцыянер, прыгавораны польскімі фашыстамі да смяротнай кары...

Ад малога да вялікага падымаўся народ Заходняй Беларусі на барацьбу супраць бязлітасных прыгнятальнікаў — князёў Мірскіх, Радзівілаў і іншых шматлікіх магнатаў і паноў.

Вось іх раскошны палац... А вось у якіх халупах жыў народ... Не жыў, а пакутаваў у беднасці і галечы.

Жудасна ўспомніць той час... крывавым потам былі абліты няшчасныя сялянскія палеткі... Не менш горкай была рабочая доля... Так даводзілася працаваць... За мізэрныя капейкі па дванаццаць і больш гадзін у дзень.

Камуністычная партыя Заходняй Беларусі смела ўзняла сцяг за лепшую будучыню народа...

Магутнай хваляй пракаціліся рэвалюцыйныя выступленні ў Гродне, Скідэлі і іншых гарадах і вёсках.

Як грозная бура ўспыхнула над Нарачу паўстанне рыбакоў.

Пілсудчыкі жорстка распраўляліся з народам. Пухлі,раслі судовыя справы польскай фашысцкай пракуратуры... Але ні кайданы, ні здзекі катаў, ні сырыя, змрочныя камеры і канцэнтрацыйныя лагеры не змаглі зламаць свабодалюбівы дух працоўных.

Гераіня падполля — Вера Харужая, якая аддала жыццё за шчасце народа.

Нямала рэліквій рэвалюцыйнага змагання беражліва захоўваецца сёння ў музеях. Вось і макет падпольнай друкарні ў Гродне, у якой друкаваліся адозвы і лістоўкі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі.

Дваццаць доўгіх, цяжкіх год герaічнай барацьбы народа ўвянчаліся перамогай... Не восень, а вясна радасці і доўгачаканай свабоды зацвіла ў тыя дні над шматпакутнай заходнебеларускай зямлёй, вызваленай з братняй дапамогай савецкага народа...

Пазачарговая сесія Вярхоўнага Савета СССР у Маскве цёпла сустракала прадстаўнікоў працоўных Заходняй Беларусі...

Васемнаццаць год мінула з таго часу... І вось сёння, у Слоніме, сустрэліся былыя сябры па падпольнай барацьбе...

Міхаіл Трафімавіч Аніпчык...

Іван Якаўлевіч Дабрыян...

Міхаіл Раманавіч Скок...

Сябры ўспомнілі мінулыя дні, сваіх таварышаў па змаганні і сярод іх — Паўла Арсеньевіча Жалезняковіча...

Сёння Жалезняковіч — сакратар Карэліцкага райкома партыі і вядзе калгаснікаў раёна да багацця і шчасця...

«Новае жыццё» — так назвалі былыя батракі свой калгас. Новае жыццё... Гэтым, бадай, сказана ўсё... Шчодра родзіць зямля, на якой назаўсёды зніклі межы і палоскі. Дзякуючы багатым ураджаям ільну калгас «Новае жыццё» ў мінулым годзе атрымаў больш чатырох мільёнаў рублёў. Паспяхова развіваецца тут і жывёлагадоўля. Нямала вырасла майстроў высокіх надояў.

Даярка Соф'я Сап'янік надойвае ад кожнай каровы ў год больш дзвюх тысяч кілаграмаў малака.

На сто гектараў ворнай зямлі калгас мяркуе сёлета атрымаць не менш сарака пяці цэнтнераў свініны... Вялікія прыбыткі калгаснікам прынясуць і іншыя фермы.

У заходніх абласцях Беларусі ўжо каля чатырохсот калгасаў-мільянераў...

Сельскі пейзаж усюды ўпрыгожваўся вось такімі міжкалгаснымі электрастанцыямі. Агульны від электрастан-

цыі «Дружба народаў»... Агульны від калгаснай электрастанцыі на рацэ Зэльвянцы.

На вёсцы паявіліся новыя прафесіі і спецыяльнасці. Перамены ўсюды, у кожным сяле... У якім бы калгасе вы зараз ні пабывалі, вы абавязкова ўбачыце шырокае будаўніцтва... Для грамадскага статка ўзводзяцца новыя дыхтоўныя памяшканні. Паглядзіце, які выдатны жывёлагадоўчы гарадок вырас у сельгасарцелі «Новы шлях» Кобрынскага раёна! Добра абсталяваны фермы і ў калгасе імя Сталіна Івацэвіцкага раёна...

Працалюбівыя калгасныя і саўгасныя жывёлаводы жывуць адной думкай — з гонарам выканаць пастаўленую партыяй задачу — дагнаць у бліжэйшыя гады Амерыку па вытворчасці мяса, малака і масла на душу насельніцтва. Дзеля гэтага пашыраюцца плошчы пад каштоўнейшую кармавую культуру — кукурузу. Яна добра расце на палях дбайных і клапатлівых гаспадароў. Усюды да паслуг калгаснікаў — машыны МТС. Уведзеныя ў заходніх абласцях машынна-трактарныя станцыі непазнавальна змянілі спрадвечную сялянскую працу.

Агульны выгляд сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маладзечне ў кастрычніку 1957 года. Хто бачыў гэтай восенню сельскагаспадарчую выстаўку ў Маладзечне, той не мог не заўважыць тут вялікую колькасць тэхнікі... Не драўлянай сахой, а сталёвым трактарам, разумнымі сельскагаспадарчымі машынамі ўзброены сёння новы працаўнік заходнебеларускай вёскі. Магутная тэхніка працуе ўсюды, на шырокіх сацыялістычных палетках...

Ідзе ўборка багатага ўраджаю цукровых буракоў. Гэта новая культура, якую паспяхова сталі вырошчваць калгасы і саўгасы заходніх абласцей. З палёў цукровыя буракі дастаўляюцца на Скідальскі цукровы завод Гродзенскай вобласці — буйное прадпрыемства, узведзенае ў пасляваенныя гады. Першынец цукровай прамысловасці рэспублікі аснашчаны навейшым абсталяваннем. Хоць і малады завод, але ўжо добрая слава ідзе аб яго майстрах. Краіна атрымлівае высакаякасны цукар.

Агульны выгляд Лідскага завода сухога малака. Гэтага прадпрыемства таксама не было раней. Мы з вамі знаходзімся на Лідскім заводзе сухога малака. Тут, у высока-

механізаваных цэхах, перапрацоўваюцца тысячы цэнтнераў малака. Малочную прадукцыю з Лідскай маркай ведаюць у розных гарадах і сёлах... Ліда вядома і заводам сельскагаспадарчых машын. У абноўленых, абсталяваных новай тэхнікай цэхах асвоены выпуск высокапрадукцыйных сарціровак.

Прамысловасць заходніх абласцей дае цяпер амаль у чатыры разы больш прадукцыі, чым у 1940 годзе. Нанава рэканструяваны Ваўкавыскі цэментны завод... У многа разоў павялічылася магутнасць гэтага буйнага ў рэспубліцы прамысловага прадпрыемства.

Майстар Ігнатовіч за работай каля печы. Сямён Ігнатовіч праславіўся тут як выдатны майстар абпальвання. Няспынным патокам ідзе ваўкавыскі цэмент. Каштоўны будаўнічы матэрыял накіроўваецца адсюль на шматлікія новабудоўлі...

Будуюцца, маладзеюць, абнаўляюцца гарады заходніх абласцей. Пабывайце зараз у Маладзечне! У маладым абласным цэнтры шпаркімі тэмпамі ўзводзяцца культурна-бытавыя ўстановы, школы, жылыя дамы для працоўных.

Будаўніцтва жылых будынкаў у Гродне. Сівыя, старадаўнія руіны Гродна ўступаюць месца новым, прыгожым кварталам дамоў. У горадзе сорак два прамысловыя прадпрыемствы, насельніцтва хутка расце. Вось чаму тут многа будуюць жылля. Столькі шчаслівых наваселляў, як сёлета, яшчэ, бадай, не было!

Наведаем з вамі сям'ю гродзенскіх ткачоў Купрашэвічаў. Вялікая, дружная, шчаслівая сям'я. Стары ткач Іван Уладзіміравіч добра памятае гаротны лёс рабочага чалавека ў панскай Польшчы, асуджанага на голад, вечнае жабрацтва і беспрацоўе. У 1926 годзе ў адной толькі Гродне было дзесяць тысяч беспрацоўных. На свой родны тонкасуконны камбінат Купрашэвічы прыходзяць як гаспадары. Яны працуюць тут на сябе, у новых, светлых цэхах, зусім не падобных на маленькія ў мінулым кустарныя майстэрні. Клопатамі аб сваёй любімай справе жывуць Іван Уладзіміравіч і яго сын, памочнік майстра Пётр Іванавіч. Побач, у ткацкім цэху, працуе жонка малодшага сына Тамара. Тут жа і жонка старэйшага сына — Жанна. Браты Пётр і Міхаіл Купрашэвічы — студэнты завочнага тэкстыльнага тэхнікума, яны настойліва вучацца, павышаюць сваё майстэрства.

Цэх шклозавода «Нёман». Узбагацілася, непараўнальна вырасла і майстэрства рабочых завода «Нёман». Моладзь тут дапытліва пераймае вопыт старэйшых умельцаў. Залатыя рукі ў заводскіх майстроў. Колькі любові і натхнення ў гэтай патрабуючай тонкага мастацкага густу працы! «Нёманскія» вырабы ўпрыгожваюць быт савецкага чалавека, карыстаюцца ўсюды шырокай папулярнасцю.

У заходніх абласцях нямала майстроў і такога старажытнага рамяства, як кераміка.

Пазнаёмім вас і з своеасаблівым народным умельцам Іосіфам Васільевічам Бохапам з-пад Вілейкі. Многа год ён прысвяціў стварэнню скрыпак і іншых струнных інструментаў. Першы слухач заўсёды жонка — Аксіння Ігнатаўна.

Чытальная зала Астрамечаўскай бібліятэкі. Будні вечар у вёсцы Астрамечава непадалёк ад Брэста. Забыты едкі дым лучыны. Агні сельскай бібліятэкі прыцягваюць калгаснікаў. Некалі непісьменныя людзі прагнуць кніг, ведаў.

Па дарозе едуць і ідуць школьнікі. Дарога ў школу... Калісьці яна была закрыта для дзяцей працоўных заходніх абласцей.

Гняздоўская школа. Кожную раніцу дзетвара Гняздоўскай школы Ваўкавыскага раёна запаўняе светлыя, прасторныя класы. Час, калі нельга было вучыцца на роднай беларускай мове, мінуў беззваротна. Гэта школа-інтэрнат у Лідзе. Дзяржава ўзяла на сябе поўнае ўтрыманне юных выхаванцаў. Тут створаны ўсе ўмовы для плённай вучобы і ўсебаковага развіцця. Расці, вучыся, авалодвай ведамі!

Пры панскай Польшчы ў Гродне была толькі адна навучальная сельскагаспадарчая ўстанова — курсы кавання коней, а зараз тут сельскагаспадарчы інстытут і больш дваццаці іншых навучальных устаноў.

Вывеска Брэсцкага педагагічнага інстытута. У Брэсцкім педагагічным інстытуце звыш тысячы студэнтаў. Яны папаўняюць шматтысячную армію настаўнікаў вобласці. Неўзабаве скончаць інстытут выдатнікі вучобы Вера Дзенісюк і Пётр Сідарчук.

Вароты Бераставіцкай бальніцы.

Там, дзе быў маёнтак графа Касакоўскага, узведзены

новы гарадок Берастаўіцкай раённай бальніцы. Хіба раней мог працоўны чалавек марыць аб бясплатным высокакваліфікаваным лячэнні, аб такіх вось абсталяваных бальніцах? Зараз толькі на адной Гродзеншчыне — шэсцьсот шэсцьдзесят медыцынскіх устаноў. З першага дня нараджэння, усё сваё жыццё чалавек акружаны клопатамі і ўвагай. У былым панскім маёнтку размясціўся дом адпачынку «Рось». Тут адпачываюць, набіраюцца здароўя і сіл выкладчык Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута Бабіч, чыгуначніца Антаніна Яфімаўна Шчэрба, працоўныя з розных канцоў рэспублікі.

Заняткі ў Брэсцкай студыі выяўленчых мастацтваў. Расцвітаюць народныя таленты. У студыі Брэста мы сустрэлі самадзейных мастакоў Бялянкіна і Селіхава. Карціна Селіхава «Абарона Брэсцкай крэпасці».

На рэспубліканскай выстаўцы народнай творчасці ў Мінску было прадстаўлена многа работ, створаных таленавітымі майстрамі заходніх абласцей. Разьба па дрэве заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Казёлкі.

Габелен гродзенскіх ткачых-вышывальшчыц. У гэтым творы паказана вялікая любоў народа да Уладзіміра Ільіча Леніна. Ленін! Святлом яго неўміручых ідэй азораны шчасце і светлы лёс народа.

Дзеці з кветкамі ля помніка. Кожны год піянеры Гродзеншчыны прыходзяць да помніка Леніну, каб даць клятву вернасці справе вялікага правадыра. З іменем Леніна ў сэрцы святкавалі працоўныя заходніх абласцей слаўнае 40-годдзе Вялікага Кастрычніка. Ідуць дэманстранты ў Гродне.

Людской радасцю перапоўнены старажытны Гродна. Сваю адданасць Камуністычнай партыі дэманструюць жыхары пагранічнага Брэста. Працоўныя заходніх абласцей разам з усёй савецкай Беларуссю ў дружнай сям'і братніх народаў Радзімы ўпэўнена крочаць насустрач камуністычнай будучыні.

*Кастрычнік, 1957*

# СЧАСТЬЕ НАДО БЕРЕЧЬ

ЛИТЕРАТУРНЫЙ СЦЕНАРИЙ
ПО ПОВЕСТИ А. КУЛАКОВСКОГО
«НЕВЕСТКА»

Впервые увидели мы эту девушку в тот день, когда...

Из переулка выскочила девушка и побежала вдоль пустынной и безлюдной улицы. Что-нибудь случилось? Почему она так торопится? Куда она спешит? Что ее так встревожило? Радость? Беда? Заглянем ей в лицо... На короткое мгновенье промелькнуло оно перед нами: красивое, молодое и радостно-возбужденное. Девушка повернула во двор той хаты, перед окном которой стоит рябина с красными гроздьями. Хата маленькая, старенькая, покосившаяся.

Последуем за этой девушкой.

Глубоко и часто дыша, она вбегает в хату. Осматривается — в хате никого нет, пусто и неуютно. Девушка подходит к маленькой скамеечке у окна. Там стоит белая алюминиевая кружка и ведро. Девушка опускает кружку в ведро, пробивает тонкую корку льда и делает несколько глотков.

С печи слышится кашель простуженного человека и вопрос:

— Кто там?

— Дядько Данила, это я, Лариса. Вам письмо.

С печи торопливо слазит Данила, старик лет за шестьдесят, с редкой взлохмаченной бороденкой; на голове — овчинная шапка-ушанка, на плечи накинут полушубок, на ногах старые подшитые валенки.

— От сына,— Лариса протянула старику конверт.

— Спасибо, голубка, спасибо,— Данила бережно берет письмо двумя руками, так, как обычно берут икону.

— Может, вам прочитать? — мягко и ласково предложила Лариса.

— Почитай,— старик, соглашаясь, кивнул головой и передал письмо девушке.

Лариса расклеила конверт и... удивилась письму — слишком уж оно коротенькое.

— «Добрый день, дорогой папаша! — начала читать девушка.— Спешу тебе сообщить, что я уже демобилизовался. Поскольку теперь армию сокращают, я скоро приеду домой. Скоро встретимся и поговорим обо всем. Не скучай, дорогой отец. Крепко тебя целую и обнимаю. Твой сын — старший сержант Виктор Данилович Бирюк. До скорой встречи».

— Вот и все,— от себя добавила Лариса, как бы успокаивая старика, что в письме ничего страшного нет.

— Торопился, потому и коротко написал,— оправдал Данила сына перед Ларисой.— Значит, едет... дождался все-таки...

Бороденка у старика вздрогнула, а грустные глаза часто-часто заморгали. Это тронуло Ларису.

— И я рада за вас,— с чувством сказала она. И это были не только слова.— Мне он тоже письмо прислал.— Как бы желая разделить со стариком одинаковое чувство, сообщила девушка.

— До свиданья,— Лариса попрощалась и ушла. Старик только кивнул ей головой.

Старик снова остался один, как бобыль, в этой бедной и пустой хате. Он ласково гладит листок бумаги, лежащий на столе, будто самого сына ласкает. Медленно обводит глазами избу: голые окна с наростом изморози, непокрытый стол, изъеденную червем скамью, закоптелую, давно не беленную печь, старую деревянную, топорной работы кровать, покрытую поношенным серым одеялом. Так, видимо, осматривал бы свою камеру, прощаясь с ней перед выходом на волю, человек, проведший многолетнее одиночное заключение. Данила подходит к кровати, присаживается на корточки, вытаскивает из-под кровати сундук, раскрывает его. Это тот заветный сундук, который привез в дом Данила вместе с невестой. Тут он хранит дорогие для его памяти вещи: письма сына, аккуратно сложенные в длинном ящичке, пристроенном у боковой стенки сундука, а в бельевом отделении сверху лежит единственная вещь, оставшаяся после смерти жены,— покрывало с вышитыми ее руками красными петушками и само-

дельными кружевами. А на внутренней стороне крышки приклеена старая фотография сравнительно молодой женщины. Это была жена Данилы, Ульяна. Данила, обращаясь к ней, сказал:

— Едет сын...— и закрыл глаза.

Из затемнения. Мы видим эту женщину лежащей в постели. Изможденное лицо с болезненным, страдальческим выражением. Она тяжело дышит. Рот приоткрыт. В глазах у нее слезы. Женщина прижимает к себе ребенка — двухлетнего мальчика. У кровати умирающей, опустив голову, стоит мрачный Данила и держит в руках горящую свечу.

— Сынок мой...— прощаясь с сыном, плачет женщина. Плачет долго, слабо всхлипывая. Затем дрожащим голосом с мольбою обращается к мужу:

— Дани-ила... Я чистая перед тобой, как перед богом. Это наш сын, это твой сын. Клянусь тебе. Перед смертью не стану я брать грех на душу...— Через каждые два-три слова женщина делает паузу.— Двенадцать лет мы ждали его... Думала, что я виновата... Бог дал дождались... А ты... Дани-ила... Злые люди пустили сплетню... Это твой сын,— она слабыми руками протягивает ребенка мужу.

Мечется пламя на свечке. Дрожит рука у Данилы. Но Данила остается непреклонным. Он не смотрит в глаза женщине. Он отвел взгляд в сторону. Плотно сжаты его губы. Немолодое лицо сорокалетнего мужчины безжалостно невозмутимо. Слышно, как всхлипывания женщины становятся реже, тише, тише и затухают. Наконец вздрогнуло лицо у Данилы. В глазах отразился страх, а может быть, и запоздалое раскаяние: а вдруг женщина действительно не виновата. Закричал ребенок. Данила закрыл глаза. Из-под ресниц поползла слеза...

Мы видим, как затуманивается лицо Данилы. Оно еле различимо, будто за мутной пеленой, будто смотрим мы на него сквозь собственные слезы. Но вот пелена постепенно стирается, туман становится реже, яснее проступают черты лица Данилы, не того Данилы, сорокалетнего мужчины, а теперешнего, шестидесятилетнего старика. Он стоит на коленях перед сундуком с закрытыми глазами, а из-под ресницы катится по щеке крупная слеза. Данила открывает глаза, видит фотографию жены и тихо говорит:

— Едет наш сын...

Глядя себе под ноги, Виктор с чемоданчиком идет по улице своей деревни. Вот он глянул исподлобья и в нерешительности остановился против своего двора. У него, как видно, не хватало ни силы воли, ни смелости войти в свой

дом. Он поставил чемоданчик у ноги. Неизвестно, сколько бы он так стоял, а может быть, так и не зашел бы домой, снова сбежал бы, но решиться помогла... Катя. Она подошла к нему и спросила не то с иронией, не то с сочувствием:

— Что? Боишься зайти или... душе противно?

Виктор взглянул на нее и отвел глаза в сторону.

— Если что, так... Слышишь, Витя...

— Подожди ты,— не дал ей договорить Виктор и пошел в дом. Правда, он, кажется, не те слова подобрал. К его интонации больше подходили слова «отстань ты». Но Катя провела его в дом глазами и, когда он скрылся за дверью, сказала просто и искренне:

— Хорошо, я подожду.

Она не ушла. Нет, осталась стоять, будто действительно собралась ждать его тут.

Через минуту из хаты вышел немой, взял чемоданчик и пошел в избу.

*Сакавік, 1957*

# КАНДРАТ КРАПІВА — НАРОДНЫ ПІСЬМЕННІК

## СЦЭНАРЫЙ ДАКУМЕНТАЛЬНАГА ФІЛЬМА

Свой кароткі расказ пра народнага пісьменніка Беларусі, выдатнага сатырыка Кандрата Кандратавіча Крапіву мы пачнём так:

Выбух смеху. Перад намі тэатральная зала. Рагочуць людзі, смяюцца да слёз. Смяюцца рабочыя, смяюцца калгаснікі, смяюцца вучоныя і інжынеры, маладыя і пажылыя. Смяецца народ...

На сцэне тэатра імя Янкі Купалы ідзе спектакль «Хто смяецца апошнім». *(Можна выбраць урывак з фільма «Хто смяецца апошнім».)* Выклікаюць гэты смех слабасці чалавечых характараў, перажыткі мінулага, якія яшчэ бытуюць у нашым асяроддзі. Хто ж іх падмеціў, хто іх вывеў на сцэну для асмяяння? Хто гэты чалавек, які прынёс людзям столькі весялосці, эстэтычнай асалоды?

Вось ён — высокага росту дзядзька, заўсёды задуменны, пахмуры, нават суровы. Кандрат Кандратавіч ходзіць паміж градак невялікага агародзіка на сваёй дачы. Ён любуецца прыгожымі кветкамі, ягадамі, гароднінай — любуецца тым, што прыносіць людзям карысць, упрыгожвае чалавеку жыццё. Як клапатлівы і ўважлівы гаспадар, ён абводзіць позіркам кусцістую зеляніну. І вось яго вострае вока заўважыла непарадак. Каля клубнічнага куста з чырвонымі сакавітымі ягадамі прыстроіўся паразіт — асот. Нахіліўся стары, цяпнуў матыжкай, выцягнуў з коранем асот і са злосцю выкінуў за плот. У Кандрата Кандратавіча гэта прафесійная рыса: як пісьменнік-сатырык ён не любіць пустазелля, выкарчоўвае ўсё тое, што перашкаджае расці маладому, прыгожаму, карыснаму, светламу.

Пасля кароткага адпачынку Кандрат Кандратавіч пакідае агарод і ідзе ў свой кабінет працаваць. Садзіцца за стол, на якім ляжаць стосы паперы і рукапісаў. Уважліва нешта чытае, правіць.

Пакуль ён працуе, пералістаем гэты альбом. *(З дазволу гаспадара.)* Ад Кандрата Кандратавіча, які працуе за сталом, кінакамера спанараміруе па пакоі. Спыніцца на фатаграфіі на сцяне альбо на *альбоме.*

Амаль сорак год таму назад Кандрат Кандратавіч Атраховіч прыйшоў у літаратуру разам з імі — маладымі хлопцамі з вёсак і рабочых ускраін. На фатаграфіі мы ўбачым маладога яшчэ Кандрата Кандратавіча сярод такіх жа маладых, па-вясковаму апранутых хлопцаў. Многія з іх сталі вядомымі пісьменнікамі: Кузьма Чорны, Паўлюк Трус, М. Лынькоў, П. Броўка, П. Глебка, Максім Лужанін, М. Чарот, А. Александровіч.

Вёска Нізок, дзе нарадзіўся Кандрат Крапіва.

Вось у гэтай вёсцы Нізок на Уздзеншчыне нарадзіўся і правёў сваё маленства народны пісьменнік Беларусі Кандрат Кандратавіч Атраховіч.

Вёска Каменка і вёска Астравец, дзе ён настаўнічаў пасля дэмабілізацыі з радоў Чырвонай Арміі.

Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя абудзіла духоўныя сілы беларускага народа.

Магчыма, вось так, як гэтыя хлопцы, прыйшоў малады паэт у Мінск са сваімі першымі творамі.

Можна скарыстаць кадры з камсамольскай кінанавелы. Па прасёлках ідуць вясковыя хлопцы з клункамі за плячыма. Ідуць у горад па навуку, у пошуках новага жыцця.

Першыя сатырычныя вершы і фельетоны Крапіва надрукаваў у газетах «Красноармейская правда» і «Савецкая Беларусь» у 1922 годзе. Верш «Крапіва» тлумачыць сатырычную сутнасць псеўданіма пісьменніка, з'яўляецца яго літаратурнай праграмай.

Старонкі газет «Красноармейская правда» і «Савецкая Беларусь» з вершамі Кандрата Атраховіча: «Жылі-былі», «Што я бачыў на «Трэку», «Плеткары», «Малітва па-беларуску». Верш «Крапіва» (газета «Савецкая Беларусь» № 289 за 1922 год).

## КРАПІВА

Я ў мастацкім агародзе
Толькі марная трава.

А якая? — смех, дыйі годзе:
Я — пякучка-крапіва.

Я расту вось тут пад плотам
І не так даўно ўзышла,
А ўжо многім абармотам
Рукі-ногі папякла.

Хто палез за агуркамі,
Хай той посіць пухіры —
Мяне голымі рукамі
Асцярожна, брат, бяры.

Хто сустрэўся быў са мною,
Дакрануўся раз ці два,
Дык той ведае ўжо, хто я:
Я — пякучка-крапіва.

Нават першыя творы Кандрата Крапівы карысталіся шырокай папулярнасцю ў народзе, асабліва сярод моладзі.

Бібліятэка. Чытачы бяруць першыя зборнікі баек і вершаў Крапівы: «Асцё», «Крапіва», «Біблія».

На самадзейнай сцэне хлопец у чырвонаармейскім шлёме дэкламуе верш «Чырвоная мятла добра мяла». І як ілюстрацыю да радкоў верша можна скарыстаць сатырычныя плакаты часоў грамадзянскай вайны на царскіх генералаў і адміралаў — Дзянікіна, Калчака, Урангеля, Юдзеніча і белапольскіх акупантаў. Можна выкарыстаць таксама і фрагменты з фіналу кінакарціны «Валачаеўскія дні».

## ЧЫРВОНАЯ МЯТЛА ДОБРА МЯЛА

Адусюль паналяцелі
На здабычу груганы,
Вольнай волі захацелі
Вочы выклеваць яны.

Вось вядома ўсяму свету,
Чарнаморскі адмірал
Пра вайною на Саветы —
Войска моцнае сабраў.

Мы ж расправіліся з гадам —
Не пабачыў ён Масквы:

Той штыком, а той прыкладам —
І Калчак — без галавы.

Вось якраз такім жа родам
Браў Юдзеніч Петраград,—
К нам палез са ўсякім збродам,
Потым сам жа быў не рад:

Генеральскімі рукамі
Прыхапіў разбіты нос
І з мяшэчкам за плячамі
Ногі ледзь ад нас унёс.

Неўзабаве тут за ім
І Дзянікін,— вось ён, вот,—
З афіцэрамі сваімі
На Маскву разявіў рот.

Не Маскву яму, а дулю! —
Не збылося, як хацеў:
Мы пяро яму ўваткнулі.—
Ён ад нас і паляцеў.

Не адзін аб троне марыў.
Вось і Врангель, фон-барон,
Гэткім самым жа макарам
Сесці мерыўся на трон.

Мы ж не цацкаліся з гадам,
Не зважалі, што барон,
У галёш падбітым задам
Неўзабаве сеў і ён.

Вострае сатырычнае слова Крапівы было грознай зброяй супраць забабонаў, невуцтва і цемрашальства-папоўшчыны. Не адзін цвік забіты сюды сатырычным словам Крапівы.

«Кінь, Ілья, пустое дзела!
Твая тэхніка ўстарэла.
Ну якая ў тым патрэба,
Што калоціш часам неба?»

Па вясковай вуліцы ідзе група моладзі і пад гармонік задорна спяваюць «Камсамольскія прыпеўкі» К. Крапівы. Звоняць царкоўныя званы, але група моладзі праходзіць міма царквы. Царкоўныя дзверы накрыж забіты

дошкамі. Зачынена царква і пустая паперць. На гэтым фоне чытаецца верш «Устарэлая тэхніка».

Творчасць Крапівы садзейнічала станаўленню новай сацыялістычнай культуры ў вёсцы і горадзе.

Дзеці ўваходзяць у гасцінна расчыненыя дзверы школы.

Вечарэе. Людзі ідуць у клубы, у Дамы культуры.

Ад паэта-сатырыка даставалася на арэхі бюракратам і падхалімам, п'яніцам і растратчыкам, буржуазным нацыяналістам і перараджэнцам, двурушнікам і ворагам народа.

Мультыплікацыі на тэму байкі «Жаба ў каляіне».

Мімічная сцэна на тэму «Дзед і баба». Акцёр чытае байку «Дыпламаваны баран».

## ДЫПЛАМАВАНЫ БАРАН

*Байка*

У адным сяле (не важна — дзе)
Хадзіў Баран у чарадзе.
Разумных бараноў наогул жа нямнога,
А гэты дык дурней дурнога —
Не пазнае сваіх варот:
Відаць, што галава слабая.
А лоб дык вось наадварот —
Такога не страчаў ніколі лба я:
Калі няма разумніка другога,
Пабіцца каб удвух,
Дык ён разгоніцца ды ў сцену — бух!
У іншага дык выскачыў бы й дух,
А ён — нічога.
І вось за дурасць гэту
Яго вучоным раз празвалі нейк насмех,
І каб двара не перабег,
На шыю прывязалі мету:
— Вось,— кажуць,— і дыплом табе.
Што гэта за «дыплом», Баран — ні «мя», ні «бэ»,
Аднак жа перад Кошкаю пачаў ён ганарыцца:
— А што ж ты думала, сястрыца!
Хіба мне пахваліцца няма чым?
Дыплом я заслужыў, здаецца ж, галавою,
І не раўнуйся ты са мною.
— Аб гэтым лепей памаўчы,—
Сказала яму Кошка.—
Каб ты быў разумнейшым трошка,

Ды розумам раскінуць мог авечым,
То ўбачыў бы, што ганарыцца нечым,
Бо заслужыў ты свой дыплом
Не галавой, а лбом.

---

Другі баран — ні «бэ», ні «мя»,
А любіць гучнае імя.

Багаты папярэдні вопыт паэта-сатырыка найбольш ярка і змястоўна выявіўся ў п'есах Крапівы.

Разгортваецца афіша п'есы «Канец дружбы».

Па вуліцы горада праходзяць людзі, спыняюцца каля афішы, у якой паведамляецца, што тэатр імя Янкі Купалы паставіў спектакль па п'есе К. Крапівы «Партызаны». Урывак з п'есы «Партызаны».

Даніла. Дзядзька Батура, ты можаш знайсці такога чалавека, які б даставіў адну пісульку начальніку павета пану Яндрыхоўскаму? Трэба зрабіць так, каб яна неўзаметку ў яго на стале апынулася.

Батура. А калі гэта трэба?

Даніла. Заўтра. Як мага хутчэй, а то мы спазніцца можам.

Батура. Ёсць у мяне адна жанчына.

Даніла. Вось і добра.

Халімон *(шпарка падыходзіць да Данілы)*. Так што даставілі ў спраўнасці, начальнік.

Даніла. Давайце сюды.

Халімон. Міхаль, каб ты спруцянеў, што ты там марудзіш?

Міхаль *(з цемры густым басам)*. Ісці не можа ад страху.

Халімон. То нясі.

Міхаль. Нясу. *(Праз хвіліну, абхапіўшы ўпол, нясе паню Яндрыхоўскую. У яе звязаны назад рукі, а рот заткнёны канцом шаля.)*

Даніла. Нашто рот заткнулі?

Міхаль. Вішчэла, як свіння ў плоце.

Даніла. А рукі?

Халімон. Дзярэцца, каб яна напрэла.

Даніла. Развяжыце.

Міхаль развязвае з рук папружку і надвязвае ёю сабе штаны. Халімон вымае з рота шаль.

Пані Яндрыхоўская. В іме ойца і сына свентэго духа, амэн. Матка боска, дзе ж гэта я?

Даніла. У мяне ў гасцях.

Пані Яндрыхоўская. А вы — начальнік?

Даніла. Начальнік.

Пані Яндрыхоўская. Ваш твар... я вас недзе бачыла, але цяпер... нічога не памятаю.

Даніла. Завуць мяне Даніла Дрыль. Мы, здаецца, знаёмы.

Пані Яндрыхоўская абамлела.

Дзед Бадыль. Хе-хе. Відаць, што знаёмы.

Халімон. Міхаль, давай дзікалону, пані выпрудзілася.

Міхаль. Дзе я табе вазьму?

Халімон. Пад вываратам... Цэлая лужына. *(Міхаль пайшоў.)*

Халімон *(прыкладае вуха да грудзей пані)*. Жывая, сэрца дрыгае.

Міхаль прыносіць у шапцы ваду. Халімон мачае руку і пырскае пані ў твар. Яна лыпае вачыма і павольна садзіцца.

Дзед Бадыль. Папырскаў бы яе, гадаўку, як яна нас пырскала.

Пані Яндрыхоўская *(становіцца на калені і сашчэплівае рукі)*. Божа літасцівы! Малюся табе, як сын твой маліўся ў садзе Гефсіманскім. Калі можна, хай абміне мяне келіх пакуты гэтай. Нашлі агонь нябесны, хай грымне пёрун і спапяліць ушчэнт нягоднікаў, што паднялі руку на верную служку тваю.

Дзед Бадыль *(замахваецца кіем)*. Ах, поскудзь! Вось як трахну, дык будзе табе і пёрун!

Даніла. Чакай, дзед. Мы ўсё зробім па парадку.

Пані Яндрыхоўская. Волесь, дзецко мое. Бывай навекі!

Даніла. Не памірай, пані, ты нам патрэбна.

Пані Яндрыхоўская. На здзекі? Лепш смерць.

Даніла. Мы караем, але не здзекуемся... Болесь — гэта ваш сын, начальнік павета?

Пані Яндрыхоўская. Мой сын.

Даніла. Гэта тое ваша дзецко, ад якога ўвесь павет стогне? *(Пані Яндрыхоўская маўчыць.)* Вы ведаеце, што ад яго ўвесь павет стогне?

Пані Яндрыхоўская. Мой сын выконвае тую місію, якую ўсклала на яго айчызна.

Дзед Бадыль. Пачакай, мы яшчэ патаўком яму гэту мысію.

Даніла. А па паню таксама айчызна ўсклала місію — народ катаваць?

Пані Яндрыхоўская. Я слабая кабета, я не магу нікога катаваць.

Халімон. Ах, каб ты папрэла, слабая! Міхаль, пакажы ёй, як япа цябе размалявала.

Міхаль *(з сур'ёзам распяразвае папружку. Гледзячы на Данілу).* Паказаць?

Даніла. Не трэба. Пані і так добра памятае.

Дзед Бадыль. Сама ж на стайні была, здаецца.

Даніла. А без хлеба і без прытулку пані людзей пакінула, з торбамі пусціла — гэта таксама ад слабасці ды ад вялікай дабраты? *(Пані Яндрыхоўская маўчыць.)* А ў турмы пазасаджвала... Дык вось што, пані... За здзекі з людзей, за катаванне я вас... асуджваю па смерць.

Пані Яндрыхоўская закрывае твар рукамі, ногі яе слабеюць.

Халімон *(падтрымлівае паню).* Стой, каб ты папрэла, чаго валішся без пары.

Даніла. Але я дарую вам жыццё, калі вы зробіце адну рэч.

Пані Яндрыхоўская. Калі гэта ў маіх сілах.

Дзед Бадыль *(Данілу, узрушаны).* Як гэта ты даруеш? А калі я не дарую? А калі твая маці, нябожчыца, не даруе?

Даніла. Не гарачыся, дзед, даслухай да канца. Я кажу так не таму, што шкадую гэту гадзіну, а таму, што хачу выратаваць людзей, якіх чакае смерць. *(Да пані.)* У лапах вашага сына знаходзяцца тры мае партызаны. Іх чакае расстрэл. Дык напішыце сыну свайму, гэтаму сукіну сыну, начальніку павета пану Яндрыхоўскаму, каб ён іх зараз жа выпусціў. Напішыце таксама, каб ён выпусціў тых сялян, якіх вы засадзілі ў турму, і вярнуў ім усе страты. Не забывайце, што з вамі будзе, калі я не выратую гэтых людзей.

Пані Яндрыхоўская. Але ж гэта справа дзяржаўная, сын мой можа мяне і не паслухаць.

Даніла. Пішыце так, каб паслухаў. Слязу пусціце. Вы гэта ўмееце, вучыць вас не трэба. Вось вам папера і аловак. *(Бярэ ў будане паперу і аловак і падае пані Яндрыхоўскай.)*

Халімон. Проша, пані, да стала. *(Бярэ Яндрыхоў-*

Андрэй Макаёнак і Анатоль Вярцінскі —
дэлегаты VII з'езда пісьменнікаў Беларусі.
1976 год.



Андрэй Макаёнак з дачкою Алай.
3 ліпеня 1969 года.



*скую пад руку, падводзіць да пня і садзіць на купіну.)* Крэсла хоць крыху запіхкае, але мяккае.

Д а п і л а. Пішыце, я чакаю...

Больш дваццаці год красуецца гэта афіша на вуліцах Мінска, а спектакль «Хто смяецца апошнім» з'яўляецца жамчужынай у рэпертуары тэатра імя Янкі Купалы.

Небываламу поспеху спектакля садзейнічалі выдатныя майстры сцэнічнага гумару Глеб Паўлавіч Глебаў, Л. Р. Рахленка, Б. В. Платонаў, Л. І. Ржэцкая.

Афіша. «Хто смяецца апошнім».— 300-ты спектакль.

Перад тэатрам група акцёраў, сярод іх народныя артысты СССР Глебаў, Платонаў, Ржэцкая, народныя артысты БССР Рахленка, Бірыла. Потым мы пабываем у грыміровачных акцёраў Глебава, Рахленкі, Платонава, Ржэцкай.

Урывак са спектакля «Хто смяецца апошнім».

Т у л я г а *(уваходзіць нясмела)*. Вы мяне клікалі, Аляксандр Пятровіч?

Г а р л а х в а ц к і. Я, Мікіта Сымонавіч, хацеў сказаць вам адну рэч, ды не ведаю, ці варта. Уласна кажучы, і гаварыць я не маю права.

Т у л я г а *(спужана)*. Што-небудзь для мяне непрыемнае?

Г а р л а х в а ц к і. Не скажу, каб гэта было вельмі прыемна для вас.

Т у л я г а *(калоцячыся)*. Аляксандр Пятровіч, родненькі! Што ж такое?

Г а р л а х в а ц к і. Прыходзілі, пыталіся пра вас.

Т у л я г а. Пра мяне?

Г а р л а х в а ц к і. Так. Кажуць, у вас працуе тут нейкі Туляга. Чалавек нявысветлены.

Т у л я г а *(са страхам)*. Нявысветлены?

Г а р л а х в а ц к і. Ці не вядзе ён, кажуць, тут якойнебудзь падрыўной работы і ці праўда гэта, што ён дзянікінскі палкоўнік?

Т у л я г а. Палкоўнік?

Г а р л а х в а ц к і. Так. І прозвішча палкоўніка называлі, але я забыўся.

Т у л я г а. Не Падгаецкі?

Г а р л а х в а ц к і. Здаецца, Падгаецкі.

Т у л я г а *(хапаецца за галаву)*. Ай, ай! Дайшло-такі! Каб яна праваліліся з сваім языком! Прасіў жа не гаварыць нікому.

Гарлахвацкі. А вы каму-небудзь расказвалі на сакрэту сваю біяграфію?

Туляга. Паверце, Аляксандр Пятровіч, што ўсё гэта выдумка ад пачатку да канца. Я палкоўнікам ніколі не быў.

Гарлахвацкі. Ну, можа, падпалкоўнікам. Справа ж не ў гэтым.

Туляга. І падпалкоўнікам не быў.

Гарлахвацкі. А чаго ж вы былі ў Дзянікіна?

Туляга. Я не ў Дзянікіна, а ў варонежскай гімназіі настаўнікам быў.

Гарлахвацкі. А я вас, помніцца, бачыў недзе на фатаграфіі... у палкоўніцкай форме.

Туляга. Вы, мусіць, бачылі палкоўніка Падгаецкага. Ён быў падобны да мяне.

Гарлахвацкі. Іначай кажучы, ваша сапраўднае прозвішча Падгаецкі? Вы тут пад чужым прозвішчам?

Туляга. Што вы, Аляксандр Пятровіч! Я і на свет нарадзіўся Тулягам. І дзяды і прадзеды мае былі Тулягі...

Гарлахвацкі. Значыць, вы ў Дзянікіна былі пад чужым прозвішчам?..

Туляга. І там я быў Туляга. Я ж кажу,— настаўнікам быў.

Гарлахвацкі. Як жа вы з Беларусі аж там апынуліся?

Туляга. Ад немцаў уцякаў. Як немцы ў 1915 годзе Баранавічы ўзялі, дык я і пераехаў.

Гарлахвацкі. Ну, гэтыя казкі вы расказвайце сваёй бабулі. Ніхто ім не паверыць.

Туляга. Як жа мне гэта даказаць? Да каго звярнуцца? Навучыце, Аляксандр Пятровіч.

Гарлахвацкі. Дакажыце сваёй працай.

Туляга. А як жа з палкоўнікам быць?

Гарлахвацкі. Гэта мы без вас высветлім.

Туляга. Значыць, толькі працаю?

Гарлахвацкі. Працаю і паводзінамі. Што да працы, дык я прапаную вам заняцца палеанталогіяй.

Туляга. Палеанталогіяй? Чаму палеанталогіяй?

Гарлахвацкі. Я хачу, каб вы працавалі пад маім непасрэдным наглядам.

Туляга. Што ж я буду рабіць пад вашым наглядам?

Гарлахвацкі. Мы будзем з вамі пісаць навуковую працу.

Туляга. Мы з вамі? Удвух?

Гарлахвацкі. Так. Вы напішыце, а я прачытаю, праверу. Пасля мы яе зачытаем на савеце, апублікуем.

Туляга. За нашымі подпісамі?

Гарлахвацкі. Не. Вы ж разумееце, што ставіць сваё прозвішча побач з вашым мне нязручна.

Туляга. Значыць, толькі за маім подпісам?

Гарлахвацкі. Не, толькі за маім.

Туляга. Значыць, напішу працу я, а яна будзе лічыцца вашай?

Гарлахвацкі. Гэта зусім не важна, чыёй яна будзе лічыцца. Важна тое, каб гэта праца не прапала для грамадства. Прозвішча ваша можа яе скампраметаваць.

Туляга. Ага, разумею... Толькі я хацеў запытацца ў вас, ці не будзе гэта... подласцю?

Гарлахвацкі. Вы забываецеся, гаспадзін палкоўнік!

Туляга. Выбачайце, я не вас меў на ўвазе. Я кажу, ці не будзе гэта подласцю з майго боку?

Гарлахвацкі. Ну, ваш бок мяне мала цікавіць. Скажыце, вы згодны так працаваць?

Туляга. Дазвольце мне падумаць.

Гарлахвацкі. Дзве мінуты. *(Прайшоўся па пакоі.)* Я ведаю, што вы думаеце. Вы думаеце, а што, калі расказаць пра гэта сакратару парткома Левановічу альбо Веры? Праўда, думаеце так?

Туляга. Прызнаюся, прыходзіла мне ў галаву такая думка.

Гарлахвацкі. Дык выкіньце яе з галавы. Яна вас загубіць. Сведак у вас няма, ніхто вам не паверыць, а павераць мне. І мне няцяжка будзе даказаць, што гэта паклёп, вылазка дзянікінца. Тады трымайцеся! Варта мне толькі зняць трубку, пазваніць — і ваша песенька спета. *(Туляга сядзіць прыгнечаны.)* Ну дык як? Згодны?

Туляга *(прыгнечаны)*. Згодзен.

Гарлахвацкі. Даўно б так. А цяпер наконт працы... Я думаю, што нам гэта дрэнь не падыдзе. *(Паказвае на косці маманта.)* Мамантаў цяпер сталі чуць не хатняй жывёлай. Трэба знайсці нешта новае.

Туляга. Новае тут цяжка знайсці.

Гарлахвацкі. Знойдзеце, вы толькі пашукайце добра. А я аб'яўлю, што пішу працу на тэму: «Новы від дагістарычнай жывёлы». Дагаварыліся?

Туляга *(слабым голасам)*. Дагаварыліся. *(Выходзіць прыгнечаны.)*

Г а р л а х в а ц к і *(адзін).* Гатоў. Цяпер хоць ты з яго вяроўкі ві.

За гэты спектакль Кандрат Кандратавіч Крапіва і Глеб Паўлавіч Глебаў у 1940 годзе былі ўдастоены звання лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі СССР.

Па-сяброўску гутараць Кандрат Кандратавіч Крапіва і Глеб Паўлавіч Глебаў *(з медалямі лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі СССР на лацканах пінжакоў).*

Мірную стваральную працу савецкага народа парушыў вераломны напад фашысцкай Германіі на нашу Радзіму.

Пачаліся грозныя гады Вялікай Айчыннай вайны.

Мірныя калгасныя палеткі. На палях працуюць трактары. На лугах косяць сена трактарныя касілкі. Пірамідамі ўзвышаюцца па лугах стагі сена. Недзе па гарызонце дымяць заводскія трубы.

І раптам — выбухі бомб.

Пачалася вайна.

Пісьменнік-патрыёт у сваіх творах славіць гераізм партызан і савецкіх воінаў, самаадданых абаронцаў Радзімы, заклікае да бязлітаснай барацьбы з подлымі акупантамі. Гэтай тэме прысвечаны яго п'есы «Проба агнём», «З народам», «Людзі і д'яблы».

Скарыстоўваючы кадры ваеннай кінахронікі, трэба паказаць эпізоды варварскага разбурэння гарадоў і вёсак фашысцкімі разбойнікамі і героіку савецкіх воінаў на франтах Айчыннай вайны.

Варта даць урывак са спектакля па п'есе «Людзі і д'яблы», хоць яна і напісана пазней.

Урывак.

Сваімі байкамі, фельетонамі і подпісамі пад карыкатурамі ў часопісах «Раздавім фашысцкую гадзіну» і «Партызанская дубінка» Крапіва гнеўным сатырычным словам біччуе не толькі фашысцкіх разбойнікаў і чорных здраднікаў, але і тых шкурнікаў і блатмайстраў, якія хаваліся ў тылах, у той час, як лепшыя патрыёты, не шкадуючы жыцця, змагаліся з ворагам за свабоду і незалежнасць Савецкай Радзімы.

Часопіс «Раздавім фашысцкую гадзіну» і «Партызанская дубінка», байкі, фельетоны, вершы, карыкатуры.

Урывак з п'есы «Мілы чалавек».

П р а м е н н ы. Ты сапраўды пішаш гэту камедыю ці толькі дурышся?

Я з в а. Я ўжо да фінішу падыходжу, а ён — дурыцца!

П р а м е н н ы. Па-моіму, нічога ў цябе не выйдзе.

Я з в а. А па-моіму, выходзіць.

П р а м е н н ы. Выйсці-то, можа, і выйдзе, але што гэта будзе за камедыя? Што ты ў ёй паказваеш? Важдаешся ўвесь час з гэтым блатняком і яго кліентамі.

Я з в а. Мая задача — паказаць тыя балячкі, якія часамі з'яўляюцца на нашым здаровым целе.

П р а м е н н ы. Занадта ўжо згушчаны фарбы.

Я з в а. Гэта ў адносінах Жлукты фарбы згушчаны? Ну, ведаеш... У гэтай бочцы пакасці так густа перамешаны прагнасць, подласць, цынізм, пахабства, што больш згусціць ніяк нельга. Не, я з асалодай утыкаю вастрыё свайго пяра ў гэту агідную тушу.

П р а м е н н ы. Ну, няхай Жлукта, а гэтыя ўсе, што карыстаюцца яго паслугамі?

Я з в а. А гэтыя ўсе няхай не крыўдзяцца, калі я зачапляю каго-небудзь з тых, хто стаіць блізка ля яго.

П р а м е н н ы. Але ж іх у цябе шмат... Што скажа на гэта глядач?

Я з в а. Глядач? А вось запытайся ў гледачоў, хіба няма сярод іх такіх, якія не раз карысталіся паслугамі якога-небудзь Жлукты? Ім і не ў галаве, што яны самі сваімі неабдуманымі ўчынкамі памагаюць Жлуктам расці і пладзіцца. Дык няхай жа паглядзяць збоку на сябе ды пасмяюцца, а пасмяяўшыся, падумаюць. Апрача таго, ты яшчэ не ведаеш, чым гэта ўсё скончыцца, і не можаш меркаваць, удалася мая камедыя ці не.

П р а м е н н ы. Як ты ні кажы, а ў ёй няма амаль ніводнага дадатнага вобраза.

Я з в а. Як! А мы з табой?

П р а м е н н ы. Таксама героі!

Я з в а. А чым ты не герой? Добры газетны работнік, былы драматург і будучы паэт. Вобраз, праўда, бледнаваты. Адзіная яркая рыса — гэта тое, што ты чужымі вершамі спакушаеш чужых жонак.

П р а м е н н ы. Тсс.. пачуе.

Я з в а. Маўчу, маўчу... А я ўжо тым герой, што ўзяўся за напісанне гэтай камедыі.

А л я к с а н д р а М і х а й л а ў н а. Клавачка, вы мне прабачце, хачу пагаварыць з Дзям'янам Дзям'янавічам адзін на адзін. *(Цераз сілу ўсміхнуўшыся.)* Думаю, што вы раўнаваць не будзеце?

К л а в а *(абражаная)*. Калі ласка! *(Выходзіць. Аляк-*

*сандра Міхайлаўна садзіцца на канапу і закрывае твар рукамі.)*

Ж л у к т а. Што з вамі? Можа, вады даць?

А л я к с а н д р а  М і х а й л а ў н а. Мне сорамна вам гаварыць.

Ж л у к т а. Што за глупствы? Што мы — першы дзень знаёмы з вамі?

А л я к с а н д р а  М і х а й л а ў н а. Я зацяжарыла.

Ж л у к т а. Госпадзі божа мой! Дык чаго ж вы хвалюецеся? Для замужняй жанчыны гэта зусім нармальная рэч.

А л я к с а н д р а  М і х а й л а ў н а *(у адчаі)*. Я не магу раджаць! Разумееце? Не магу!

Ж л у к т а. Ну, калі ласка! Арганізуем вам даведку, што вы не можаце раджаць па стану здароўя, і кладзіцеся ў больніцу. Я толькі не ведаю, чаму вы да мяне звяртаецеся. Іван Данілавіч і сам мог бы гэта зрабіць.

А л я к с а н д р а  М і х а й л а ў н а. Гэта здарылася без яго.

Ж л у к т а. А-а... Тады ваша становішча сапраўды далікатнае.

А л я к с а н д р а  М і х а й л а ў н а. Ратуйце мяне.

Ж л у к т а. Чакайце, чакайце... *(Думае.)* Што ж тут нам прыдумаць? Ён з горада нікуды не едзе?

А л я к с а н д р а  М і х а й л а ў н а. Не.

Ж л у к т а. Сваякоў у другім горадзе ў вас няма?

А л я к с а н д р а  М і х а й л а ў н а. Няма.

Ж л у к т а. Трэба іх выдумаць і паехаць да іх у госці...

А л я к с а н д р а  М і х а й л а ў н а. І што я ў чужым горадзе? Да каго я там звярнуся? Хто паможа?

Ж л у к т а. З вамі паедзе мой памочнік.

А л я к с а н д р а  М і х а й л а ў н а. О, не! Ён разбалбоча.

Ж л у к т а. Будзьце спакойны, я ведаю, каго пасылаю. Толькі гэта будзе каштаваць...

А л я к с а н д р а  М і х а й л а ў н а. У мяне ёсць залаты гадзіннік, летняе паліто, туфлі. Я скажу мужу, што ў вагоне ўкралі. Што хочаце, толькі выратуйце!

Ж л у к т а. Заўтра я вам скажу, у якім горадзе ў вас ёсць сваякі і калі паехаць у госці.

А л я к с а н д р а  М і х а й л а ў н а *(устае)*. Дзякую! Век не забуду вашай паслугі.

Ж л у к т а *(цалуе, потым падносіць руку з гадзіннікам да вуха)*. Цікае. Добры гадзіннік. *(Затрымліваючы руку.)* Гэта вас бог пакараў за вашу ўпартасць.

А л я к с а н д р а  М і х а й л а ў н а. Грэх вам здзекавацца з мяне.

Ж л у к т а. А вы ж з мяне здзекаваліся?

А л я к с а н д р а  М і х а й л а ў н а. Давайце лепш не ўспамінаць.

Ж л у к т а. А можа, я сам паеду з вамі ў госці да вашых сваякоў? Удваіх мы як-небудзь усцеражом ад зладзеяў ваш гадзіннік і паліто.

А л я к с а н д р а  М і х а й л а ў н а. Я ў вашых руках, але не патрабуйце ад мяне гэтага.

Кадры кінахронікі, якія паказваюць перамогі на франтах вайны. Калоны палонных гітлераўцаў, крыжы на могілках. «Эпітафія» К. Крапівы.

## ЭПІТАФІЯ

Тут ляжыць высокі чын —
Кубэ, Гітлераў служака.
Пры жыцці быў сукін сын
І загінуў як сабака.

Пасля вызвалення Мінска ад фашысцкіх акупантаў калектыў тэатра імя Янкі Купалы цёпла сустрэў свайго любімага аўтара і яго новую п'есу.

Кадры кінахронікі: вызвалены Мінск.

Кадры кінахронікі. Крапіва чытае п'есу калектыву тэатра імя Янкі Купалы. Паяўляюцца афішы: «Мілы чалавек», «З народам».

Пасля вайны пачынае выходзіць часопіс сатыры і гумару «Вожык», першым рэдактарам якога быў К. Крапіва. Першыя нумары часопіса «Вожык». К. Крапіва ў акружэнні былых супрацоўнікаў «Вожыка»: М. Танк, П. Панчанка, Я. Брыль, А. Волкаў.

Мультыплікацыя на тэму байкі «Дзіця, Вожык і Змяя».

## ДЗІЦЯ, ВОЖЫК І ЗМЯЯ

Выхадным днём у сасначку
Жанчына з дзіцём гуляла,
Лягла пад сонца, задрамала,
А небяспека напаткала
Яе маленькую дачку.
З узгорка ўніз вядзе сцяжынка,—

Ідзе па ёй мая Дзяўчынка
Ды ловіць матылькі.
А гэтым часам пры сасонцы
Гадзюка грэецца на сонцы,—
Блішчыць на ёй узор лускі.
Дзяўчынка рада: «Цаца! Цаца!»
І хоча ўжо рукой хапіць.
І «цаца» пачала звівацца,
Ліслівa ціхенька сіпіць:
— Хачу, дзіця, з табой пасябравацца:
Цябе я ласкава, пяшчотна абаўю,
Пазнаеш ты любоў маю.
Аж раптам тут ля самых ножак
Зафыркаў злосна Вожык
І кінуўся адважна па Змяю.
Змяя ўзвілася бліскавіцай,
Зубамі хоча ўпіцца,
Мільгае промнямі лускі,
А ён, узброены іглiцай,
Зубоў зміяіных не баіцца
І рве Гадзюку на кускі.
Дзяўчынка сціснула ад гневу кулачкі.
Крычыць на Вожыка: — Пачвара, недарэка!
Ты цацу сапсаваў маю!
За гэта я цябе наб'ю!
Ты — бека!
— Дзіця,— адказвае ёй Вожык,—
Хоць бека я, калючы, непрыгожы,
Але ж я знішчыў смерць тваю.
Як падрасцеш, ацэніш ты паслугу
І мне падзякуеш, як другу.

---

Дзіця дзіцём — і розум у яго такі.
Я не дзяцей тут меў на мэце,
А ёсць яшчэ дарослыя дзядзькі
На свеце,
Што і змяю гатовы прытуліць,
Якая іх умее пахваліць.
Такім мілей лісліvы гад паўзучы,
Чым верны друг, хоць і калючы.

Думы народа, яго жыццё былі невычарпальнай крыніцай творчасці Крапівы. Тэматыка яго твораў была заўсёды

свежай, новай, блізкай народу, злабадзённай. Яго часта можна бачыць сярод калгаснікаў і сярод рабочых. Бо ён не толькі пісьменнік, але і народны абраннік — дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. Можа, хто-небудзь з іх будзе героем яго новага твора. Яна? А можа, і ён?

Кандрат Кандратавіч гутарыць з калгаснікамі ў вёсцы.

Вось ён праходзіць па полі і гутарыць з брыгадзірам.

Сядзіць каля вясковай хаты на прызбе.

Гутарыць з дзяўчынай.

А можа, сустрэнецца з якім-небудзь п'янчугай ці бюракратам для сатыры.

Назіранні за жыццём, актыўны ўдзел у вырашэнні праблем сённяшняга дня даюць шмат матэрыялу для твораў аб нашым сучасніку.

Кандрат Кандратавіч сядзіць у сваім кабінеце дапазна. Працуе над новым творам.

Гэта новая п'еса Кандрата Крапівы «Пяюць жаваранкі».

На сцэне ідзе ўрывак з п'есы «Пяюць жаваранкі».

Урывак са спектакля «Пяюць жаваранкі».

Спектакль і фільм па гэтай п'есе палюбілі гледачы. Яго бачылі ва ўсіх кутках нашай неабсяжнай краіны.

Аўтар і многія ўдзельнікі спектакля былі адзначаны Дзяржаўнай прэміяй СССР у галіне літаратуры і мастацтва за 1951 год.

Пасля ўрыўка з фільма пакажам аўтара п'есы з групай артыстаў Купалаўскага тэатра, удастоеных Дзяржаўнай прэміі СССР: Дзядзюшку, Саннікава, Платонава, Ржэцкую, Пола.

Кандрат Кандратавіч вядзе вялікую навуковую працу ў Акадэміі навук БССР. З'яўляецца яе віцэ-прэзідэнтам. Зараз ён і паэт П. Глебка закончылі рэдагаванне беларуска-рускага слоўніка.

К. Крапіва ідзе ў Акадэмію навук БССР. Заходзіць у кабінет. Там ён сустракаецца і працуе з Глебкам над беларуска-рускім слоўнікам.

Крапіва з'яўляецца выдатным тэарэтыкам драматургіі і асабліва ў жанры сатырычнай камедыі. І таму драматургам малодшага пакалення вельмі цікава з ім сустрэцца і пагаварыць.

К. Крапіва гутарыць з групай беларускіх драматургаў. (Крапіва праводзіць гутарку, якую трэба зняць сінхронна.)

У 1956 годзе яго горача віталі пісьменнікі, чытачы, гледачы і артысты з ганаровым званнем народнага пісь-

менніка Беларусі, прысвоенага ўрадам за вялікія творчыя заслугі.

К. Крапіва ў прэзідыуме і на трыбуне ўрачыстага сходу, калі адзначалі 60-годдзе пісьменніка.

К. Крапіва стварыў галерэю запамінальных вобразаў і тыпаў, праз якія ён паказаў і гераіку нашых дзён і высмеяў тыя недарэчныя з'явы, якія перашкаджаюць паспяховаму будаўніцтву камунізму ў нашай краіне.

Галерэя вобразаў:

1) Туляга, Гарлахвацкі, Зёлкін, цёця Каця, дзед Бадыль, Пытляваны, Туміловіч, Насця Вярбіцкая, Жлукта, Гудовіч.

Жыве сярод нас выдатны чалавек, хмуры з выгляду, але вясёлы душой. Стоп! Сатырык нешта заўважыў! Сцеражыся бюракрат ці тунеядзец!

К. Крапіва праходзіць па вуліцы горада. Спыніўся, паглядзеў убок. Нешта заўважыла пільнае вока сатырыка.

К. Крапіва ў сваім рабочым кабінеце над рукапісам.

Мы далучаемся да слоў паэта П. Глебкі: «Кандрат Крапіва такое яшчэ прыдумае, што ніякая старасць да яго не падступіцца. І неаднойчы яшчэ мы і пасмяёмся і парадуемся з Кандратам Кандратавічам, як не адзін раз смяяліся і радаваліся дагэтуль». Жадаем яму поспехаў.

*Чэрвень, 1961*

# РОГАТЫЙ БАСТИОН

### КИНОСЦЕНАРИЙ ПО ПЬЕСЕ «ЛЕВОНИХА НА ОРБИТЕ»

Холмы, луга. Над ними облака. Скоро вечер. В живописном месте раскинулось большое село.

Диктор. Вот перед вами один из лучших наших колхозов «Восход».

Панорама колхоза, общественных построек. Постукивает движок электростанции на торфе.

Диктор. Любо-дорого смотреть, как самозабвенно трудятся здесь люди...

Кадры трудящихся колхозников.

Диктор. Особенно женщины...

Трудятся женщины.

Диктор. Но... лишь пока не раздается трубный глас...

Слышен рожок пастуха.

Затем мычание коров.

К селу приближается стадо.

Ожили улицы села. Бабы, где бы они ни работали:

на ферме... ...на птичнике... ...в больнице... ...в мастерской... услышав призывное мычание, прекращают работу, снимают халаты, передники, выбегают на улицу, встречают скотину.

На улице — одни бабы. Полно баб. Они переругиваются, пересмеиваются, загоняют скотину к себе во двор, скрываются в хлевах.

Вот бежит и Лушка, встречает огромную корову.

Вечер. Улица села. Гаснут огоньки в домах колхозников. Люди ложатся спать. Где-то гармонь ведет задушевную лирическую мелодию.

По скупо освещенной улице идет пара: девушка и па-

рень. Это Соня и Михаил. Они ищут укромное местечко, где бы можно было уединиться. Свернули к скамеечке под деревом, но... там уже целуются другие.

Михаил и Соня отходят, чтобы не спугнуть ту пару. Проходят мимо высоких заборов, плетней, палисадников. Останавливаются. Соня поднимает голову и ясными, доверчивыми глазами смотрит в глаза своему милому.

— Зоренька,— тихо говорит Михаил.

Вдруг слышится из-за забора другой мужской голос. Он нежно воркует:

— Зоренька моя... красавица... единственная...

Соня и Михаил переглядываются.

Голос продолжает ворковать:

— Не бойся, мы с тобой не расстанемся... Не могу я без тебя, зазнобушка ты моя...

— Никак это отец твой,— прислушавшись, говорит Михаил.

— С кем это он?

Соня зажимает ему пальчиком рот и хихикает, они заглядывают через забор.

Во дворе, из коровника струится электрический свет. А там виднеется Левон, который подкидывает корове сено и нежно гладит ее.

— Ух ты, ласковая... ненаглядная...— нежно воркует Левон. На крыльце стоит, прислушиваясь, с полным ведром в руках его жена Лушка.

— А мне таких слов ты не говорил,— с грустью говорит она и, сплюнув в сердцах, уходит в дом.

— От баба! К корове ревнует! — гордо ухмыляется Левон, подкидывая корове сено.— Маловато у тебя осталось сена, маловато. Но не тревожься. Я тебя не оставлю голодной...

Левон снимает с перекладины полосатую дерюжку, гасит в сарае свет и выходит во двор. Из-за забора слышится смешок, полушепот парня и звонкий поцелуй.

— Кышт! — закричал Левон, взмахивая руками.— От безобразники! Распустили молодежь! Была б это моя дочка...— И негодуя, подкрадывается к забору, выходит на улицу. Но там никого нет. Молодые уже убежали.

Соня и Михаил идут обнявшись по ночной улице. Серпок месяца над ними, как улыбка. А звезды мерцают, лукаво подмигивая молодежи. Они выходят на окраину села. Неподалеку где-то колхозная ферма. Оттуда слышится мычание коров.

Сказочными пирамидами возвышаются стога сена. Соня и Михаил остановились. Целуются. Из-за стога появляется Максим. На нем старый плащ, через плечо дробовик. Он покашливает, чтобы вспугнуть парочку.

Девушка испуганно ойкнула и хотела удрать. Но парень задерживает ее.

— Не пугайся, милая. Это я, батя.

— Это ты, Михаил? Ой, молодец, спуску не дает! Да...— хихикает Максим.— Так ее. Жми!

— Не уходи. Это мой старик. Пусть привыкает. Все равно ведь завтра в загс. За ночь не передумаешь?

— Не...— тихо ответила Соня.— Надоело так...

— В загс? — строго спрашивает Максим.— Кому это ты обещаешь?

— Завтра узнаешь,— отвечает Михаил.

— А ну покажь, кто она такая есть,— Максим приближается к молодым. Но девушка вырывается из рук парня и убегает.

— Самая хорошая,— хвалится Михаил.

— «Хорошая». Самые хорошие, они самые капризные. Подбирай хомут по мерке...

— Я не конь...— слегка обижается Михаил, поглядывая вслед Соне.

— Да уже и не жеребчик. Хоть бы с отцом посоветовался. У меня знаешь какой по этой части опыт? Или я тебе так — пришей кобыле хвост? И с ее родителями надо поговорить.

— Завтра свататься пойдем,— сообщает Михаил отцу и убегает за Соней.

— От мартовский кот,— добродушно съязвил Максим и отправляется в обход стогов. Но вот он заметил в темноте силуэт человека.

— Еще кто-то... Видно, сюда загс перенесли. Один или опять вдвоем? Ну, известное дело, весна: комары и те парами...— Максим притаился под стогом, наблюдает за новым пришельцем.

Человек расстилает дерюжку, еще раз осматривается вокруг и начинает таскать из стога сено. Надергал охапку, уложил в дерюжку и заходит на другую сторону, чтобы нащипать еще.

— Эге-ге, это других сортов, вон ты какой гусь,— сообразил Максим. И вдруг сам с такой же поспешностью, как и воришка, тоже таскает из стога сено. И пока воришка на другой стороне стога, Максим хватает свой охапок се-

на, подбегает к дерюжке, укладывается на нее и прикрывается сеном.

Вор — это Левон — выходит из-за стога, кладет сверху еще клок сена, завязывает в узел углы дерюжки и, посмотрев, не идет ли сторож, хочет подхватить ношу на плечо. Но не тут-то было! Левон еще раз пытается поднять сено, но... валится сам на Максима, схоронившегося в дерюжке. Максим крякнул и выругался.

— Ах ты, торбохват! Ты еще и душишь? — Максим высовывает руку из-под сена и хватает вора за штанину. Левон никак не ожидал такого. Он взвыл от испуга. Вскакивает, вырывается из цепких рук Максима и во весь дух мчится прочь. Максим высвобождается из-под сена и гонится за вором. Перепрыгивая через плетень, через забор, через канаву, спотыкаясь и падая, один убегает, а второй старается настичь. Но старику трудно угнаться за проворным Левоном.

— Стой! Держи его! Держи! Стой, махновец! — орет Максим, поддавая страху Левону. Но вор исчез в темноте. Максим, потеряв из виду Левона, метнулся в одну, в другую сторону и вдруг схватывает вынырнувшего из темноты... председателя колхоза Буйкевича.

— А-а, попался, анархия!..

— Да ты что, сдурел, Максим! Или пьяный?

— Тьфу ты, черт, председатель! — огорчается Максим, узнав председателя.

— Чего шум-то поднял?

Максим. Да тут, видите ли, агрессор было появился на горизонте, так я отпор давал.

Буйкевич. Какой агрессор?

Максим. Сено крал.

Буйкевич. А кто?

Максим. Не узнал в темноте. Удрал.

Буйкевич. Не догнал?

Максим. Куда там! Чмыхнул так, будто ему реактивный двигатель вставили.

Буйкевич. Жаль.

Максим и председатель возвращаются к стогам.

Максим. Собачья у меня должность, товарищ председатель.

Буйкевич. Но и без нее пока нельзя.

Максим. Оно конечно. На все село заведется одна такая шельма, а сторожей нужно штук пять-шесть. И ког-

да они переведутся, лихо на их голову! И чего им не спится?

Буйкевич. Понятно... Коровы это...

Максим. Коровы? Нет... то человек был...

Буйкевич. Я и говорю. Ради своей коровы на все идут. Одно слово — частная собственность! Вот корень зла...

Максим. Поди ж ты! Вроде магнетизма какая? Ночами думаю: какой урон государству эти мазурики! Возьмем город: сколько там магазинов! Тысячи. И возле каждого сторожа торчат. Даже когда воры спят — государству все одно урон. Сторожа-то зарплату все равно получают! Прикидывал я: десятки миллионов нашему брату платят. А за что? Зачем? Выгоднее взять всех жуликов на полное иждивение, платить им вроде пенсии... Дешевле будет. Ведь их меньше, чем сторожей? А?

Буйкевич. Да ведь если бы знать... кто. Вот уже вроде бы все честные.

Поднимает оставленную Левоном дерюжку.

— Это чего?

Максим выхватил ее из рук председателя.

— Отдай, председатель. Это мой боевой трофей! Я по нему вора найду. Ишь ты, распустил руки свои загребущие...

Чья-то рука, свесившись с печи, двигается, как бы загребая сено. Это Левон. Он во сне кряхтит, ворочается, нервно вздрагивает. Не будит его и проникший в хату луч солнца.

В хату входит Лушка, окинула взглядом комнату, присела. Сняла халат доярки, с печи послышался тяжелый вздох Левона.

— Чего ты? — крикнула Лушка.— Все спишь еще? Как с перепоя?

Левон не отвечает.

— Может, заболел? Всю ночь охал.

— Что-то живот схватило,— стонет притворно Левон.

— Съел что-нибудь несвежее или поднял чужое тяжелое,— беспокоится Лушка.

— Да ничего я не поднимал! Ничего! Слышишь, ничего,— сердится Левон.

— Тогда с чего ж ты? Ох не вовремя ты захворал, Левон, не вовремя.

— Да не хворал я... я, не бойся,— растроган и Левон.

— Тогда быстро спускайся с печи! Я что тебе скажу! Такая новость! Услышишь — упадешь...

Левон, полуспустившись с печи, замер, насторожился. У него от нервного тика подергивается щека. Можно подумать, что он подмаргивает жене.

— Какая такая новость?

Лушка. Левонушка, одевайся да патлы расчеши. Сейчас гости придут.

Левон. Какие гости?

Лушка. Сваты.

Левон. Какие сваты такие?

Лушка. К Соньке нашей, дочке.

Левон смотрит на Лушку, как баран на новые ворота, спустившись с печи.

Лушка. Да, Левонушка. Вот и дождались...

Левон. А кто?

Лушка. Мишка-зоотехник.

Левон. Сторожа Максима?

Левона перекосило от такой новости, он снова заморгал.

Лушка. Ну чего ты? Парень он очень хороший.

Левон бочком, бочком отходит от Лушки. Его как бы повело. Он испуганно осматривается по хате, будто ищет щель, куда бы спрятаться. Останавливается в размышлении.

— Ах, чтоб тебе пусто было... А может, оно и к лучшему? Все-таки сват будет.

— Ну, конечно же, к лучшему, Левонушка! — обрадовалась Лушка, поняв, что Левон не против жениха.

Она заглядывает под скамейку, в нишу за веником в углу.

— Левонка! Ты не видел нашу полосатую дерюжку? Люди придут, не обо что ноги вытереть.

У Левона опять появился нервный тик. Он говорит как-то нехотя, запинаясь.

— Чего?

— Чего-чего? Подмаргиваешь чего?

— Разве?

Левон пытается придержать щеку рукой.

— Ты вот что... Ты это... Ты не ищи дерюжку... Я потерял.

Лушка. Как это — потерял? Где же ты потерял?

Левон *(сердито)*. Где, где... Потерял — и все! И коли что, так ты, это самое, не признавайся.

Лушка. Как это — не признавайся?

Левон. А так, не признавайся, и все. Не твоя дерюжка, и баста. Не знаю — и все тут. Ежели найдет кто.

Лушка. Как же не моя, коли она моя! Ой, Левон, что-то неспроста это. Уж не натворил ли ты чего?

Левон. Глупости болтаешь! Что я мог натворить?

Лушка. Ты что-то финтишь. Может, на той дерюжке с чужой бабой забавлялся, а тебя поймали?

После такого подозрения жены Левон совсем смутился.

— Чего чепуху-то городишь? — и, чтобы рассеять подозрения жены, Левон заговорил повышенным тоном, сердито, с раздражением, отстаивая перед женой супружескую непогрешимость.

— Мелочная ты, Лушка! Тут свадьба, — а ты дерюжка! Забудь...

— Это я-то мелочная! — вспылила Лушка. — Это ты, бывало, чтобы бутылку с надбитым горлышком за целую сдать, два часа ее сургучом замазываешь... А тут дерюжка почти новая в полоску! И «не признавайся»!

— Ну, ладно, перевоспитался, значит. Понимаешь, прошу, не признавайся. Значит, надо мне так. Давай костюм!

— Какой тебе? — Лушка открывает шифоньер. — Коричневый или в полоску?

— К черту полоску! — кричит Левон.— Все тебе в полоску! Полосатое! Полосатое!

Испуганная Лушка подает ему другой костюм.

— Вот она! Почти новая в полоску! — как опытный продавец, расхваливает свой товар Максим собравшимся около колодца бабам. — Ничейная, ночью найденная! Кто признается — бери! Мне чужой не надо.

Все бабы тянут к нему руки.

— Э, нет, так не пойдет,— разочарован Максим.— Уговор: у чужой вещи не признавайся, коли хочешь от лиха уберечься.

— Какого лиха? — спрашивает одна из баб.

— А как же. Присваивать чужое — грех.

— Сам же сказал — ничейная! — оправдывается баба.

— А может, она и чейная! — хитро ухмыляется Максим.

Женщины по очереди рассматривают злополучную дерюжку и отходят, потеряв к ней интерес.

— Может, подскажете — чья эта дерюжка, может, видели у кого? — допытывается Максим.— Вернуть надо, человек спасибо скажет...

Но женщины пожимают плечами, не признаются.

Подходит Клава, цветущая женщина, с ведрами в руках. Молча берет из рук Максима дерюжку, рассматривает.

— Ну да, это его,— размышляет вслух Клава.— Я знаю чья,— Клава сворачивает дерюжку и берет себе под мышку.

— Нет, Клавонька, я сам отнесу, ты только скажи чья? Максим вцепился в дерюжку, боясь выпустить ее из рук. Клаву это даже обидело.

— Думаешь, себе заберу? Не веришь? Ну и бери,— обиженная Клава со злом сует дерюжку Максиму и набирает воду из колодца.

— Нет, Клавонька,— я так не думаю. Но ты мне скажи — чья? Чья она? — торопится узнать секрет Максим.

Клава с ущемленным достоинством отворачивается от Максима, подхватывает ведра и идет от колодца. Но Максим уже не мог отстать от Клавы. Он семенит за ней.

— Клавонька, красавица, ты погоди, ты не обижайся. Я ведь знаю, что ты честная,— Максим забегает Клаве наперед.— На, возьми дерюжку, а я твои ведерки понесу.

Клава улыбнулась и, охотно уступив ведра, пошла вперед, неся дерюжку, выступая, как пава.

Домой прибегает Соня. Увидев мать в рабочей одежде, она недовольно упрекает ее.

— Ну, мама! Ну, что же вы! Ведь придут сейчас...

— Я мигом. Я вот-вот...— заторопилась Лушка.

— А мне какое платье надеть? — советуется дочь.

— Рыбка моя! Надень какое он не видел.

— Да, мама,— он все видел...

— Ну? Когда же успел? Ох, хитрая ты дочка, хитрая. Надень тогда его любимое...

Постучали в дверь, и их как ветром сдуло.

— Левон! Левон! — зовет Лушка, убегая в другую комнату. Из другой комнаты выходит Левон. В хату входит Клава. Ее встречает принарядившийся в новый костюм Левон.

— Доброго здоровья,— Левон подает руку соседке.

— Ух ты, какой ты! — кокетливо восхищается Левоном Клава.

За ней появляется Максим, держа за спиной дерюжку.

— Здоров, Левон! — бодро приветствует Максим.

Левон, подмаргивая, протягивает руку Максиму, а тот, не подавая руки, мгновенно выхватывает из-за спины дерюжку и показывает ее Левону.

— Твоя? — и пристально смотрит в лицо Левону.

— Нет, не моя,— говорит заготовленный ответ Левон.

Тут же появляется Лушка.

— Добрый день, хозяюшка! — приветствует Лушку Максим.

— День добрый, Максим, день добрый,— ответила Лушка и, заметив в руках Максима полосатую дерюжку, она будто укололась или обожглась, хотела было улизнуть на кухню или еще куда-то, но ее остановила Клава.

— Лушка! Максим какую-то дерюжку нашел. Не твоя ли?

Лушка неохотно рассматривает дерюжку. Вернее, не рассматривает, а раздумывает, признаться или нет, смотрит на Левона. У Левона опять появляется нервный тик.

Наконец Лушка решается:

— Нет... Не моя...

— А ты разгляди хорошенько, может, и твоя. Что-то похожа,— советует соседка.

— Да что ее разглядывать? Картина это, что ли? — торопливо вмешивается Левон.— Сказано — не наша. А чужое нам не нужно.

Максим укоризненно смотрит на Клаву. Она с недоумением пожимает плечами.

— Тогда извиняйте,— Максим раскланивается с Лушкой и Левоном и выходит из хаты.

Он останавливается на крылечке, размышляя, куда податься дальше, где продолжать поиски.

К крыльцу подходят Буйкевич и Михаил, в праздничной одежде...

— Смотри-ка! А отец твой уже здесь! Сам решил? Не доверяешь мне как свату?

— Да нет. Я по делу заходил. Вот,— Максим показывает на дерюжку.

— Нашел? — посерьезнел Буйкевич.

— Куда там! Никто не признается!

— Ну и шут с ней. Успеем еще. Сейчас есть дело поважнее,— говорит Буйкевич и замечает, что Михаил уже подошел к углу дома и разговаривает с кем-то через окно.

— Куда ты?

— Ну и сын! — восхищается Максим.— Знает, куда надо... прямо в самый корень...

— Михаил! — зовет Буйкевич.— Иди сюда. Подожди

до свадьбы — потом наговоришься. Забыл обычай? И чему это в институтах молодежь учат!

Михаил присоединяется к ним.

Из окна ему машет платочком Соня.

Все трое заходят в дом Левона и с порога низко кланяются.

— Пожаловали мы к вам, дорогие господыня и господарь, по делу первої важности,— торжественно и несколько напыщенно провозглашает Буйкевич.

— Так вы присаживайтесь, пожалуйста,— приглашает Лушка.

Максим хотел присесть, но Буйкевич задерживает его.

— Коли поладим, тогда и сядем,— важно отвечает Буйкевич.

Максим бросает подстилку на стул возле телевизора и становится рядом с сыном. И у старика появляется важность, напыщенность, строгость.

— Пришли мы челом бить вашей светлости. Наш князь-удалец, Михаил Максимович...

— Зоотехник он, вот кто! А не князь,— перебивает Максим.

— Погоди, Максим! Не сбивай с толку... Наш князь-удалец Михаил Максимович на охоту ходил, за куницею следил. А встретил он куницу, красну девицу — сердце екнуло, воспылало молодое, загорелось, завладеть ему куницей захотелось. Князь поставил вопрос, понял суть задачи: нашел, так сказать, главное звено — куницу изловить и в свой теремок-домок на престол посадить...

Во время слов Буйкевича к плетню подходят девушки, зовут за собой парней. На цыпочках подходят к окнам и слушают слова свата-председателя.

— И... по-старому,— недовольно протянула конопатая девушка.— Ну и председатель. Я по-старому не хочу...

— А тебя и по-новому не хотят,— оборвал ее гордый парень.

— Новое еще не придумали,— вздохнула другая девушка.

— А так красивее,— мечтательно проговорила другая.

— Красота в прочности,— заявила другая.

— И верно,— поддержала ее еще одна.— Хоть бы как, да лишь бы прочно...

Буйкевич меж тем продолжал:

— Но куница-проказница зачаровала молодца и сбежала... Он туда-сюда! Ан нет: не найти ему чаровницы.

В это время тихо приоткрывается дверь из соседней комнаты и оттуда выглядывает осторожно Соня.

Михаил замечает ее и вытягивается из-за спины Буйкевича, делая Соне знаки. Но их перехватывает Клава и становится между ними, закрывая телом дверь.

Тогда Михаил устремляет глаза в потолок.

Растроганно слушает слова свата Лушка.

Во время всей этой игры Буйкевич продолжал обряд:

— И пошли мы по свету блуждать, да по людям пытать, куницу искать. А товарищи с фермы нам подсказали, что куницу вы в своем доме сховали. И явились мы к вам бить челом. Не согласны ли вы подобру нам отдать или князю за выкуп ее передать? Или нам доведется ее силой забрать?

— Разве наш теремок для нее не домок? — подхватывает игру Лушка.

— Для вашей куницы есть другая светлица,— упорствует сват.

— И у нас не темница,— ведет игру Лушка.

— Ну завели на полдня...— недовольствует Максим.

— Ой, глядите, добрые люди, заскучает у вас тут куница, зачахнет, завянет. Приведите сюда, да на князя своего пусть разок только глянет.

— Соня! Сонюшка! Иди сюда! — зовет Лушка дочку.

Клава поплыла к двери за Соней.

— Так вы, значит, согласны? Или как? — не терпится Максиму.

— У нас куница не простая, ученая, сама по-человечьи молвить наученая.

Парни и девушки подсматривают через окно, наблюдают за церемонией сватовства.

— Ой, Соню, Соню зовут! — аж визжит от восторга одна из девушек.

И молодежь гроздями прилипает к окну.

— Ух ты-ы! Вот прозевали мы, хлопцы!.. Какую кралю из-под носа утащили! — высказал зависть один из парней.

— Потому что ты не видишь, что у тебя под носом,— упрекает вторая девушка. А буквально у него под носом действительно замечательная красунья-девушка.

— Іван я! — хлопец забег наперад газіку. Якая рашучасць! Які гераізм! Ён нібы грудзьмі сваімі закрывае амбразуру дота.

— Ты казкі дзіцячыя чытаў?

— Калі?

— Калі-небудзь.

— Ну, чытаў...

— Помніш, які там Іван? Хоць і дурак, а вакол пальца абводзіў і папа, і купца, і пана, і нават самога цара.

Хлапчына сумеўся, але ненадоўга.

— Дык то ж пана, цара ды купца. А ты ж наш, савецкі. Не магу я цябе вакол пальца... Героя сацпрацы.

— І не ўдасца,— усміхнуўся задаволены адказам старшыня.

— Адпусці, старшыня, дабром прашу, адпусці.

— Грозіш?

— Не гражу, а пакуль што прашу.

— Пакуль што? Саступі з дарогі машыне. Яна жартаваць не любіць.

— Я і саступаю, а вы не пускаеце.

— Не магу. Не магу я цябе адпусціць у горад.

— Ну, чаму? Другіх дык адпусцілі, а мяне...

— Другіх адпусціў, а цябе не магу.

— А я што? Дык што мне? Вечна ваду вазіць? Па рублю ў дзень зарабляць?

— А які ты спец? Ты ж нічога болей не ўмееш. Сорамна такога адпускаць.

— Каму сорамна?

— Каму? Мне. Калгасу нашаму, усёй вёсцы сорамна. Сорамна такога выпускаць на людзі.

— А што я ўжо такі?

— Ды ты ніякі. Ну хто ты? Ну што ты? Токар? Пекар? Слесар? Трактарыст? Механік? Бульдазерыст? Што ты ўмееш? Нічога. Толькі... Вынь палец!! Паламаеш! Толькі і навучыўся за дваццаць гадоў у посе калупаць.

— Я і другому навучуся,— засаромеўся хлапчына.

— Ты ж разявень. Ты ж вуліцу не сумееш перайсці. Цябе тралейбус задавіць.

— Не задавіць. Як упруся, дык пабачым яшчэ, хто каго.

— Ну во, я ж і кажу: засмяюць нас.

— Хай паспрабуюць...

— «Адкуль, спытаюць, такі?» — «З Любані».— «З якой Любані?» — «Ды з той, дзе калгас «Маяк».—

«Ды быць такога не можа. Там жа старшынёй Герой Сацыялістычнай Працы...»

— Ну, дык што? — Іван пачынае крыўдаваць.

— А тое, што выклікаюць мяне туды, у горад, паваляць і зорачку адбяруць. Скажуць: не заслужыў, калі такіх у горад выпускае. Рабочы клас павінен быць перадавы, вядучы. Разумееш? А які ты перадавы? Які ты вядучы? Ну, паедзеш ты ў горад і што ты будзеш там рабіць?

— Знайду што.

— Ну што? Што цябе туды цягне?

Іван рагатнуў.

— Там кожны вечар у цырк можна хадзіць. Не тое, што тут. У тэатр, у оперу. А то толькі па тэлевізару ды ў кіно яшчэ бачыў тых, што танцуюць у «Лебядзіным возеры». А я жывую хачу паглядзець.

— Паглядзець ці пагладзіць?

Іван зноў рагатнуў.

— А што? Мо і пагладзіць пашанціць.

— Вунь яно што! Куды гне! Я думаў, ён едзе ў горад навучыцца чаму людскаму, прафесію набыць. А ён — у цырк хадзіць, балерын гладзіць едзе.

— Ды не толькі гладзіць. У газеце аб'ява: патрабуюцца ўсякія... нават без спецыяльнасці. Інтэрнат даюць добраўпарадкаваны і вучыць абяцаюць... Будаўнікі там, муляры, тынкоўшчыкі... На радыёзавод...

— Ну-тка, Іван, калі ты і праўда Іван, давай заглянем у школу. Сядай,— запрасіў у машыну хлопца.

Невялікая вёска. Гэта самая далёкая брыгада ў калгасе. Хаты стаяць рэдка. Садкоў няма. На пагорку бялее каменная школа. Светлая, чыстая, пад сонцам проста ззяе. Дрэўцы, што абступілі школу, толькі што выпусцілі першыя лісточкі — бледна-зялёныя, далікатныя, свежыя.

На вуліцу ўязджае газік. Спыняецца насупраць хаты, у якой вокны накрыж забіты дошкамі. Хата яшчэ моцная, бярвенні як звон. Жыць бы ды жыць у гэтай хаце, а вось жа — вокны забіты. Закрэслены...

Старшыня вылез з машыны, пачакаў, пакуль падыдзе брыгадзір. Паказаў яму на хату.

— А гэты дзе?

— На аўтазаводзе. Кватэру ўжо атрымаў.

— Не вернецца. Чаму ж не прадае?

— А каму яна тут трэба? Яна не адна тут...

І ўсе трое накіраваліся да школы.

На дзвярах таблічка: «1-шы клас». Старшыня стукае ў дзверы і, не чакаючы дазволу, адчыняе іх, уваходзіць у клас. За ім брыгадзір і Іван.

— Добры дзень!

У класе настаўніца і двое вучняў: хлопчык і дзяўчынка. Настаўніца — жанчына ў гадах. Хлопчык і дзяўчынка ўстаюць, вітаюцца.

— Добры дзень!

Павіталася і настаўніца мяккім, грудным, добрым голасам:

— Сядайце, дзеці.

— Толькі царскіх дзяцей так вучылі. На двух адна настаўніца, ды шчэ якая — лепшая ў рэспубліцы.

— Гэта я — лепшая? — засмяялася настаўніца. Ці жанчына ўстаіць перад кампліментам?

— А шпінгалеты чые?

— Дзяўчо — мая. А матрос — Настасін. Ну... гэтай...— брыгадзір хацеў яшчэ нешта шапнуць на вуха старшыні, але той адмахнуўся.

— Дзеці! Ідзіце пагуляйце. Перапынак,— загадала настаўніца.

— А яшчэ званка не было,— далажыў матрос. Дзецям, вядома, хочацца паслухаць дарослых. З дня ў дзень удваіх — сумнавата. Дзеці ёсць дзеці. Яны заўсёды цікаўныя.

Настаўніца бярэ на акне званок і звоніць. Парадак ёсць парадак. Дзеці выбягаюць на вуліцу. Неахвотна.

— Ну і як жа будзем, таварыш старшыня? Налета ў першым класе будзе толькі адно...

— А колькі ўсіх?

— У другім сем, у трэцім дванаццаць, у чацвёртым адзінаццаць.

— Ну во, а ты хочаш махнуць у горад. Бачыш, зусім на звод пайшла вёска. Дзяцей няма, адны дзяды ды бабкі. Аставайся, Іван, хоць на развод. Экстэр'ер у цябе... А?

— Уладзімір Апанасавіч! — засаромелася настаўніца.

— Трэба забіраць вас туды, у цэнтральную школу.

— Я не прападу. Самі сказалі — лепшая на ўсю рэспубліку.

— А дзеці як? Хоць і мала іх, але... Інтэрнат трэба там, у цэнтральнай...

— Не будзе школы — збягуць і гэтыя... бацькі,— палохае брыгадзір.

— Вось табе і сціранне граней між горадам і вёскай. Сціраецца вёска ўся... цалкам...

— Ну якая гэта вёска,— грэбліва махнуў рукой брыгадзір.— Не шкада.

— Шкада толькі такога памяшкання. Дзесяць гадоў, як наставілі, і вось табе... Пуставаць будзе,— пашкадаваў старшыня, па-гаспадарску акінуўшы вокам памяшканне.— Ну, Мікалаеўна, будзем думаць.

Развітваюцца. Настаўніца праводзіць да дзвярэй, дзякуе.

— Дзякую, што зайшлі, Уладзімір Апанасавіч.

І ўжо на вуліцы старшыня, змерыўшы Івана з ног да галавы:

— Шкада адпускаць такога, ды ні храна не зробіш. Такі ўжо спосаб работы пачынаецца, як той дзед сказаў. Толькі спецыяльнасць там выбірай...— і ўжо са злосцю: — Не на панчошную фабрыку ніткі сукаць. А такую набывай, каб... Калі вернешся, каб карысць нейкая была ад цябе. Чуеш?

Старшыня падпісаў паперку.

— Дзякую, старшыня. А ўсё ж я — Іван, старшыня,— пахваліўся Іван.

— Не адразу ўцякай. Адсеемся, тады...

Газік пераязджае ўброд. Вада вялікая. Вясковая паводка разлілася на кіламетры. Палессе...

На беразе асталіся брыгадзір і Іван. Яны сочаць за старшынёвай машынай, каб у выпадку чаго — выцягнуць трактарам.

— Цяпер падоўга — пакуль вада спадзе — адрэзаны мы...

У кабінеце старшыні сцены абвешаны дыпломамі і граматамі, якія калгас атрымаў на шматлікіх выстаўках за многа год; тут і за кок-сагыз, за кукурузу, за травы, за мяса, за малако, за яйцо, за шэрсць і за многае іншае. У куце, на пачэсным месцы, пераходны чырвоны сцяг. Усё так, як у перадавіка. Толькі на адной сцяне самаробны плакацік: «Хто рана ўстае, таму і калгас дае».

Зараз у кабінеце заканчваецца цырымонія падпісання гандлёвага дагавора паміж старшынёй і нарыхтоўшчыкам. Калгас прадае, а нарыхтоўшчык купляе 1500 тон

бульбы. Вясною такая здзелка ўзаемавыгадная. Калгасу — не прадасі — прападзе ці стравіш жывёлай. Нарыхтоўшчыку — купі і перапрадай — у горадзе есці хочуць. А сабе камісійныя. Відаць, таму высокія бакі пры падпісанні пагаднення трохі залішне паспешлівыя, хапатлівыя, нібы ці той, ці другі раптам перадумае і адмовіцца ад дагавора.

Старшыня і нарыхтоўшчык сядзяць за сталом поруч. Перад імі па экземпляру дагавора. І той і другі хуценька падпісвае свой экземпляр і тут жа замацоўвае подпіс пячаткай. Потым зноў жа хуценька мяняюцца экземплярамі і паўтараюць тыя ж маніпуляцыі.

Ім памагае — падстаўляе штэмпельную падушку, прамакаткай падсушвае подпісы — Юрый Мікалаевіч — малады чалавек з юрыдычнай адукацыяй, хоць афіцыйная пасада ў яго — загадчык клуба. Аднак пры старшыні ён часта выконвае ролю юрысконсульта. За такую неадпаведнасць адукацыі і пасады віна ляжыць на адной дзяўчыне, з якой, спадзяюся, мы хутка пазнаёмімся.

— Падпісана, і з плеч далоў! У сейф!

Старшыня выцер хустачкай лоб, нібы і праўда работа была цяжкая.

Нарыхтоўшчык акуратна склаў дагавор і засоўвае яго ў свой вялізны партфель.

— Прадзешавілі мы з табой, Юрка. А? Не?

— Калі ласка, пакуль не позна, можна парваць.

Нарыхтоўшчык выцягнуў паперку з партфеля.

— Можна было капеек па дзесяць...

— Уладзімір Апанасавіч! Пры вашай свядомасці... Бульба куды пойдзе? У горад. Драць з рабочага класа? Не вам, не вам...

— З рабочага класа драць не будзем, а з вас можна. Толькі з вывазкай не вельмі строга. Калі на дзень, па два спознімся, дык... Пасяўная.

— Не, не! Тут я няўмольны. Няўстойка, і крышка. Рабочы клас карміць трэба своечасова. Ні на дзень, ні на два пазней нельга.

— Слухай, друг. А можа, замачылі б здзелку? А? Юрка! Ану, арганізуй.

— Каньячком? — пацікавіўся нарыхтоўшчык.

— Пліскай. А?

— Дні па два, па тры?

— Калі ласка. Во з Юркам — па насеку, на востраў. А?

— Не,— нарыхтоўшчык шчыра смяецца.— Мой метад. Я ім карыстаюся часта. Яшчэ машыністку часам пускаю ў ход. Не-е, калі ўжо мачыць рэпутацыю, то не тут, а на моры ці ў Адэсе. Дзякую за прапанову і за ўсё. Шчыра! Ад душы. Бывайце. А ў той, пятай, брыгадзе, дзе пяцьсот тон, я заўтра сам паеду, усё арганізую...

І знік. Чалавек дзелавіты. Наш бізнесмен.

Раённая гасцініца. Нарыхтоўшчык са знаёмым партфелем лёгка ўзбег па прыступках і знік за дзвярыма.

У вестыбюлі ён спыніўся каля парцье.

— Ну, як ён?

— Падняўся апоўдні. А да гэтага стагнаў. Расолу просіць.

— Дай.

— Даў. З вядро выжлукціў.

— Стагнаў?

— Стагнаў.

— Значыць, парадак.

— А морда ў яго такая, нібы ўсю ноч сядзеў у сціральнай машыне. А машыну забылі выключыць.

— Скажы там, на двух чалавек добры абед.

— У нумар?

— У нумар.

— З тым пілі?

— З тым. Машыністка рана пайшла.

— Колькі з мяне?

— Дваццаць восем.

— Па-чэснаму яшчэ.

— Каб не мой кантроль, то...

Нарыхтоўшчык адлічыў грошы парцье — і пайшоў па калідоры. Заходзіць у нумар. У нумары на ложку сядзіць чалавек гадоў за сорак, расхлістаны, нячэсаны і вельмі сумны. Яму, відаць, «маральна цяжало» пасля ўчарашняга. Ён зараз у такім стане, як той, што ў анекдоце: пасля перапою ляжыць чалавек у ложку, а міма па мякенькіх лапках асцярожна праходзіць кот. А чалавек сіпіць:

— Не тупай, сволач, не тупай!

— Усэ! Гаразд! Хопіць!

— Ну, хопіць дык хопіць. У нас госць — гаспадар.

— Нэ можу більш...

— А казаў: Энэй, парубак маторны, запарожскі казак...

— Мне бульба трэба.
— Калі ласка. Па пятнаццаць капеек кілаграм, як я і казаў. Заўтра ж пачынаем адгружаць.
— Нэ можу я... Права нэ маю. Па трынаццаць.
— Ды ты што? Са сваёй кішэні, ці што? Дагавор падпішам, і ўсё.
— Не зацвердзяць.
— Не залівай, ведаю. Падпісвай,— парыхтоўшчык выцягвае з партфеля падрыхтаваны дагавор.
— Пачакай. Пазваню сёння. На гэта згода трэба,— купец паказаў пальцам угору,— ад майго шэфа.
— Патрабуй пятнаццаць, і ніякіх там. На насенне не наскупіцца.
— Ну і абдзірала ты! З брацкага народа так лупіць? За дружбу пілі? Пілі. Цалаваліся? Цалаваліся. Яка ж цэ дружба?
— У слоўніку Даля я вычытаў: «Дружба дружбой, а табачок врозь». І потым, крыўдзіш мяне. Я цябе прыняў, як госця дарагога. За свой кошт. Са сваёй кішэні. Авансам. А ты...
— Шо? Папракаеш? Га?
— Не папракаю. Напамінаю пра ўдзячнасць. Пятнаццаць коп. І мы зноў сябры. Зараз абед прынясуць, паправіш галаву. За дружбу па сто...
— Ні! Конкретно! Ні! Мэні бульба трэба. А то голову відзірвуць і скажуць, шо й зовсім нэ було. Піду шукаць бульбу... бараболю.
— Ну ідзі, ідзі! Толькі заўтра я запрашу з цябе па шаснаццаць капеек.

Віхор жыцця ў калгасе звычайна зачынаецца рана — з усходам сонца. Каля канторы збіраюцца брыгадзіры, механікі, заатэхнікі і іншыя актыўныя часціцы калгаснага цыклафазатрона.

Чакаючы старшыню, яны снуюць каля ганка ці ў калідоры, кураць, гамоняць, расказваюць анекдоты — каракцей кажучы, існуюць як бы ў стане хаосу, хоць у кожнага ёсць свой зарад, свая мэта, свая ідэя. І толькі прасіцелі ці прасіцелькі па сугуба асабістых справах трымаюцца звычайна ў староньцы, як вунь тая жанчына з дачкой, што сядзяць на лавачцы пад кустом, нібы нейтрыно, нібы без зарада, хоць у душы прынасена такая выбуховая сіла, што таго і глядзі раструшчыць шкло на стале старшыні.

З паяўленнем старшыні ўсе гэтыя актыўна заражаныя

часціцы нібы пад уздзеяннем магніта выстрайваюцца ў пэўны парадак і пасля ранішняй парады набываюць дабавачную энергію, хуткасць, вылятаюць з канторы і пачынаюць дзейнічаць бурна, актыўна, мэтанакіравана.

Вось і старшыня пад'ехаў на сваім газіку. Ён, як звычайна, сам за рулём. Ставіць машыну ў цень, пад дрэвам. Ледзь толькі вылез старшыня з газіка, як насустрач яму выскачыла жанчына, што сядзела з дачкой на лавачцы пад кустом.

— Старшыня, даражэнькі, памажы, бяда ў мяне.

— Пойдзем у кантору. Не на вуліцы разбіраць бяду тваю.

— Старшынька! Там народ у канторы. А ў мяне такое гора, што з вока на вока трэба,— жанчына ўчапілася ў рукаў старшыні.

— Ну, пайшлі, пайшлі. Зачынімся ў кабінеце. Ідзіце туды.

На ганку канторы розны люд. Вітаюцца. Некаторыя такія, што хочуць без чаргі вырашыць сваё пытанне. Жанчына з дачкой, схіліўшы галовы, нібы саромячыся, нібы вінаватыя, праходзяць міма людзей проста ў кабінет.

— Таварыш старшыня! Я другі дзень не магу злавіць галоўнага агранома. Можа, вы самі?..

— Я сказаў,— адказвае старшыня,— без агранома не магу. Усё! А ты чаго?

— Не дае трактара галоўны механік.

— Ведаю. Заўтра дасць.

— Да заўтрага засмокча балота. Трэба выцягнуць, там жа ўсе скавародкі, чыгункі, каструлі.

— Не трэба было лезці ў балота.

— Нячысцік завёў.

— Гарэлка, змій зялёны завёў!

— Дык жа наваселле...

Збоку гэтую сцэну здымае ручной кінакамерай нейкі гарадскі хлюст. Старшыня заўважыў гэта і заспяшаўся.

— Таварышы! Не на вуліцы. Парадак трэба. Да дванаццаці прымаю сёння.

І знік за дзвярыма.

У кабінеце сядзяць панурыя жанчына і дачка. Не паспеўшы зачыніць дзверы, проста з парога старшыня пытаецца ў бабы:

— Ну, што за бяда з табой прыключылася?

— Не са мной. З ёй,— тыцнула пальцам на дачку жанчына.

— Захварэла?

— Горай! Горай за хваробу...

Дзяўчына яшчэ ніжэй апусціла галаву.

— Што такое?

— Швед Іван, Аксюткін сынок, пагалоску пусціў... Усё сяло гудзе, што ён з ёй... што ён яе... ну... У саломе быццам, каля гумна, калі ўсе абедаць пайшлі.

— Сярод бела дня?

— Ды ўжо ж.

Старшыня моўчкі ацэньвае сітуацыю.

— Ну, значыцца... Хай жэніцца, калі прызнаўся.

— Дык жа не хоча.

— Як гэта не хоча? Разбойнік! Прымусім! Пазаву сюды, прыцісну ў куток, дык захоча,— абяцае старшыня.

— Яна не хоча, дурніца гэта во... Наадрэз...

— Чаму? — тут ужо і старшыня разгубіўся. Пытае ў дзяўчыны мякка, зацікаўлена, шчыра: — Чаму ўсё-такі?

— Знайшлі мне жаніха! — з пагардай адвярнулася дзяўчына.

— Хто табе знайшоў? Ты сама знайшла! — пайшла ў наступ маці.— А цяпер — нехарошы?

— А ў саломе быў харошы? — цікавіцца не без уедлівасці і старшыня.

— Нічога ў саломе не было,— дзяўчына вачэй усё ж не паднімае.

— Як не было? Штаны ён табе парваў? — выкрыквае маці.

— Ну парваў... І ўсё роўна не было.

— А... а...— не ведае, як і спытаць старшыня.— Як жа тады...

— Выкруцілася, і ўсё,— ухіляецца ад дэталей дзяўчына.

— Я не пра тое. Не было дык не было. Але як жа ён славу пусціў?

— У клубе.

— Пазаўчора.

— Хлопцам пахваліўся.

— Можа, п'яны,— сумняваецца старшыня.

— П'яных у клуб не пускаюць,— паведамляе дзяўчына.

— Правільна,— пахваліў парадкі ў клубе. Потым ад-

чыніў дзверы і паклікаў: — Юрка! Дзе тут быў загадчык клуба? Юрку да мяне!

І праз якую хвіліну Юрка ўжо стаяў на парозе.

— Слухаю вас, Уладзімір Апанасавіч.

— У цябе пад началам клуб ці пункт па распаўсюджванні плётак? — старшыня кіўнуў галавой у бок дзяўчыны.

— А-а... гэта Швед Іван. Было,— пацвердзіў Юрка.

— Швед, Швед,— перадражніў старшыня.— А ты хто? Турак? Не мог заткнуць яму ляпу?

— Не пры мне было. Калі я падышоў, усе ўжо ржалі, як жарабкі. Я, праўда, папярэдзіў Івана...

— Ну, і што цяпер? Як лакалізаваць? Пакрыўдзіў ён яе.

— Калі ўзяць спраўку ад доктара, то можна і пад суд,— растлумачыў закон Юрка.

Дзяўчына ўпершыню тут падняла вочы на Юрку. А потым з цікавасцю паглядзела на старшыню, але сустрэўшыся позіркамі, яна зноў апусціла вочы долу.

— Ну, значыць, трэба ўзяць спраўку,— старшыня зірнуў на дзяўчыну.

Чакаюць ад яе слова і маці, і Юрка.

— Не буду я браць такую спраўку,— нарэшце сказала дзяўчына, як аб даўно прадуманым і вырашаным.

— Дык што ж гэта ты? Яго шкадуеш? А ён з табою так...— накінулася маці.

— Як? — акрысілася дачка.— Ён мне нічога не зрабіў. А што языком, дык... За гэта не трэба ў турму. Ён проста дурань.

Як проста і будзённа выяўляецца велікадушша і высакароднасць дзяўчыны. Хвала! Хвала ёй!

— Ніякай праблемы няма,— Юрка развёў рукамі і падміргнуў старшыні.

— Ідзі,— адпусціў Юрку старшыня.

— Уладзімір Апанасавіч! Там прыехаў з кінастудыі аператар. Хоча з вамі пагутарыць.

— Потым. Ідзі. Пасля іх,— старшыня выправадзіў Юрку за дзверы.— А можа, ён хоча ажаніцца і, каб адбіць другіх, пусціў такую хвалу?

— І я так думала. Гаварыла з ім. Не вельмі і ён ірвецца,— у голасе жанчыны ўжо цёплае слязінка.— Матрос, кажа, хай па ёй жэніцца.

— Які матрос?
— Паехаў ён. Адпускнік быў. Наталлін сын,— растлумачыла дзяўчына.— З ім я пайшла танцаваць той вечар, а не з Іванам. Вот...
— Так... Ну, дык што ж мы цяпер?.. Што мы павінны рашыць? — думае ўслых старшыня.
— І розуму не падбяру,— маці ўжо гатова заплакаць.— Як жа ты цяпер пры такой славе? А? Ты ж ведаеш, як без бацькі гадавацца. У маці, кажуць, пайшла. А ці тады тое было? Маіх жа хлопцаў на вайне пазабівала, жаніхі мае,— заплакала жанчына,— зямельку параць... На ўсё сяло — сем мужыкоў было.
— І цяпер іх не болей,— заўважае дзяўчына.— У горадзе ўсе. Спачатку ў салдаты, а адтуль — у горад.
— Але ж ты пераборлівая! — папракае дачку жанчына.— Пры такой справе ты цяпер звякуеш у дзеўках. А то і горай... Будуць хлопцы... стажыравацца,— захліпала мнагавопытная маці.
— Ну, ты не перагібай! — засаромеўся старшыня.— І то праўда — з такой славаї... Ну, а сама што думаеш?
— У горад паеду. Спраўку толькі трэба... на пашпарт.
— І ты ў горад? — пасцярожыўся, натапырыўся старшыня.
— Ну, а што ты цяпер зробіш, старшынька? — бядуе маці.
Старшыня раптам успомніў.
— Дык гэта ж той самы Швед! Іван! Што ўчора адпрасіўся ў горад. Ну, брат... Усё-ткі ён — Іван! Іван!
— Ну, але, але — Іван, Іван,— згаджаецца і маці.— Ён такі, ён можа.
— Ну і сітуацыя, скажу я табе,— старшыня шкрабе загрывак.— Толькі запомні — тут ты выкруцілася ў саломе, а ў горадзе саломы няма, там не выкруцішся.
— А там і выкручвацца не трэба. Там ніхто не выкручваецца,— ці дзяўчына пахваліла горад, ці яна паказала сваё пахабства.
— Я табе дам! Я табе пакажу, кошка ты! — закрычала жанчына на дачку.
— Не крычы. Там за дзвярамі людзі,— папярэдзіла дачка.
— Будзем думаць. Ты ідзі,— адпусціў старшыня дзяўчыну.
А як толькі за ёй зачыніліся дзверы, ён звярнуўся да жанчыны:

— Падумай і ты. А дні праз два-тры прыходзь. Адпускаць яе цяпер з вачэй таксама... Можа па руках пайсці... без прыгляду... Калі праўда, што паспытала... На сабе ведаеш...

— Ды ўжо ж, ды ўжо ж... Крый нас божа...— жанчына ігрыва зірнула на старшыню. Яна і плакала, і смялялася, і сарамелася, нібы між ёй і старшынёй была нейкая шчыкатлівая тайна. Раптам яна заспяшалася да выхаду.— Дзякуй табе, старшыня. Не кідай нас без парады.

І выйшла.

Тут жа ўламіўся ў дзверы кінааператар з камерай. Нахабнаваты, патлаты.

— Я ад кінастудыі. Вось,— аператар падае камандзіровачнае пасведчанне.— Маю заданне зняць у вас сюжэт: «Праца і адпачынак моладзі ў калгасе». У вашым, перадавым, так сказаць, маяку. Ад вас патрабуецца: дазвол, парады, рэкамендацыі.

— У мяне, браток, дзялоў хапае. Як-небудзь без мяне. А кансультацыі табе дасць...— старшыня падыходзіць да дзвярэй, адчыняе і выклікае адтуль Юрку...— вось ён. Культурная сіла наша і юрыдычная.

У кабінет заходзіць не адзін Юрка. Ён прыводзіць з сабой дзяўчыну. Апранута яна па-гарадскому, з выклікам, шык-мадэрн. Дарэчы, дзяўчына мае рацыю — такім ножкам не трэба спаднічка.

— Юрка! Будзеш кансульціраваць кіношніка па ўсіх...— і старшыня не дагаварыў. Вельмі ж ужо экзатычная дзяўчына. Ён, нібы папярхнуўся дзяўчынай, уважліва разглядае яе, усе дэталі яе вопраткі — зверху ўніз, знізу ўверх. Яна ж, нібы пераймаючы яго манеру, таксама разглядае старшыню гэтак жа прыдзірліва і ўважліва. Але ёй, відаць, раней падакучыла такая звышувага старшыні, і, каб пакпіць з яго, яна дагадзіла — расхінула свой плашчык — на, маўляў, паглядзі і так. А можа, і зусім раздзецца? Старшыня ўсё зразумеў і крыху засаромеўся. Дзяўчо, а ў чырвань увагнала. Бываюць.

— Што гэта? — спытаў ён у Юркі. Але адказала сама дзяўчына.

— Не што, а хто,— папраўіла яна.— Я адушаўлёная.

Кінааператар ужо стракатаў кінакамерай.

— Вось дыплом. Вось пакіраванне аддзела культуры. Буду ў вас працаваць бібліятэкарам. Не ў вас асабіста, а ў калгасе.

— А ці надоўга?

— Пазаўсёды.
— А ты што?.. Сама? Сваёй ахвотай?
— Сама! Сваёй! А што яшчэ?
— Дзіва! Ты, можа, з дэфектам якім?
— А ў вас што? Усе дэфектыўныя?
— Якая ж ты злая... Проста дзіва. Звычайна такія ў горад ірвуцца, а ты...
— Дык гэта звычайныя. А я — незвычайная. Як вы. Толькі зорачкі няма. Шкада, што ніколі і не будзе.
— Чаму? Табе яшчэ...
— Бібліятэкарам не даюць,— перапыніла дзяўчына.
Кінаапаратар не зяваў. Эпізод быў зняты на плёнку, а за спіной магнітафон запісаў дыялог.
— Ну, сюжэт! Проста шэдэўр! — радуецца кіношнік.
Старшыню нібы пчала ўджаліла.
— А-а, дык ты гэта падстроіў! Інсцэніроўку сачыніў? Машэннікі! Ачкаўцірацелі! Вон!!
А кінаапаратар і гэта здымае. Старшыня затыкае аб'ектыў шапкай.
— Ды што вы, таварыш старшыня,— ледзь не хрысціцца кінаапаратар,— ніякага ашуканства.— Я яе першы раз бачу...
— Уладзімір Апанасавіч! Ніякага падману. Я правераў. Дакументы, накіраванне. Гэта не інсцэніроўка,— запэўніў старшыню Юрка.
А дзяўчына смяецца, аж залівaецца.
— Што значыць — быць каля знамянітасці! Яшчэ нічога не паспела зрабіць, а ўжо слава — у кіно будуць паказваць.
Старшыня з падазронасцю пазірае то на аднаго, то на другога.
— Ну, глядзіце ў мяне! А то так праўду з сяла, што... Сабакамі зацкую! — пагразіў старшыня і тут жа падабрэў.— А дзе ты будзеш жыць? Юрка! Прыстрой ты яе... А бацькі твае дзе, хто яны?
— Няма іх у мяне. Дзетдомаўка я,— нібы па анкету адказала дзяўчына.
— Чуеш, Юрка? Ці табе паўтарыць?
— Я мог бы... і ў нас. Маці ды я — двое нас... Але ж...
— А што? Маці ў цябе спагадлівая, а хлопец ты рахманы.
— Але ж яна завельмі бойкая. Яна сама можа...
— Я ўсё магу! — палохае дзяўчына.— А калі ўхажорка ёсць, то абяцаю — раўнаваць будзе.

— Есць. Чаго ён і пабойваецца. Вунь яна якраз ідзе,— старшыня піхнуў фортку і крычыць на вуліцу: — Юлія! Эй! Курыны начальнік! Зайдзі сюды, павачка! Зайдзі! Сядзь, кіно, а то павалішся.

— Я? Чаму? — не зразумеў кінаапаратар.

— Убачыш яе і павалішся, абамлееш. У кіно такіх не ўбачыш.

У кабінет заходзіць Юлька. Не дзяўчына, а — сапраўды пава. Не, не дзяўчына, а — рыбінка! Ды што я кажу?! Ягадка-сунічка! Такая красуня! Такая чараўніца! Колькі ласкі ў яе вачах?! А колькі строгасці! Якое хараство. Сапраўды ні ў кіно, ні ў тэатры такіх цяпер не ўбачыш. Ну што тая Афрадзіта? Гэтая ж з рукамі. Ды з якімі! Дакраніся да яе, зачапі — так пляснe па мордзе — тры дні будзеш далікатна гладзіць тое месца.

Кінаапаратар і сапраўды абамлеў, сеў і толькі вачамі лыпае. Бібліятэкарка таксама міргае вачаняткамі — не чакала такой прыгажосці.

Старшыня. Юля, просьба ў мяне... Прыехала да нас хар-рошая дзяўчына, а жыць ёй пакуль што няма дзе. Вазьмі да сябе. Упэўнены, што падружыце. А за гэта такога жаніха табе знайду... Са сталіцы выпішу.

Юля. Во такога? — паказала на кінаапаратара.

Старшыня. А што? Кепскі?

Юля. Нішто сабе, толькі... Паношаны ўжо. І моль пабіла.

Юля паказала на добры лапік лысіны ў кінаапаратара.

Тамара-бібліятэкарка так і пырснула ад смеху.

Кінаапаратар. Няпраўда! Я пранафталінены.

Юля. Ну, значыць, доўга ў шуфлядзе трымалі. Без ужытку, пацёрты.

Старшыня. Не чапайся, кіно! А то — абстрыгуць і голым у Афрыку пусцяць.

Юля. А дзе яна? Гэтая, ці што? — паказала на Тамару.

Старшыня. Яна.

Юля коратка, але прыдзірліва агледзела дзяўчыну.

Юля. А бацька мой... во ўжо будзе рады-ы... Ну, хадзем.

Дзяўчаты пайшлі.

Кінаапаратар. Ну і дзяўчына! Ох і дзяўчына! — аж вочы зажмурыў.— Толькі для адпачынку...

Старшыня. Што-о-о?!

К і н а а п е р а т а р *(спалохаўся, апраўдваецца)*. Вы не так зразумелі! Я...

У дзверы заглядвае сакратар-машыністка.

— Уладзімір Апанасавіч! Тут вас чакае прадстаўнік з Украіны.

— Адкуль?

— З Украіны.

— Мінутачку. Папрасі, хай пачакае мінутачку. Я зараз. Во толькі выправаджу кіно...

Машыністка знікае.

К і н а а п е р а т а р. Вы не так зразумелі! Я меў на ўвазе сюжэт!

С т а р ш ы н я. Сюжэт?

К і н а а п е р а т а р. Сюжэт! Ну, разумееце... Яна на адпачынку — танцуе... у клубе... спявае... На пляжы, напрыклад, плавае. А? Што? — нават зацмокаў.

— Па вачах тваіх бачу, які сюжэт маеш на ўвазе. Але зарубі на носе: як толькі ўбачу, што ты каля яе пачынаеш чыркаць крылом,— тут жа ў камандзіроўцы — прыбыў і выбыў. А следам і пісьмо жонцы: так і так, Маруся, глядзі за ім, на шворцы трымай. Знаю я вас, самае масавае мастацтва.

— Ну, што вы, таварыш старшыня! Якім крылом? — у вачах кінааператара столькі наіўнасці, чысціні, бязгрэшнасці, быццам ён ніколі, нічога, ніякага і нават не разумее, аб чым гаворку вядзе старшыня.— Вы толькі скажыце, а дзе яна працуе?

— Ну, кыш! У мяне справы. Юрка! Забірай яго і не спускай вока. У сваіх інтарэсах.

— А я хацеў здымаць вас,— заікнуўся кінааператар.

— Здымаць мяне будзе райком, а не ты,— пажартаваў старшыня.

Ён расчыніў дзверы, выпусціў кінааператара і Юрку, а тады ўжо запрасіў новага госця.

— Ну, Украіна! Прашу! Калі ласка! Вельмі рады! Як гэта? «Белоруссия родная, Украина золотая...» Так?

Вітаюцца. Моцна трасуць рукамі.

— Сінявока сэстра Україны...

— Слухаю вас!

— Выручайтэ!

— Чым? Калі змагу, то з вялікай радасцю.

— У райкоме параілі. У яго, кажуць, цэ ў вас, усяго хапае. Нават птушынае малако можна купіць.

— Сёлета не — птушкі пярэдайкі, ялаўкі. І далыны

апарат сапсаваўся. А рукамі... сам ведаеш, якое вымя ў вераб'іхі...

Госць дзеля далікатнасці засмяяўся, нібы і праўда смешна.

— Мэні нэ молоко, мэні бульба трэба, бараболя. На насіння.

— Ах, ах, ах, ах... Прадаў. Учора прадаў. Як шкада. Нарыхтоўшчыку. Раённаму. Пад мятлу. Усю. Толькі насенфонд.

— Учора? — вельмі здзівіўся ўкраінскі прадстаўнік.

— Учора. Дагавор падпісалі ўчора.

— Ну, гад! Ну, паразіт! А?

Старшыня і вочы вытрашчыў. Далікатны госць!

— Цэ я того... Тры дні паіў мэнэ, а сам... тым часам абцяпаў... От об'іхаў! От абвёў! Напуваў! По ноздры...

— Каньяком?

— Каньяком.

— І машыністка была?

— Була. Учора була.

— Яго метад.

— Пылы, пісні співалы... украінскі... Народні... За дружбы пылы, цілувалыся. Цьфу! Грошы не шкадуваў...— як на споведзі прызнаваўся і каяўся чалавек. Такое часам бывае з людзьмі. Асабліва ў хвіліны вялікага ўзрушэння, крыўды, адчаю ці расчаравання.

— Ён такі, можа аблапошыць,— спагадліва зазначыў старшыня.

— Ды яшчэ як аблапошыў! А тэпэр хоча здэрты з мэнэ па п'ятнаццаць копіек за кілаграм. Прадае! Гад!

— Што-о? — прыйшла чарга здзівіцца старшыні. Ён так гаркнуў, што ў кабінет прыбеглі напалоханы Юрка і машыністка.

— Ото ж і воно! Я даваў дванаццаць. Ні ў якую! Трынаццаць. І слухаць нэ хоча. П'ятнаццаць — і ўсэ! Хоць са скуры лізь! А вам він кількі дае, за кілограм?

— Ты чуў? — старшыня аж задыхаецца ад гневу.— Ты чуў, кажу? А-а-а... А-а...— задыхаецца, заходзіцца старшыня.— Ну, гад печаны. Ну, машэннік. Ну, разбойнік! Грабіцель! Злодзей! Сярод бела дня скуру лупіць! І з каго-о-о? — старшыня быў раз'юшаны.

— З брацкага народа! Га? А цілувалыся! — дуэтам гневаюцца ўкраінскі купец і старшыня.

— З мяне? Са сваіх? Так мяне аб'ягорыць! А? Юрка! Ты чуў? Юрыст!

— Не, такога яшчэ не чуў.

— І не пачуеш! Каб мяне? Не будзе гэтага! Не дапушчу! Дваццаць пяць тысяч кур'ераў пасляць!!! Але знайсці, злавіць, даставіць!! Жывога і з партфелем!! *(Хапае тэлефон.)* Ало! Ало! Раён? Мне галоўнага раённага жуліка. А іх хіба два? Ну, правільна, нарыхтоўшчык! Ало! А дзе сам? Дзе? *(Заціскае трубку і радасна паведамляе Юрку.)* У нас! Тут! Там! У пятай брыгадзе.

Юрка *(шэптам)*. Спытайце, дзе дагавор!

— Галубка! Дагавор на бульбу ён падпісаў з «Маяком»? Ага. А дагавор ён у сейфе ці пры сабе трымае? Ну, паглядзі, паглядзі, золатка. Ага, пры сабе.

Старшыня кінуў трубку, не падзякаваўшы галубцы.

— Шафёра! Машыну! Юрка! Афармляй новы дагавор. *(Да ўкраінца.)* Колькі даеш?

— Дванаццаць! Без торгу!

— Афармляй!

— На прададзеную бульбу? — напамінае Юрка.

— На крадзеную. Ён злодзей! Выцягнуў з кішэні ў мяне шэсцьдзесят тысяч рублёў!

— Па дагавору. На законных падставах.

— Ён калгас аграбіў!

— На законных падставах. Па дагавору.

— Ты што? Адвакатам у яго?

— У вас юрысконсультам.

— Няма дагавора! Не было дагавора! Ён прысніўся табе і яму! Ясна? Быў дагавор? Ты яго бачыў?

— Не! Не было, не бачыў.

— Прысніўся?

— Прысніўся. Учора. Пад раніцу. Як трэція пеўні спявалі. Чорна-белы сон.

— Шафёра! Машыну!

— Не праедзеце ўжо. Паводка! Разліў.

— Лодку! Маторку!

— Аграном у раён паплыў!

— Чорт вазьмі! Бакеншчыка з маторкай!

Старшыня выскачыў з кабінета, але тут жа яму напярэймы цэлы гурт прасіцеляў.

— Таварыш старшыня!

— Уладзімір Апанасавіч!

— Не магу! Дарагія! Залатыя! Няма часу! Бяда ў мяне! Трэба ратаваць! Шэсцьдзесят тысяч!

Пойма. Разліў. Як вокам кінуць — вада, кусты. Натужна раве матор. Булькоча вада. Не! Гэта не лодка. Гэта

шматпакутны газік спрабуе пераадолець уплаў гэтае мора. У машыне апроч старшыні шафёр і кінаапаратар. Ён на ходу здымае гэтыя дзівосныя палескія вясеннія пейзажы.

— Харошы ты работнік! Старанны...— хваліць старшыня апаратара.

— І вы таксама,— не астаецца ў даўгу кіношнік.— На цеплаходах плаваў, па лодках, на плытах. А па газіку па моры — упершыню.

— Не праедзем,— хмура прарочыць шафёр.

— Трэба! — камандуе старшыня.

— Хочацца...— удакладняе шафёр.

Машына выехала на выспачку і лёгка пакацілася па сухой дарозе.

— Ну во і выбраліся,— радуецца старшыня.

— А там? Рана весяліцца.

Не паспеў шафёр накаркаць, як машына ўскочыла ў выбоіну, загрузла і забуксавала ў чорнай балотнай жыжы.

Па вуліцы ідуць Юля і Тамара. Відаць, што дзяўчаты адна адной падабаюцца.

— Я начальніца вялікая! Пад маёй уладай тры тысячы курачак,— хваліцца Юля.

— А пеўнікаў?

— Мала. Як хлопцаў на сяле. Толькі ў мяне пеўнікі — прыгажуны. Вось і наша хата.

Дзяўчаты праз веснічкі заходзяць у двор, а адтуль і ў хату.

— Хто-о та-ам? — пачуўся хваравіты голас з другой палавіны.

— Я, о, свет вачэй маіх,— азвалася Юля.

— Вады падай.

— Ты так з самага ранку і не піў?

— Не піў.

— Пакутнік ты наш,— аднак у голасе Юлі ні шкадавання, ні спагады, ні жалю. Яна вядзе гэтую размову, прымаючы госцю: вешае Тамарын плашчык, ставіць у кут яе чамаданчык. А потым прыхарошваецца, папраўляе прычоску перад люстэркам.

— А хто... там? — Тамара паказала на сумежны пакой.

— Бацька,— трымаючы ў зубах прыколкі, адказвае Юля.

— Падай вадзічкі, а то памру,— просіць бацька.

— Пачакай. Хутка маці прыйдзе з фермы. Яна і падасць.

— Ну, пашкадуй,— моліць бацька.

— Ён што? Хворы? — у вачах Тамары ўжо іскаркі непрыязні.

— Хворы. Даўно. Колькі сябе помню — хворы.

— То як жа ты? Чаму ж ты хвораму і...

А Юля смяецца з варожасці Тамары.

— А ты сама падай вады і паглядзі на яго, няшчасненькага.

Тамара паспешліва хапае кружку, чэрпае з вядра ваду і нясе хвораму ў сумежны пакой. Перад вачыма Тамары паўстала такое, што яна ад нечаканасці спынілася каля парога з разяўленым ротам. На вялікім ложку пад палогам з чорнага шоўку, вышытым золатам і срэбрам на фоне ўзорчатага чырвонага дывана, як намаляваны, сядзеў прыгожы вусаты мужчына. Сядзеў па-турэцку і раскладваў перад сабой пасьянс. Мужчына — да пояса голы, твар пагалены, сыты, гладкі, вочы з паволокай, томныя. Справа і злева белыя, як снег, падушкі. Перад ложкам хатнія тапкі з зялёнага сукна. Яны таксама расшыты жоўтым. На сцяне фатаграфіі кінаактрыс — і нашых, і замежных. Не менш за дзяўчыну здзівіўся і Юлін бацька.

— О, луналікая! Адкуль ты? Ці не алах паслаў цябе, каб аблегчыць мае пакуты? — мужчына ўзняў рукі ўгору.— О, чароўны фінік! Уратуй мяне ад смагі! — ён дакрануўся адной рукой да лба, потым да грудзей, а другую працягнуў да кварты з вадой.

Дзяўчына нясмела паднесла яму ваду. А ззаду на парозе стаяла Юля і бязгучна смяялася.

— А сёння ты кім прыкідваешся? — спытала яна.

— Сёння я — турэцкі султан, о яснавокая! — сур'ёзна адказаў бацька.

— Тата! Яна думае, што ты ненармальны.

— Тым прыемней будзе яе расчараванне.

Тамара, нічога не разумеючы, пазірае то на бацьку, то на дачку.

Машына загрузла ў калдобіне. Буксуюць колы, пырскаючы гразёю. Машына засела не на жарт. Даўно, відаць, мудохаюцца тут старшыня і шафёр. Абое заляплены гразёй па вушы, абое мокрыя па пахі. Знізу ад гразі, зверху ад поту. А кінааператар здымае і гэтыя пакуты старшыні і шафёра. Ён выбраўся на выспачку і стараецца зняць на

плёнку гэтых небаракаў з розных ракурсаў. Нарэшце старшыня не стрываў. Ён павярнуўся да кінааператара і са злосцю закрычаў на яго:

— Ты што круцішся тут? Што верцішся? Не бачыш, што трэба памагчы? Сам не дагадаешся? Ці баішся белыя ручкі запэцкаць? Га?

Кінааператар, не зважаючы на словы старшыні, здымае і гэты кадр — раз'юшанага старшыню, ды нават прыблізіўшыся да яго, каб атрымаўся буйным планам.

— Ідзі, падпіхні! Чуеш? Калі не выберамся адсюль да вечара, то... на корм рыбам пойдзем. Бачыш, як вада прыбывае? Ну? Доўга цябе прасіць?

— Цудоўны! Цудоўны кадр! Ні адзін акцёр так не сыграе! Арганіка — во! Дарагі Уладзімір Апанасавіч! Я вам памагаю! Ды так, як ніхто і ніколі не памагаў вам выцягваць з гразі вашу тэхніку.

Старшыня аж рукамі пляснуў па ляжках.

— Ну ці чуў ты? Ён памагае...

— Ды яшчэ як! Гэтыя кадры пойдуць у фільм. А фільм будзе прымаць начальства — рэспубліканскае. Вось я ім і пакажу вашы пакуты.

І мы бачым кінакадры, толькі што знятыя кінааператарам. Праўда, тэкст чытаецца другім голасам і словы другія. У кіно старшыня, а дакладней, за старшыню пехта гаворыць:

— Как же можно вести хозяйство? Как можно руководить хозяйством при таких дорогах? Мы же гробим первоклассную технику. Мы используем ее только наполовину. Дайте нам хорошие дороги! Мы завалим вас хлебом, мясом, молоком, овощами, фруктами! Помогите нам построить дороги!

— Вось так будзе,— абяцае кінааператар.— І быць не можа, каб начальства не адгукнулася.

Старшыня смяецца, аж залівaецца. А кінааператар і гэта здымае.

— Ну, лаўкач! Ну, машэннік! Я ж так не гаварыў.

— Але не раз так думаў. Думалі? Верна?

Над галовамі ў іх гудзе верталёт. Усе трое задралі ўгору галовы. Кінааператар няcмела падзывае жэстам верталёт. І, во дзіва, ці там заўважылі гэты жэст, ці, можа, зразумелі, што людзі сярод разліву ў бядзе, але верталёт развярнуўся і стаў набліжацца да нашых гаротнікаў.

— Ды я ж — член павадкавай камісіі,— успомніў старшыня,— па барацьбе з навадненнем...

Палессе, затопленае паводкай, з кабіны верталёта. У кабіне старшыня і кінаапаратар.

— У што ўпіраецца справа? — пытаецца старшыня.
— У гразь?
— Не.
— У дарогі?
— Не.
— У транспарт?
— Не. У сувязь. Сувязь паміж людзьмі. Цесную, аператыўную, пастаянную, бесперапынную сувязь. Тады і дарог меней, гразь — чапуха, і транспарту меней. Сувязь паміж начальнікам і падначаленым. Знізу ўверх і зверху ўніз. А не аднабакова, як у паўправадніках. Без слупоў сувязь. Прыйшла ў галаву добрая думка — тут жа яе і перадаў па прызначэнні.
— Дык што вам — цяжка паставіць тэлефоны ў кожным кутку калгаса? Вы ж не бедненькія, слава алаху.
— Тэлефоны? Не бедныя, не буду грашыць, але з тэлефонам можам вылецець у трубу. На адных слупах прагарым. А дроту колькі трэба, каб аблытаць усе службы? Ды і ў полі тэлефон не паставіш. Тут другое трэба.
— Тэлепатыя, ці што? Во дармавінка!
— Ды хоць бы звычайнае радыё...— старшыня выглянуў за борт.

У полі, каля раскрытага капца бульбы стаяць пад пагрузкай тры грузавікі. Жанчыны пасыпаюць кошыкі, ставяць на аўтапагрузчык, адтуль бульба паднімаецца ў кузаў аўтамашыны.

Тут жа, непадалёку, убаку стаяць брыгадзір і нарыхтоўшчык. Абое злыя чамусьці.

— Ты сёння павінен адгрузіць пяцьдзесят тон. А з заўтрашняга — па семдзесят — восемдзесят тон у дзень. А што ты мне цыркаеш, што ты мне цыркаеш? Ты за месяц не перавязеш мне бульбу...
— Не гані мяне ў шыю! — агрызаецца брыгадзір.— Бульба някрадзеная. Паспеем. А сёння не магу — паслаў машыны па селітру. Сеяць трэба. Не гані,— і парэшце раззлаваўся.— Не камандуй! Не камандуй! Я тут гаспадар! Сам ведаю, што мне рабіць. Ясна?
— Ну, мілок, дорага табе будзе каштаваць твая гэта... упартасць! — грозіць нарыхтоўшчык.

— Што, што? — насцярожыўся брыгадзір.— Ах, так?.. Тады, дарагі мой, чакай...— і закамандаваў шафёрам:— Машыны не адпраўляць! А то... Ведаем мы і такіх. Спачатку саставім акт, што бульбу ты ад мяне прыняў гатунковую. А то летась адгрузілі бульбу, а потым прыслалі свой акт, што дваццаць працэнтаў гнілой. Пакуль не падпішаш акт, ні грама не адгрузім. Пішы!

Гурчыць у небе матор верталёта. Машына нібы птушка выглядае — дзе сесці. І вось яна набліжаецца, зніжаецца і садзіцца непадалёку ад канца. Усе, хто быў ля канца, кінулі працу і ўтаропіліся ў новую машыну. Хоць верталёт і не дзіва тут, але не такі часты госць. З кабіны верталёта выходзяць старшыня і кінаапаратар.

Старшыня, убачыўшы нарыхтоўшчыка, шчыра радуецца, ну нібы той і сапраўды найдаражэйшы прыяцель. А нарыхтоўшчык нават і не здагадваецца, што тоіцца за гэтай ветлівай, нават ласкавай ухмылачкай старшыні.

— Ну, як жа тут у вас дзялішкі?

— Не возіць,— скардзіцца нарыхтоўшчык.

— Як так не возіць? — па-царску строга пытаецца старшыня.

— Грубіяніць. Кажа: «Не гані. Някрадзеная».

— Як так някрадзеная? Хто табе сказаў, што някрадзеная? А? Цьфу, ты чорт! Ты дагавор чытаў? — напусціўся старшыня на брыгадзіра.— Чытаў ці не? — і да нарыхтоўшчыка: — А ты яму паказваў дагавор?

— Не.

— Пакажы! *(Брыгадзіру.)* Чытай! Бачыш, якую няўстойку мы заплацім, калі ў час не вывезем? Ну? Бачыш?

Брыгадзір уважліва чытае дагавор.

— Дай сюды паперку!

Старшыня адбірае ў брыгадзіра паперу, тут жа рве яе на шматкі і кідае іх на вецер. Ашаломлены нарыхтоўшчык спрабуе яшчэ лавіць тыя шматкі.

А старшыня ўжо сур'ёзны, нават грозны, пытаецца ў нарыхтоўшчыка:

— Слухай! А ты хто такі? Ты чаго тут?

— Гэта ж дагавор... гэта ж дакумент,— ніяк не можа апамятацца нарыхтоўшчык.

— Які дагавор? Ты што? З перапою? Га? Табе прысніўся дагавор. Ніякага дагавора не было. *(Звяртаецца за пацверджаннем да брыгадзіра.)* Ты бачыў дагавор?

Брыгадзір разумее свайго старшыню з паўслова.

— Не! І не чуў нават. Ніякага дагавора і быць не магло, і бульбы ў нас няма... і яна ў нас ракавая... і вазіць яе нельга...

— Ну, ну, ты не загібай, панё-ёс ужо лухту,— перапыняе брыгадзіра старшыня.— Не, брат! Не нарадзіўся яшчэ такі, каб абдурыць мяне. *(І са злосцю да нарыхтоўшчыка.)* А ты — вон! Зараз жа! Каб і духу твайго не было! Ні ў калгасе, ні ў раёне! Не трапляйся на вочы! Чуеш? Спекулянт!

Нарыхтоўшчык, утуліўшы галаву, пашкандыбаў з поля.

Брыгадзір вельмі задаволены такім паваротам справы.

— А то прыстаў к горлу — вазі! За пяць дзён!

— І вазі! І за пяць дзён! Толькі не яму, а Украіне,— старшыню нарэшце праняллі дрыжыкі — ён жа да пояса мокры.

— Дзе ж гэта вы так? Там жа суха,— брыгадзір паказаў на неба.

— Зараз бы грамаў сто пяцьдзесят,— старшыня ад азнобу пацірае рукі.— Ах, машэннік! Хацеў выцягнуць з кішэні шэсцьдзесят тысяч!.. А?!

Цудоўнае Палессе з вышыні птушынага палёту. Раздолле. Мора. Безліч астраўкоў і купін, якія асвойваюць птушкі. Вясна. Паводка. Усхваляваны кінааператар Ліхаманкава здымае чароўныя пейзажы з борта верталёта. А вось старшыня неяк скіс, ён безуважны, нецікаўны. Вот ён пахіснуўся, нібы задрамаўшы, а можа, і губляючы прытомнасць. Яго зноў праняллі дрыжыкі.

— Прастыў, праняло...— у голасе з'явілася хрыпатлівасць.

А ў небе ясна, пагодліва. Унізе на выспах снуюць трактары з сеялкамі. А вунь паказалася і птушкаферма, яе двор нібы засыпаны бялюткім снегам — гэта вырвалася на волю гаманлівае птушынае царства — легорны.

— Там наша Юлька, красуня наша,— паказаў уніз старшыня. Кінааператар здымае і ферму.

— Птушыная ферма з птушынага палёту,— радуецца ён,— Фрайман будзе задаволены такой дасціпнасцю.

— Кох, кох, кох...— певень знайшоў нешта і падзывае на гасцінец курачак. Тыя ахвотна збягаюцца да яго. Певень жа, апусціўшы адно крыло да зямлі, чыркануў паўкруга вакол сімпатычнай курачкі з нэўным намерам. Але

другі — раўнівец, ну чысты Атэла, натапырыўся, падскокнуў і стаў у баявую пазіцыю, выдавіўшы з горла сваё абурэнне і гнеў.

Так пачынаўся бытавы курыны скандал.

Юля залівіста смяялася з гэтых задзір і, нібы для параўнання, кідаючы позірк на кінааператара і Юрку. Кінааператар здымаў Юлю, а Юрка пядобразычліва касавурыўся па кіношніка.

— Слухай, ты! Што ты прывязаўся да курынай фермы, нібы ў пашым калгасе, апроч курэй, нічога і няма. Дасць табе старшыня прыкурыць. Чэспае слова, як далажу яму...

— Яго нельга хвалявацъ, ён — хворы.

— Механізатараў трэба, тэхніку, майстэрню, даярак вунь,— ледзь не за рукаў цягнуў Юрка аператара.

— Не! Пляж! Заўтра — пляж! Калі будзе такая пагода,— пляж. Юлінька! Заўтра з падружкамі на пляж! — кінааператар нібы не заўважаў Юрку.

— Механізатары ў нас галоўная сіла,— не адступаўся Юрка.

— І механізатараў — на пляж. Яны галоўная сіла, а жанчына...— кінааператар наблізіўся да Юркі нос у нос,— жанчына ў калгасе вя-лі-кая сіла! Яшчэ Сталін так сказаў.

А вялікая сіла тым часам рогам хусткі выцірае слёзы. Гэта тая жанчына, ну — маці той дзяўчыны, якую нібыта Іван Швед у саломе... Плача жанчына. А поруч з ёй крывіцца і таксама выцірае слязу другая прадстаўніца вялікай сілы — жонка старшыні.

— І трэба ж было яму захварэць? І ў такі час? — шкадуе жанчына.

— Ды так цяжка хварэе. Трызніць, кідаецца ў гарачцы. Усхопіцца з пасцелі і бяжыць, гоніцца... Тысячы, кажа, укралі... з калгаснай касы.

— Во які ён!.. І без памяці, а ў галаве адно — калгас.

— Тэмпература — сорак... А ягадзіцы так папаролі, што жывога месца няма. Гляпеш, дык...— і шчыра заплакала жонка, успамінаючы мужавы ягадзіцы. Зрашэчаныя ягадзіцы.

З сумежнага пакоя выходзяць у халатах доктар і медсястра. Жанчыны падхапіліся, глядзяць у рот доктару, чакаюць — што ён скажа.

— Ну? Што з ім? — не хапіла ўсё-ткі цярплівасці ў жанчыны.

— Пнеўманія. Двухбаковая,— доктар скідае з сябе халат.— Крупозная.

Жанчыны пераглянуліся.

— Запаленне?

— Ага.

— Дык во ўжо глядзіце, доктар, каб... А то...

— А вы што? Народны кантроль ці... Хто вы яму?

— Я? Яму? Калгасніца я яму,— нібы гэта азначала, што яна і ёсць самая бліжэйшая сваячка.

— А-а...— доктар павярнуўся да старшынёвай жонкі.— А вы нікога не пускайце да яго. Яму патрэбен спакой. Паспеюць з семкамі па торг. А калі не, дык... я магу забраць яго ў бальніцу. Вам спакайней будзе.

— Не, доктар, дзякуй, хай дома будзе. Я падзяжуру ўжо. А калі што, дык...— прасіла жонка.

— І праведаць ужо нельга...— пакрыўдзілася жанчына.— Можа, ён ад таго на папраўку хутчэй пойдзе.

Доктар нават не ўдастоіў яе адказам. А старшыні паабяцаў:

— Вечарам зайду.

І медперсанал пайшоў з хаты.

— Строгі які...

— Старая! Хто там у цябе? — пацікавіўся старшыня з другога пакоя.

— Ды гэта...

— Гэта я, старшынька,— паспяшыла далажыцца жанчына.— Во прачула, што ты захварэў, дык прыйшла праведаць.

— А-а, ты. Ну, заходзь, заходзь, ласкавая.

Не паспела жонка як-небудзь зрэагаваць на гэтае запрашэнне, а жанчына, вільнуўшы спадніцай, знікла за дзвярыма. Пайшла на адведкі.

Старшыня ляжаў на высокай падушцы, калі ўвайшла жанчына. А яна акурат як пісаў некалі Катлярэўскі:

«Прийшла Венера, іскривилась, заплакала і завіскрилась і стала хлипать перед ним...»

— Ну, чаго ты, чаго ты? — стаў суцяшаць старшыня спагадлівую жанчыну.— Я ж не паміраю.

— Дык жа шкода цябе...

— Ну, як ты там? Як дачка? Што рашылі?

— Ды ў горад хацела, а тут...

— У горад усё-ткі?

— У горад, старшынька.

— Ну...— памарудзіў трохі старшыня.— То давай... Дзе там ты яе схавала? За пазухай? Давай падпішу табе даведку. Вымай.

— Уй, які ты, старшыня, дагадлівы,— жанчына хуценька вымае з-за пазухі паперку.— Скрозь зямлю ўсё бачыш.

— Не скрозь зямлю, а скрозь кофту ўсё бачу.

Жанчына нібыта і сапраўды засаромелася, як дзяўчо якое.

— Ай, ідзі ты, старшыня,— і бліснула вочкамі.— На папраўку хутка, калі так жартуеш.

Старшыня падпісаў паперку і вярнуў бабе. У другім пакоі прыглушана гудзеў бас.

— Ды мне на мінуту толькі...

— Ды хворы ён, забараніў доктар,— не ўпускала жонка кагосьці.

— Дык я пайду, старшыня. Папраўляйся, любы...

— Ну, ідзі, ідзі, і заві таго — хто там.

А ў пакой ужо сам уваходзіў галоўны механік.

— Ну, што ў цябе?

Механік камячыў у руках шапку.

— Стала,— трагічна паведаміў механік.

— Хто?

— Яна. Вялікая машына. Стала.

— Ста-ала-а? — старшыня аж прыўзняўся з падушкі.

— Як укопаная.

— Ды ты ведаеш... Калі яна працуе, колькі чалавек замяняе?

— Тысячу.

— А яна стаіць? — здзіўляецца старшыня.— Ты ведаеш, што гэта такое?

Механік апусціў галаву.

— Гэта ж забастоўка! Забаставала тысяча чалавек! І ты арганізатар забастоўкі! Ты — галоўны механік!

— Не механік я...

— А хто ты?

— Самавук... Дамарошчаны. А тут інжынер трэба. З дыпломам. Шукайце другога — не спраўляюся я. А мяне ў горад адпусціце, давучыцца трэба. Давучуся, вярнуся.

— І ты?.. І ты?.. І ты? — старшыні зрабілася блага.— А я? Вот цябе... Толькі даганю. Шэсцьдзесят тысяч хапнуў... Лодку! Маторку мне!!!

Механік спалохаўся. Ён спачатку кінуўся да старшыні, а потым паклікаў яго жонку.

— Ён жа хворы! Ён жа зусім хворы! — адкрыў механік.

— Я ж казала, я ж казала! Доктар забараніў,— скрозь слёзы папракала жанчына; прысеўшы на ложак, яна супакойвала мужа. Ён пачаў трызніць.

Перад вачыма бяжыць, бяжыць чорная зямля. Ці гэта гразкая дарога, ці ралля? Не, гэта лентачны транспарцёр гоніць, гоніць грунт, зямлю, чарназём з балота. Гэта транспарцёр з тое самае Вялікай машыны — каналакапальніка. Раптам гэты лентачны транспарцёр чамусьці павялічваецца, павялічваецца, расце ўшыркі і ўдаўжыню... І ўжо на ім не толькі зямля, але і людзі. Яны па адным, па два, а то і групкамі ад'язджаюць, аддаляюцца, аддаляюцца. І людзі гэтыя — свае, знаёмыя, аднавяскоўцы. Старшыні стала страшна. Ён хоча крыкнуць, а не можа.

І раптам перад ім ужо не транспарцёр, а эскалатар, як у метро — чысты, прыгожы, акуратны. Ён вязе людзей уверх, уверх, уверх... Сваіх, знаёмых, з калгаса... Старшыня азірнуўся, а вакол — нікога, астаўся адзін. На ўсё поле, вялікае, бязмежнае — адзін. А эскалатар забірае людзей, заграбае і вязе туды, у неба.

І старшыня закрычаў.

— Стойце! Куды ж вы? Стойце! Назад! — крычыць старшыня ў пасцелі.

Але эскалатар няўмольны. І старшыня заплакаў. І ў гэты час аднекуль узялася Юля. Яна суцяшае старшыню. Выцірае яму слёзы духмянай хустачкай. Людзі на эскалатары свае, знаёмыя, спагадлівыя, заўважылі слёзы старшыні і рынуліся назад па ступеньках эскалатара. Але машына прыбаўляе ход, ступенькі імчацца з шалёнай хуткасцю, так што людзі хоць і бягуць уніз, аднак машына іх паднімае ўгару. Яны аддаляюцца і аддаляюцца.

— Не пакідай мяне, не пакідай мяне,— шэпча Юльцы старшыня.

— Не, не! Не пакіну! Ты супакойся,— адказвае Юлька жончыным голасам.

Старшыня расплюшчыў вочы і, убачыўшы, што каля яго ложка сядзіць не Юлька, а жонка, зноў закрыў вочы. З-пад павек выцісnулася сляза.

— Не пакідай, Юлька! — яшчэ раз папрасіў старшыня.

На вокладцы часопіса «Беларусь» — каляровае фота Юлі. Малаічына кінааператар. Гэта яго работа. Ён здолеў выявіць усе чары дзяўчыны.

На гэты партрэт кладзецца падпісаны канверт, потым другі, трэці, яшчэ пяць, яшчэ восем, яшчэ, яшчэ... І на стале вырастае кіпа пісем. Юлі, Юлі, Юлі... Розныя канверты, розныя маркі, розныя почыркі.

— Адразу стала знамянітай! Столькі пісем! — шчыра радуецца Тамара.— Кінаарцісткі, можа, столькі не атрымліваюць... І ўсе ад хлопцаў...

Разам з Тамарай радуецца і Юля. А вось Юрка сядзіць хмуры, нездаволены, нават злы. Сур'ёзны і засяроджаны сядзіць на ложку ўсё ў той жа турэцкай позе Юлін бацька. Ён уважліва разглядае партрэт дачкі: то бліжэй паднясе, то далей адставіць — любуецца.

— Можа, пачытаем? Разам. А? Уголас. Тут жа пакуль што ніякіх сакрэтаў няма. Цікава, што яны пішуць. А? — Тамара проста гарыць ад цікаўнасці, аж млее.

— І так можна здагадацца, якія гэта хлопцы пішуць. Чаго іх там чытаць?! У печку іх усіх, на падпал,— Юрка па-свойму рашае.

— Чаму ж іх на падпал? — спакойна пярэчыць бацька.— Так можна і шчасце сваё спаліць. Там, можа, кампазітар, які піша ці кандыдат у вучоныя, а можа, пісьменнік які сур'ёзны. Навошта ж іх паліць. Тут цяпер не празяваць! Усё жыццё можна ашчасліўціць. Тут, можа, не толькі яе шчасце, а і маё.

— Няўжо табе шчасця мала? Жывеш, як султан, і яшчэ нечага хочацца. Ну што табе яшчэ трэба? Я ўсё, усё дам табе, усё зраблю,— у дзвярах з кухні стаяла Юліна маці. У вачах яе было столькі вернасці, столькі пакорлівасці і рабскай гатоўнасці служыць мужу...

— А што ты мне можаш даць? Усё, што магла, ты зрабіла. І не думай, што султаны — самыя шчаслівыя.

— Самая шчаслівая я! А вы — такія старарэжымныя. У мяне ёсць Юрка, і нікога мне больш не трэба.

Юрка ведае цану такім адкрытым прызнанням Юлі.

— А чаму ж ты замуж за яго не выходзіш? А-а-а? Яго трымаеш пры сабе, на запас, а сама чакаеш — ці не падвернецца які-небудзь лепшы. А? Ці не так?

— Ай, мама! Пры чым тут замуства? Ай, ды ну вас... Юра, прачытай некалькі пісем, прачытай.

Юрка неахвотна ўзяўся за пісьмы. Але калі стаў чытаць, то ўжо так здзекаваўся з аўтараў гэтых пісьмаў,

строіў з іх такіх дурняў, такіх ёлупаў, ахламонаў і шыбздзікаў, што дзяўчаты рагаталі, аж за жываты хапаліся.

— «Я офицер Советской Армии. Находясь в отпуске, познакомился с вами в кино и в журнале на каком-то белорусском языке. Вы мне очень понравились. Вопрос ставлю по-военному просто и ясно: согласны вы стать женой офицерского состава за границей, в Германии? Ответ шлите на почтовый ящик номер...»

Тамара аж залівацца.

— Женой офицерского состава...

А Юрка распячатаў другі канверт.

«Я тоже красивый и просто удивляюсь, почему вы сидите в диревне в то время как в городе у нас вы были бы на расхват и на вичеринки, и на загородние прогулки, и просто так. Приизжайте и я вам гарантирую шикарную жизнь с кем хотите... А адрес мой это адрес моего лучшего друга...»

— Ласкавы які! — шчыра паверыла і пахваліла маці.

А далей ужо Юрка яўна здзекаваўся. Чытаючы наступны ліст, ён рабіў прыпынкі там, дзе яму ўздумаецца, не ў адпаведнасці са знакамі прыпынку. Вядома, атрымлівалася нейкая неверагодзіца:

«Я — чалавек. Сур'ёзна, а вот пішу. Несур'ёзна хачу з вамі пазнаёміцца. Канечне, прыехаць к вам адразу не магу. Так. Як — я не знаю. Ці трэба наогул. Мая прафесія ў калгасе... Я — першакласны муляр».

Дзяўчаты весяліліся.

— Напішы, хай прыедзе,— раіць Юрка.— У нас у пажарнай бочцы шпунта няма. Шпунтам прыстрою.

Тамара, разарваўшы адзін з канвертаў, сама ўзялася чытаць ліст.

«Вы — самая прыгожая дзяўчына. Такую я яшчэ не бачыў. Напішыце мне некалькі слоў. Хай будзе Ваш аўтограф мне на памяць ад самай прыгожай дзяўчыны. Аб іншым не мару. Не думайце, што я такі ўжо несур'ёзны. Я — студэнт політэхнічнага інстытута. Атрымліваю павышаную стыпендыю. Абы-якому дурню яе не даюць. Напішыце абавязкова. Чакаю. Не падвядзіце!»

— А чаму ён «не падвядзіце» — падкрэсліў? А? — здзівілася Тамара.

— Паспрачаўся на бутэльку каньяку з хлопцамі,— разгадаў Юрка.

— Тады трэба напісаць яму. А ў канцы спытаць: «Ну, што? Выйграў?» І падкрэсліць. А? — прапанавала Юля.

— Во здорава! — захапляецца Тамара.

— А тут яшчэ інжынер-электрык... А гэта... Радыётэхнік...

— Уй, глядзіце! Падпяўся! — усклікнула Тамара, выглянуўшы ў акно.— Сам! Старшыня!

Усе кінуліся да акна.

— Нарэшце! — радуецца і Юліна маці.— А схуднеў, бедны. Хвароба не красіць.

— Цэлы месяц качаўся ў пасцелі,— не дзіва.

— Ну-у, цяпер заверціцца ўсё! А то было закісла без яго,— і Юрка радуецца не менш іншых.

На вуліцы старшыню перастрэў дзядок.

— Адпакутаваў?

— Адпакутаваў.

— Але ж уратаваў шэсцьдзесят тысяч?!

— Уратаваў.

— Ну, нічога! На курорт цябе адправім. На цёплыя воды. Заслужыў.

— Думаеш — заслужыў? — хоча ўпэўніцца старшыня.

— Заслужыў, не сумнявайся. Вінца пап'еш там. Слабенькага, бабскага, для здароўя. А то — зблажэў.

— А ты куды гэта столькі пісем?

— Ды во етай... Юлі ўсё пішуць. Кашамі пісьмы з пошты прывозяць. Як напячаталі ў журнале ды ў кіно паказалі... У жаніхі, пэўна, набіваюцца. Зманяць дзеўку. Як піць даць — зманяць. Яны ж, красуні гэтыя, такія: памані салодкім, і пабяжыць. Шчіблеты наваксі, цукерку пакажы — і вядзі яе куды хочаш. А калі яшчэ матацыклет з каляскай, дык... На край света вязі смела. Яны цяпер такія, адчаяныя. Зманяць дзеўку, я так думаю.

— А Юрка?

— Што Юрка? Тут такія, можа... Можа, нават і касманаўт які...

— Яны, дзед, усе жанатыя.

— А ці доўга цяпер разжаніцца?

— Ану, пойдзем, дзед, да яе. Нельга яе адпускаць. Сон такі мне прысніўся. Ніяк нельга!

— Ой! Ідуць! Да нас ідуць,— страпянулася Юліна маці.

— Ну, во, зноў будзе мяне крытыкаваць,— зажурыўся гаспадар.

— Не бойся, не будзе. Я яго папрашу, і ён не будзе,— супакоіла яго жонка.

— Дачушка! Прыбяры са стала.

— Не трэба! Хай бачыць! Хай знае нашых! — запярэчыў бацька.

У хату ўваходзяць старшыня, а за ім нясмела і дзядок.

— Добры дзень вам! — вітаецца старшыня.

— Добры дзень, добры дзень! О-о-й, які ж рэдкі госць да нас... Заходзьце, Уладзімір Апанасавіч, заходзьце! — запела, ну проста запела гаспадыня.— Хадзі і ты, дзед, хадзі, не бойся.

— Ды цябе я не баюся. Я вунь таго баюся, мандарына твайго баюся, пад балдахінам.

— Дачушка! Хуценька! Збегай! Вазьмі там за люстэркам.

— Дзякуй, дзякуй, гаспадынька! Нічога не трэба. Я не магу,— шчыра адмаўляецца старшыня.— Я яшчэ хворы, не магу.

— А гэта якраз на папраўку. Як гэта не магу? Людзі цябе прывеціць хочуць, а ты...— ушчувае дзед.— Дый мне каля цябе... глядзіш во... перападзе кропля якая.

— Ну, хіба што дзеля-радзі твайго інтарэсу...— старшыня вешае свой капялюх на крук, дзе ўжо вісіць ручнік вышываны.

А Юлін ужо і след прастыў. За дружбу і Тамара з ёй.

— Ну, а як жа ты пажываеш, мандарын? — старшыня падсунуў табурэт бліжэй да ложка, на якім застыў, як статуя, гаспадар, падкурчыўшы па-турэцку ногі.

— А ён не мандарын ужо. Ён цяпер у нас султан турэцкі, Аж Гірэй,— гаспадыня і насміхаецца, і любуецца мужам. Адначасова.

— Значыць, у султаны падаўся?

Гаспадар нібы акамянеў. Маўчыць. Не адказвае.

— Ну спізайдзі, уваж хоць словам, уладар,— насміхаецца старшыня.

Гаспадар велічна павярнуў галаву да жонкі.

— Я ж казаў, што ён будзе мяне крытыкаваць,— а ў голасе трымціць сляза.

— Ай, старшыня, не чапай ты яго. Пакрыўдзіцца, яшчэ і заплакаць можа.

— А ты соску яму...

— Не-е, старшыня, ён супакойваецца толькі, як цыцку дасі,— падколвае і дзед.

— Марыя! Ты ж абяцала,— нагадвае жонцы султан.

— Ай, не чапайце яго. Лепей мяне крытыкуйце, колькі вам улезе. А яго...

— А цябе за што? Ты ў нас ударнік камуністычнай працы.

— Ды цябе — грэх. Ты ў нас, як святая,— нахвальвае і дзед.

— Во, бачыце, самі сказалі — камуністычнай працы. Я колькі ўмею, столькі і раблю, на ўсю сілу. А ён не можа, ну і хай сабе. Я за яго зраблю. А што? А ён у мяне для акрасы. А што? Ён жа такі харошы, такі ласкавы. Ён жа ніколі мяне не крыўдзіць. А што з дзівацтвамі, ну дык што? Усякія з ваўны напрыходзілі... А ён такі. Ну і хай сабе. Бачыце, якую дачку выгадавалі? А без яго і звекавацъ адзіночкай.

— Ды мужчына ён, відаць, спраўны,— памеркаваў дзед.

— Добры ён у мяне. Не буяніць, не шуміць, ласкавы.

— Ды ён болей прыкідваецца перад табой,— не давярае старшыня.

— Ну, хай сабе. Калі яму так хочацца. Мне ён харошы. А што каму да яго? Я так скажу, старшыня. Адны купляюць сабе для акрасы — каўняры з лісы, другія — завушніцы ці там браслеткі розныя. А ў мяне ён для акрасы. Ён жа ў мяне як карцінка,— жанчына падышла да мужа і пацалавала, не саромячыся, проста ў губы, ды звонка, сакавіта.— Туга ты мая спрадвечная!

— Што? З'еў, старшыня? Во якая ў мяне баба! — во і паспрабуй тут разабрацца — дзе тут дзівацтва, а дзе што.

— Шчаслівы ты чалавек, брат, султан,— а што мог сказаць старшыня?

Разгарачылася, расчырванелася ад бегу, яшчэ больш пахарашэла Юля. З лёту ставіць на стол дзве бутэлькі віна.

— Ух ты, ластаўка быстрая,— хваліць дзяўчыну дзед.

— Славу займела, Юля. Пішуць? — старшыня кіўком галавы паказаў на кіпу пісем на стале.

— Ану іх! Пішуць,— Юля нібы і сапраўды нездаволена.

— Завуць?

— Адны завуць, а другія абяцаюць самі прыехаць.

— Самі? А хто?

— Ды розныя там.

— Можна глянуць?

— Калі ласка.— дзяўчына ахвотна падсоўвае і распячатаныя і нераспячатаныя канверты.

Старшыня з цікаўнасцю праглядае пісьмы. Адны ён

пагардліва адкідвае ўбок, а другія падкладвае сабе пад локаць.

— Адсюль я цябе нікуды не пушчу. Прывяжу, прыкую. Правільна, Юрка? А сюды хай едуць. Паглядзім. Можа, каторы чаго і варты.

— І сюды не трэба. Нашто яны тут? Хлюсты! Распуснікі! — Юрка нават адвярнуўся да акна.

— Чаму хлюсты? Во, адзін — першакласны муляр, другі — радыётэхнік. Такія могуць спатрэбіцца ў гаспадарцы. Во — яшчэ электрык. Можа, спец па даільных апаратах.

— Ведаем мы гэтых спецаў,— Юрка нават злуецца.

— А ведаеш, Юля? Дай ты мне некалькі пісем. Мы з Юркам з тваіго дазволу некаторым напішам. А? — старшыня, здаецца, не жартуе.

— Ай, ну што вы! Навошта яны тут? — упіраецца дзяўчына.— Лішні мне клопат.

— Можа, для гаспадаркі прыдбаем што. Нашы разбегліся некаторыя. А тут людзі могуць трапіцца з прафесіямі, умельцы.

Дзяўчына глянула на Юрку і неяк нясмела запрапанавала.

— Як хочаце, бярыце... Калі разам з Юркам, то... ну бярыце.

А маці Юлі тым часам ставіла на стол чаркі, падавала відэльцы, скорую закуску...

— А ў кіно вы бачылі, старшыня? Наша Юлька там — ну чыстая арцістка. А вы такі вясёлы там.

— Не, не бачыў.

— І па целявізару паказвалі ж,— пашкадаваў дзед.

— Відаць, без памяці тады ляжаў.

— А Юлька наша, ну проста... Толькі, бессаромная, голая навошта ля ракі? — папракае маці.

— Ды не голая. У купальніку.

— Усё роўна што голая. Я аж вочы заплюшчыла.

— Адно вока заплюшчыла,— паправіў муж.

— Да-а-а,— закрактаў і дзед.— Апецітная дзеўка. Недарма пішуць,— і, глянуўшы на бутэльку, аблізнуўся.

Ужо даўно за поўнач, а старшыня і Юрка пацеюць над пісьмамі. Цяжкавата з непрывычкі пісаць лісты за дзяўчыну. Старшыня дыктуе, а Юрка за пісара.

— Пішы далей. «Абяцаць вам я нічога не абяцаю, а прыедзеце — пазнаёмімся, тады...»

— Не буду так пісаць,— пратэстуе Юрка.

— А як?

— «прыедзеце — пазнаёміцеся з нашым калгасам, і калі спадабаецца...»

— Ну хай сабе так. Хацелася б, канечне, цяплей.

— Не замерзне і так,— Юрка ўсё-такі бывае злы.

— Ну, добра, добра. Канчай па стандарту.

— Ды кладзіцеся вы ўжо спаць! Ты ж пасля хваробы яшчэ не акрыяў,— праяўляе клопат старшыніха.

— Зараз, зараз. Во яшчэ пару пісем, і ўсё.

— Ды ну іх...— Юрка нават кінуў ручку.— Хопіць.

— Не, не, Юрка! Во яшчэ гэтаму. Рэдкая спецыяльнасць, пазарэз трэба... Пішы. Дарагі... як яго? Юра! Якраз цёзка твой! Пішы. Дарагі Юра!

— К чорту! Які ён дарагі? Не буду так пісаць!

— Ну дзівак ты! Не бойся!

— Нічога я не баюся!

— Ну і ўсё.

— Ну і ўсё.

— Яшчэ адно, вось гэтаму. Толькі трошкі ласкавей.

— Ды што гэта вы, Уладзімір Апанасавіч, ды вы ж сур'ёзны чалавек! Маўчаў, маўчаў, а болей не буду. Ды вас жа ў камедыю могуць уставіць. Амаральна гэта!

Старшыня проста разгубіўся ад нечаканасці.

— Стоп! Пачакай!.. Слухай, а яно... відаць, што... Пасля хваробы, брат... Як ты думаеш... Во такі заскок у мазгах можа быць пасля запалення лёгкіх?

— Бывае. Праўда, на ваша шчасце — ненадоўга. Хутка праходзіць...

— Калі праходзіць, то яшчэ не бяда. Ну, добра. Давай-ка я цябе правяду трохі дый сам перад сном дыхну свежым паветрам.

А на вуліцы-ы — вясна ў поўным разгары: салаўі, духмяная квецень, недзе далёка маркотна-лірычная песня. А на небе месяц зззяе, як начышчаны гузік на генеральскім мундзіры.

— А ты малайчына, Юрка. Ты ў мяне як бы намеснік па маралі. А? А ведаеш, я ўстанавіў бы такую пасаду — намеснік па маралі — кожнаму прэзідэнту, прэм'ер-міністру. Дый у нас нават — кожнаму сакратару — райкома, абкома і нават вышэй. Каб напамінаў часам.

— Ну мне вы так сказалі тут, у цемнаце. Гэта нічога. А так не заікайцеся, а то... давядзецца апраўдвацца і каяцца.

Пастаялі, падзівіліся зоркам ясным, хараству ночы вясенняй ды лягушачаму стогну ад любоўнай страсці.

— Не заскок гэта, Юрка... з пісьмамі гэтымі. Клопат у мяне вялікі... ідэя ёсць. Вось мы часам лаем тых, хто разбягаецца з вёскі... Моладзь бяжыць. А падумаўшы? Не, брат, Юрка! Працэс гэты заканамерны... За што іх лаяць? Не любяць зямлю? А чаго там яе любіць? За што? За тое, што яна спрадвеку чалавека цягнула да сябе, гнула, гарбаціла? Што жылы з яго выматвала? Пот і кроў смактала? Карміцелька? Чапуха! Мазоль, чалавечая праца — карміцелі, а не зямля. Не прыкладзі працы, умельства, не дай угнаення — накорміць яна цябе? З'ясі! Абліжашся! Некаторыя рассусольваюць, нават пішуць... Прачытаў надоечы, пакуль хварэў... Шкадуе адзін... Ах, ах, ах... «Эта истинно русская тяга к земле, эта глубочайшая мечта и тоска по ней...» Клікуша! Хай бы успомніў песні народныя... жніўныя песні... Уборка, ураджай, здаецца б, весела пець трэба, а там... столькі гора, столькі тугі, плач, рыданні, а не песні... Гэта ад любові? Не-е, брат... Ты скажаш: а за зямлю, за волю колькі ваявалі. Пугачоў, Сцепька Разін, дзевяцьсот пяты, семнаццаты, грамадзянская вайна... Верна. За зямлю? Не зусім! Пачакай, не спяшайся, дай сказаць... За кавалак хлеба. Каб не пухнуць з голаду. За хлеб. А хлеб расце на зямлі. А зямля была ў паноў ды цароў. Ваявалі за тое, каб не з панскіх рук хлеб свой есці. А цяпер ужо хлеб не праблема. А значыць, і на зямлю цяперашні мужык другімі вачмі глядзіць. Зямля, канечне... Яе ведаць трэба, цаніць трэба, дагледзець... Для таго, каб максімум ад яе ўзяць, меншай працай, а ўзяць болей. Дзе ўчора дзесяць рабіла — сёння адзін павінен справіцца. Во дзе корань! Замест дзесяцёх — адзін! З тэхнікай, вядома. Во той дзядок наш, хоць Маркса і не чытаў, сам дапяў, а сказаў так, што і Маркс падпішацца: «Такі ўжо, брат, спосаб работы пачынаецца». Во!! «Способ производства!» Во як, Юрка! І нам гэта зразумець трэба і не адставаць ад способа «производства», не замінаць яму, а ў ногу крочыць, прыспасабліваццa... да тэхнічнай рэвалюцыі. А калі адзін замест дзесяці, то... трэба, каб ён быў спецыяліст паўнацэнны. Майстар! Інжынер сваёй справы. І галава варыла за дзесяцёх...

— А зарплата?

— І кватэра! І машына! І тэлевізар! І ў кішэні радыётэлефон! Ясна! А мы ж зямлю абрабляем як? Як і сем тысяч год назад. Мала чаго новага. А як мы кіруем? Бе-

гаем адзін за другім, ганяемся на полі... Усё трэба на новыя рэйкі... Я пакуль хварэў — многае перадумаў... Спецыялісты трэба. Тэхпікі. Інжынеры. Во чаму і пісьмы гэтыя...

Юрка слухаў гэтую споведзь старшыні, і ў вачах яго было столькі захаплення, столькі прыязні і спачування, столькі вернасці і прыхільнасці, што, здаецца, скажы яму зараз старшыня — дастаць зорку,— Юрка дастаў бы.

— Уладзімір Апанасавіч! Не пісьмы... Тады ў горад трэба ехаць... Паедзем... І я!.. А?

— А з пісьмамі як? Можа, пашлём? А? Толькі так, для смеху...

— Ну, для смеху можна.

Па вуліцы імчыць трактар. Развясёлы трактарыст усміхаецца — рот да вушэй. Куры — нібы пырскі — шарахаюцца з-пад машыны. Смяецца трактарыст, спявае. Заўважыў наперадзе старшыню і брыгадзіра, прыбавіў хуткасці, дагнаў іх, рэзка затармазіў і стаў як укопаны.

— Ты чаго за курамі па трактары ганяешся? — напусціўся старшыня на ліхога трактарыста.

— Я не за курамі. Дазвольце далажыць? Я за брыгадзірам,— трактарыст узяў «пад казырок», у яго яшчэ не выветрылася армейская хватка.

— А чаго за мной ганяцца?

— Дазвольце далажыць! На шостым полі культывацыю закончыў.

— Закончыў?

— Закончыў.

— А чаго ты машыну сюды прыгнаў?

— Не ведаю, што далей рабіць. Давайце распараджэнне.

— На суседняе поле трэба... А ты шэсць кіламетраў машыну гнаў... Эх, ты-ы...— абурыўся брыгадзір.

— Тэк-с-тэк-с-тэк-с...— старшыня сярдзіта змерыў брыгадзіра з ног да галавы.— Значыць, прагуляначкі на трактары? Па дванаццаць кіламетраў?

— А я адкуль ведаў? Мне ж не сказалі,— апраўдваўся трактарыст. Дзе падзявалася яго весялосць?

— Прагулянанкі не за кошт калгаса,— грозіць старшыня.

— Ну, а што мне? Сядзець на полі? Пастаўце мне, як у арміі на танку, рацыю... Тады...

— Можа, тэлевізар яшчэ? — паабяцаў старшыня. Брыгадзіру не падабаецца такое нахабства трактарыста.

— Я табе пастаўлю рацыю,— паабяцаў старшыня.

Трактарыст так і не зразумеў — ці то пагроза, ці то сапраўды абяцанне. Ён толькі пацісну ў плячыма.

— Распарадзіся! — загадаў брыгадзіру старшыня і пайшоў.

Насустрач амаль бяжыць замурзаны, запэцканы механізатар. І твар, і рукі, і камбінезон у плямах.

— Стой, стой, стой! — спыняе яго старшыня.— Адкуль ты? Хто ты?

— Ды гэта... гэта я, таварыш старшыня, Аркадзь я,— шафёр здагадаўся, што старшыня не пазнае яго, мурзатага. Ён выціраецца і яшчэ больш размазвае па твары мазут.

— Што ты людзей палохаеш? Што ты... Дзеці вунь заікацца будуць...— ушчувае старшыня.

— Ат, толькі б тае бяды... Таварыш старшыня, можа, вы бачылі кладаўшчыка ці механіка галоўнага? Во, дробязь, клапан ад бензанасоса,— шафёр паказвае невялічкую дэтальку,— а машына паўдня стаіць. Тры кіламетры не даехаў. Паўдня бегаю, шукаю іх. Старшыня моўчкі глядзіць у вочы шафёру і думае аб нечым сваім. Потым, нічога не сказаўшы, рашуча накіраваўся да канторы.

Пасяджэнне праўлення калгаса. Усе сур'ёзныя, слухаюць. Грыміць старшыня — ну чысты пярун. А ў вачах маланкі бліскаюць.

— Дзе кладаўшчык? Дзе механік? Няма! Паўдня шафёр бегае, шукае, паўдня машына стаіць на абочыне. У нас трыццаць шэсць аўтамашын, сорак трактароў, дваццаць два камбайны. Што мы ведаем пра іх? Нарад далі, і клопат увесь. А можа, непаладкі якія, можа, дробязь якая, цьфу — гайка, і машына стаіць. Ці на ферме. З каровай што... Дзе ветэрынар? Шукай, бегай. Дзе аграном? Дзе брыгадзір? Дзе бухгалтар? Дзе старшыня? Тэрмінова трэба.

— Відаць, рана ён падняўся пасля хваробы. Трызніць...— пехта злосна пажартаваў,— сябе шукае.

— Так! Шукаю! Каб аператыўна кіраваць, трэба кожную хвіліну ведаць, дзе хто і што робіць. На поўную катушку выкарыстоўваць тэхніку — трэба ведаць, дзе яна, што з ёй, дзе яна зараз больш патрэбна. Ці не стаіць дарэмна. Трэба сувязь, сувязь, сувязь між намі. А то чорт ведае што! Цэлыя брыгады лётаюць на спутніках вакол

зямлі, да месяца дабіраемся, навучыліся па такой адлегласці пульс вымяраць, тэмпературу, дыханне... А мы тут сядзім і чакаем, пакуль хто падкажа. Самі не дагадаемся. Вам ясна — што нам трэба? Мне ясна! Горад нас павінен выручыць!

Перадсвяточны горад: цераз вуліцу наразвешаны гірлянды і яркія арнаменты з рознакаляровых лямпачак, сцяжкі, вымпелы, па баках на слупках — партрэты герояў. І людзі крыху ўзрушаныя, клапатлівыя, адны некуды спяшаюцца, а другім і спяшацца не трэба — яны ўжо з учарашняга дня гатовы святкаваць.

У парку таксама разнастайнасць: прабегла стайка дзяўчатак; а вось павольна снуе тройка пенсіянераў і, як звычайна, абмяркоўваюць сусветнай важнасці палітычныя справы:

— Што дэ Голь? Дэ Голь гэта... Тут, брат...

— Насер — завадатар... Пачакай, Насер яшчэ сябе...

— Канечне, Ізраіль... А куды Ізраілю...

— Што Ізраіль? Ізраіль — цьфу і расцёр. Тут, брат, Амерыка... Без Пентагона Ізраіль — на трэсачку і выкінуў...

Сустракаюцца маладыя, адны развітваюцца, другія знаёмяцца, недзе спяваюць, а тут ужо вядуць пад ручкі п'яненькага,— ён прызнаецца ў любві міліцыянеру. А язык заплятаецца.

— Я чаму люблю вашага брата? Таму, што вы... ніколі не пакідаеце мяне ў бядзе. Вот часам ну так набяруся, а... яшчэ ні разу не начаваў пад плотам. Абавязкова... культурна вось так... падбіраеце і... Ну як жа вас не любіць. Давай я цябе пацалую. Ну, у губкі твае алыя... Ад душы пацалую,— і п'яны ад паўнаты і шчырасці пачуццяў аж заплакаў.

Але міліцыянер аказаўся «жеманный». Ён манерна адхіляе такую асалоду.

— Не, мы лепей гэта на мясцкоме зробім. Пасля...

На лавачцы сядзіць Іван Швед з новым — гарадскім — сябруком. Абое пасмейваюцца з п'яненькага. І раптам Іван насцярожыўся, штурхае пад бок сябрука.

— Глядзі, глядзі, якая! — Іван у захапленні.

— Ну і ідзі знаёмся... Толькі смялей!

— А што я ёй скажу?

А дзяўчына ўжо параўнялася з імі. І тут ініцыятыву бярэ сябрук Іванаў.

— Выбачайце, чарнавокая! Вы згубілі нешта. Азірніцеся!

Дзяўчына і праўда азірнулася.

— Я нічога не згубіла,— дзяўчына ўсміхаецца.

— Як нічога? — усур'ёз настойвае Іванаў таварыш.— А гэта?

Сябра паказвае на Івана. Дзяўчына ўважліва разглядае знаходку.

— Хай паляжыць тут. А буду ісці назад, падбяру... Калі ніхто не возьме,— дзяўчына адбрыла і пайшла.

А хлопцы ўздыхнулі і зноў цікуюць.

— Ну, можа, з тымі пазнаёмімся?

— Не-е,— паморшчыўся Іван.— Гэта, відаць, якая-небудзь генеральская дачка. Такая нам не па кішэні.

— Наадварот! — сябрук быццам бы і сапраўды меў справу з генеральскімі дочкамі.

— Ану іх...— адмахнуўся Іван.

— Не-е,— сябрук не адступае,— давай, пачынай.

І калі хлопцы сустрэліся з дзяўчатамі, Іван усё-ткі зачапіў іх. Хоць бы прыдумаў што-небудзь новае, а то...

— Дзяўчаткі! Вы азірніцеся! Вы нешта згубілі.

Дзяўчаты нават не азірнуліся. Бітыя, відаць.

— А калі вы такія джэнтльмены, то падніміце і падайце.

Іван напачатку разгубіўся, але ненадоўга.

— Як жа я яго падніму, калі ён бачыце які...— Іван паказаў на сябра.

— Ах, дык гэта мы яго выранілі?

— І мяне,— дадае Іван.

— І цябе?

— Ну, вядома. Мы ж разам.

— Дык вось што, мілыя. Мы вас не згубілі і не выранілі. Мы выкінулі. А прыбіральшчыцы прыйдуць і падмятуць. Каб у парку чыста было.

Хлопцы ад нечаканасці аж за вушы ўхапіліся. А дзяўчаты адбрылі і пайшлі сабе.

— Во даюць! Ну і даюць!

— Я ж казаў,— спахмурнеў Іван.

— Брыгадным метадам тут, брат, нічога не зробіш. Трэба індывідуальна. Будзь! — хлопец адсалютаваў і, наметаўшы новую цэль, рушыў у наступ. Іван астаўся адзін. Невясёлы, хмуры, кіслы... Калі ён узняў галаву, міма праішлі ўжо дзве дзяўчыны. Ды такія фігурыстыя, а спаднічкі кароценькія, а ножкі стройненькія, а прычоскі...

Ідуць не спяшаючыся, паволыпа, нібы чакаючы, каб пехта зачапіў ці дагнаў. А мо спатканне ўжо прызначана, і ім нечага спяшацца... Ну во — адна глянула на гадзіннік і азірнулася па баках. І тут жа ажывілася: з горкі наперарэз бег хлапец з ухмылкай да вушэй. Дзяўчына з такім вінаватым выглядам пакідала сяброўку, нібы і сапраўды яна ў нечым правінавацілася.

— Не крыўдуй, мы ўжо і так позпімся,— і пабегла насустрач хлопцу. Той схапіў дзяўчыну за руку, і яны некуды пабеглі. Пэўна, у кіно, на карціну «Чакай мяне, Ганна».

Іван назіраў усю гэтую сцэнку. Ён рашуча ўстае з лаўкі і накіроўваецца да дзяўчыны: эх, была — не была! Дагнаўшы яе, Іван далікатна загаварыў з ёй:

— Вас пакінула сяброўка, і я астаўся адзін...

Дзяўчына прыцішыла хаду, амаль спынілася, але не аглядваецца. Насцярожылася, нават крыху ўтуліла галоўку ў плечы. Яна не ўпэўнена, што звяртаюцца да яе.

— Давайце будзем маркоціцца разам,— прапанаваў Іван. Дзяўчына неяк вельмі запаволена павярнула галаву, і, сустрэўшыся позіркамі, абое бадай што ахнулі. Гэта была Каця. Ну, тая дзяўчына, што ў саломе... На гумне. Ну, тая, што гэты ж Іван і абняславіў яе. Па вачах дзяўчыны можна было заўважыць, што ў душы яе цэлы каскад пачуццяў: ад насцярожанасці да здзіўлення, збянтэжанасці, а потым да лёгкай няпэўнай ветлівасці і нарэшце шчырай прыхільнасці і нават радасці.

— Іван...— ці то дзяўчына спалохалася, ці не паверыла сваім вачам.

— Ка-а-ця-я? — апешыў Іван.

— Ну,— неяк вінавата кіўнула галавой дзяўчына.

Хлопец вельмі збянтэжыўся, ну проста апупеў.

— А... ты... што?.. Тут...— не ведае Іван, што сказаць.

— Ну. На радыёзаводзе. А ты... Ты куды?

— Я? Я... Я нікуды.

— І я нікуды.

Стаяць адно супраць аднаго — вінаватыя, разгубленыя, баяцца нават позіркамі стрэцца. Нарэшце Іван наважыўся загаварыць аб галоўным.

— Ты, канечне, злая на мяне. Ты даруй. Дурны быў.

— Ну, канечне,— дурны,— ахвотна згаджаецца дзяўчына.

— Ляпнуў, не падумаўшы.

— Канечне, падумаўшы, не ляпнуў бы.

— А словы — не верабей...

— Каб не верабеї. А то...
— Па дурасці ўсё... а цяпер няёмка.
— Канечне, няёмка.
— Дык ты ўжо не злуйся.
— А чаго тут злавацца, калі па дурасці?
І Іван зразумеў, што дзяўчына даравала яму.
— Ну, здраствуй! — Іван падае дзяўчыне руку, тая ахвотна вітаецца.
— Здраствуй!
— А ты, можа, куды?
— Не, я нікуды.
— І я нікуды. То, можа, у кіно? А? Там наш калгас паказваюць.
— Можна і ў кіно. Я ўжо разоў чатыры глядзела.
— І я — можа, шэсць разоў. Пойдзем. Усё роўна як у гасцях пабываем... Дома пабываем.
— І праўда. Паглядзіш, а потым аж пад ложачкай смокча.

Насустрач ідзе дзяўчына і на хаду цалуецца з хлопцам. (Гэта тая самая, што Іван прыняў за генеральскую дачку.) Каця аж аслупянела, спынілася.
— Яна ж жанатая! Во гадаўка! — абурылася Каця.
— Во гэтая, генеральская?
— Якая генеральская? Яна з нашай брыгады. І муж у яе харошы. Сёння, відаць, у другой змене.
— Дык гэта ты яго падабрала, Кацюша? А то валяўся такі кавалак. А ён нічога сабе: правады можна вешаць,— і грэшніца засмяялася разам са сваім хлюстам.— Кацюша! Ты толькі глядзі,— і яна пагразіла пальчыкам Каці.
— Усё роўна раскажу мужу, як ты тут цалуешся.
— А ён не паверыць табе, ён у мяне такі! — упэўнена заявіла верціхвостка і зарагатала.
Разышліся.
— Во паразітка! — не перастае здзіўляцца Каця.

І яны пайшлі. У кіно. Панірыўшыся. Знайшлі нарэшце адно аднаго. Не дома, не ў вёсцы, а ў горадзе. А? Во як бывае.

Зала кінатэатра. На экране кадры кінанарыса пра калгас «Маяк». *(Дарэчы, сцэнарый кінанарыса давядзецца распрацаваць больш падрабязна потым. Але вельмі неабходна, каб нарыс атрымаўся звычайны, якія мы бачым на нашых экранах, так сказаць — банальны. Але ў ім будуць і іграўыя кадры, знаёмыя нам з папярэдняга матэрыялу.*

*Праўда, некаторыя кадры будуць пададзены ў зmененай інтэрпрэтацыі.)*

У зале старшыня — Уладзімір Апанасавіч. Поруч наш кінааператар. Яны перашэптваюцца:

— А чаму пра дарогі няма? А?

— Паўлёнак выкінуў. Наш начальнік.

— Чаму?

— Мы вам далі другія словы. А ён кажа: фальсіфікацыі не дапушчу. Па губах бачу — ён жа не тое гаворыць, па артыкуляцыі. Не даў.

— Бач ты! Па губах разумее. Ён што? З глуханямымі працаваў?

— І цяпер працуе,— бог яго ведае, што меў на ўвазе кінааператар.

— Цішэй вы! — сусед у старшыні аказаўся сур'ёзны.

А непадалёку сядзелі Іван і Каця. І хоць глядзелі яны на экран, але ўвага іх была там, дзе перапляліся пальцамі іх рукі. І радасна ім было, вельмі радасна. І ад таго, што на экране была іх вёска, такая прыгожая, мілая, свая родная, і знаёмыя людзі, таксама свае, блізкія, родныя, і ад таго, што рукі іх былі ўзаемпаласкавымі.

*(Канец І серыі)*

*1969*

# КАМЕНТАРЫІ

У трэці том Збору твораў Андрэя Макаёнка ўвайшлі кінасцэнарыі. Арыгінальныя («Твой хлеб», «У адзінай сям'і», «Кандрат Крапіва», «Большая опасность», «Не пакінеш мяне»); напісаныя на аснове ўласных («Рогатый бастион») і чужых («Счастье надо беречь», «После ярмарки») твораў. З іх толькі сцэнарый «Твой хлеб» друкаваўся пры жыцці аўтара. Здымаліся таксама не ўсе: «У адзінай сям'і», «Счастье надо беречь», «Кандрат Крапіва», «Рогатый бастион» і «После ярмарки».

Узаемаадносіны Андрэя Макаёнка з беларускім кінематографам складваліся надзвычай драматычна. Яшчэ ў юнацтве, як вядома, ён быў неабыякавы да яго, пра што сведчыць спроба ў 1938 годзе паступіць у Маскоўскі інстытут кінематаграфіі. Спроба, праўда, аказалася няўдачнай. І хоць сам пісьменнік пра яе расказваў заўсёды з гумарам, тым не менш адчувалася, што горыч ад няўдачы нават з гадамі цалкам не страцілася. Тым больш што і пазнейшыя яго кантакты з кіно не надта адрозніваліся ад папярэдняга. У гэтым градацыйна-лагічным радзе спробу паступіць у інстытут кінематаграфіі можна ўмоўна разглядаць як заляцанне. А былі яшчэ залёты, заручыны і, нарэшце, кароткатэрміновы шлюб. Маецца на ўвазе горка-кур'ёзны выпадак з уладкаваннем А. Макаёнка на пасаду начальніка сцэнарнага аддзела кінастудыі «Беларусьфільм» у сакавіку 1956 года. Не паспеў яшчэ з'явіцца загад аб яго назначэнні, а ўжо на імя міністра культуры БССР Р. Я. Кісялёва паляцела адчайнае пісьмо драматурга з просьбай аб адстаўцы. Гэта не быў звычайны дэмарш, прычыны пратэсту мелі глыбокія і прынцыповыя вытокі. Максім Лужанін прыгадвае:

«Папраўляю даведнікі: успамінаюцца Макаёнкавы сцэнарыі, а штатную работу на кінастудыі абмінаюць. Незаслужана. Ён быў начальнікам сцэнарнага аддзела, праўда, усяго адзін дзень. Разышоўся ў поглядах і пайшоў. Чакалі, чакалі — дарма, не вярнуўся. Не захацеў крывіць мастацкім сумленнем, так і растлумачыў сваю адстаўку» («Неман», 1986, № 1, с. 132).

Калі перавесці гэтае сведчанне на мову канкрэтыкі, то здарылася наступнае. Калегія Міністэрства культуры БССР зацвердзіла запуск у вытворчасць кінасцэнарый «Высокая пасада», які быў напісаны аператарам Гінцбургам. Зацвердзіла насуперак думцы сцэнарнага аддзела. А. Макаёнка ўзбурыла не столькі тое, што сцэнарый прымаўся недапрацаваным (у ім адсутнічалі скраз-

ное дзеянне, цэласныя праўдзівыя характары, логіка паводзін персанажаў і г. д.). Усё гэта агульнымі намаганнямі можна было направіць. Адмовіўшыся ад пасады кіраўніка сцэнарнага аддзела, драматург усё ж не парваў сувязей з кінастудыяй і як член рэдакцыйнай калегіі неаднойчы кідаўся ратаваць сыраватыя сцэнарыі, у якіх заключаўся хоць нейкі намёк на мастацкае адкрыццё. Пра гэта таксама ўспамінае Максім Лужанін:

«Адхіліць сцэнарый — няма нічога лягчэй. А вось разгледзець у ім нешта сваё, сапраўднае, знайсці цікавае зерне, з чаго можа вырасці фільм, не так проста. Макаёнак быў майстар на падтрымку, не горшы за Аркадзя Куляшова, які заўсёды пяньчыўся, вылузваючы з пялёнак чарговае кінадзіця. Памыляліся яны абодва рэдка: без промаху цалялі ў кожную, хай невялікую фальшывінку і бязлітасна адсоўвалі драматургічна граматнае, але «сераднянцкае» варыва» («Неман», 1986, № 1, с. 132).

У выпадку з «Высокай пасадай» усё было нашмат складаней. Сцэнарый не дацягваў нават да сярэдняга ўзроўню, пра што з абсалютнай пэўнасцю, нават катэгарычнасцю і заявіў Андрэй Макаёнак. У пісьме да міністра і на пасяджэннях калегіі ён назваў сцэнарый Гінбурга «нядобрасумленнай работай», у якой аўтар, спекулюючы на важнай і патрэбнай тэме, прапанаваў сумбурны матэрыял без якой-небудзь ідэйна-мастацкай каштоўнасці. Зрэшты, не адны толькі слабасці сцэнарыя вывелі Макаёнка з раўнавагі. Яго трывожылі самі парадкі, якія скаладіся на кінастудыі і вакол яе.

«Вымушае мяне,— пісаў ён міністру,— прасіць так званай «адстаўкі» і яшчэ адзін факт. Пры абмеркаванні сцэнарыя на калегіі выступаў намеснік міністра т. Садковіч. Мяне здзівіла тое, што ён так хваліў гэту цалкам прымітыўную і некваліфікаваную работу. Маючы на ўвазе, што т. Садковіч вопытны літаратар, які напісаў ужо не адну кнігу, валодае дастатковым густам і ўпаўне разбіраецца ў літаратурных творах, я лічу, што пры ацэнцы сцэнарыя Гінцбурга ён безумоўна кіраваўся прыяцельскімі інтарэсамі, а зусім не ідэйна-мастацкімі вартасцямі сцэнарыя, якія там і не начавалі. Бачачы такую беспрынцыповасць з боку кіраўніка, які займаецца пытаннямі кінематаграфіі, я абсалютна не жадаю ісці працаваць на студыю, дзе я па абавязку службы абавязаны быў бы выслухоўваць і выконваць кіраўнічыя ўказанні гэтага таварыша... У сувязі з гэтым здаецца дзіўным той факт, што студыя не без уплыву т. Садковіча адвергнула і забракавала сцэнарый пісьменніка Івана Шамякіна на калгасную тэму, матывуючы, што ў сцэнарыі расказваецца пра падзеі і жыццё ў калгаснай вёсцы да верасцёўскага Пленума ЦК КПСС 1953 года. А сцэнарый Гінцбурга закранае гэту тэму толькі да аб'яднання калгасаў і чамусьці прымаецца, зацвярджаецца і запускаецца ў вытворчасць, хоць напісаны ён, безумоўна, беспапаможна. Апрача таго, нельга не заўважыць і таго, што за пасляваенныя гады многія пісьменнікі Беларусі спрабавалі напісаць сцэнарыі для студыі «Беларусьфільм», аднак спробы пісьменнікаў Лынькова, Крапівы (акрамя экранізацыі спектакляў), Віткі, Губаревіча, Кулакоўскага, Шамякіна, Васілеўскага і іншых аказаліся марнымі. Чым усё гэта растлумачыць? Які начальнік сцэнарнага аддзела пасля ўсяго гэтага здолее прыцягнуць пісьменнікаў да напісання сцэнарыяў?» (Цытуецца па машынапісе пісьма).

Драматург быў надзвычайна ўрушаны, занепакоены тым ста-

навінчам, якое склалася на кінастудыі «Беларусьфільм». Магутную па ідэалагічных магчымасцях установу некаторыя спрытнюгі паспрабавалі ператварыць у прыватную лавачку. Менавіта таму ён не абмежаваўся пісьмом міністру культуры, а яшчэ і ў газеце «Літаратура і мастацтва» выступіў з артыкулам «Аб адным сцэнарыі і яго рэдактарах». З'едліва раскрытыкаваўшы мастацкія «вартасці» сцэнарыя «Высокая пасада», закрануў і праблему рэдагавання на кінастудыі. Рэдагаваў кінасцэнарый А. Кучар. Зрэшты, аўтар артыкула аргументавана даказаў, што рэдактарскай работы ў поўным сэнсе не было, а былі толькі замены рускіх слоў на беларускія — для надання фільму нацыянальнага каларыту. Па-за ўвагай рэдактара засталіся сур'ёзнейшыя мастацкія і ідэйныя пралікі сцэнарыя. Роўна праз дзесяць год — у маі 1966 года А. Макаёнак на V з'ездзе пісьменнікаў БССР зноў з той жа заклапочанасцю будзе гаварыць пра стан беларускага кінематографа. Адзначыўшы некаторыя пазітыўныя зрухі (пазіцыі беларускіх пісьменнікаў умацаваліся, у выніку чаго публіка змагла пазнаёміцца з многімі цікавымі фільмамі, знятымі па іх сцэнарыях: «Дзяўчынка шукае бацьку» і «Пушчык едзе ў Прагу» К. Губарэвіча, «Крыніцы» І. Шамякіна, «Трэцяя ракета» і «Альпійская балада» В. Быкава і інш.), дакладчык канстатаваў усё тыя ж не вельмі зразумелыя, далёкія ад прынцыповых арганізацыйна-творчыя ўзаемаадносіны на кінастудыі «Беларусьфільм». Слаба растуць нацыянальныя кадры рэжысёраў, па-ранейшаму кепска праходзіць адбор сцэнарыяў. Камітэт па справах кінематаграфіі пры Савеце Міністраў СССР навязаў «Беларусьфільму» некалькі відавочна слабых сцэнарыяў, а «Не той гонар» І. Шамякіна, «Сярэбраныя дарогі» Я. Васілёнка, «Галя» Я. Брыля, «Залатыя россыпы» М. Матукоўскага так і не трапілі ў вытворчасць. Механізм «прасоўвання» сцэнарыяў усё яшчэ застаецца таемным.

Як і дзесяць год назад А. Макаёнак зноў рэзка крытыкаваў А. Кучара. На гэты раз не як рэдактара, а як сцэнарыста. Аб'ектам крытыкі стаў сцэнарый «Усходні калідор», але гаворка вялася шырэй, на метадалагічным узроўні.

«Апошнія гады,— гаварыў дакладчык,— А. Кучар распрацоўвае ў кіно гераічную тэму з гісторыі беларускага народа. Намер высакародны, пахвальны. Але якія ж вынікі?

У свой час А. Кучар падаў заяўку на напісанне сцэнарыя аб гераіні беларускага народа Веры Харужай. Добры намер кінастудыя з энтузіязмам падхапіла. Умову падпісалі — весяліліся, фільм паглядзелі — праслязіліся. Аўтар, скарыстаўшы некаторыя факты з біяграфіі гераіні, дапоўніў сюжэт пікантнымі сцэнамі, а Вера Харужая, яе подзвіг, яе імя з фільма зніклі.

Прайшоў некаторы час, і А. Кучар, на гэты раз ужо з Вінаградавым, ізноў падаў заяўку на сцэнарый аб героях-падпольшчыках горада Мінска ў часы фашысцкай акупацыі. Увесь свет ведае аб гераізме нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны! І сябры, і ворагі прызналі, што Беларусь была краінай класічнага партызанскага руху.

А хто яны, тыя героі? Як іх завуць? Імёны іх? Сцёрты іх імёны ў сцэнарыі! Не названы. Скарыстаны толькі эпізоды з жыцця герояў, іх гераічныя подзвігі.

Чэснае, праўдзівае мастацтва павінна называць іх імёны, народ хоча іх ведаць, моладзі вельмі важна іх ведаць.

Гэтыя людзі смерцю сваёй, крывёю сваёй, пакутамі страш-

нымі ў фашысцкіх засценках, мукамі сваімі, бессмяротнымі подзвігамі сваімі, гарачай любоўю да радзімы заваявалі сабе права на славу!

А ў нас жа былі свае Чапаевы, Шчорсы, Катоўскія, Матросавы, Зоі Касмадзям'янскія!

Навошта ж абкрадваць гераічную гісторыю беларускага народа? Гэта надзвычайная, недаравальная несправядлівасць з боку А. Кучара да людзей, якія крывёю сваёю ўпісалі слаўную старонку ў гісторыю Савецкай Беларусі.

Недаравальна на гэты раз таму, што з удзелам А. Кучара гэта ўжо чацвёрты фільм аб нашых героях, і ўсе яны зроблены па такому прынцыпу: сцерці імя» (Макаёнак Андрэй. Выбраныя творы: У двух тамах, т. 2, Мн., 1980, с. 356—357).

Аб праблемах беларускага кіно драматург гаварыў заўсёды горача, зацікаўлена, выкарыстоўваючы любую нагоду. Чалавек актыўнай грамадзянскай пазіцыі, ён не мог не разумець, якія выдатныя прапагандысцкія, выхаваўчыя магчымасці заключае ў сабе кіно, таму не пераставаў турбавацца аб паляпшэнні творчай атмасферы на студыі «Беларусьфільм». У апошнія гады свайго жыцця А. Макаёнак непакоіўся аб стварэнні беларускім кінематографам нацыянальнайЛенініяны. П'еса пра гэтага вялікага чалавека была ў яго бліжэйшых планах. Не супраць быў ён і напісання кінасцэнарыя, бо ведаў, што кіно мае свае перавагі нават перад тэатрам. Будучы ў Амерыцы, драматург паглядзеў фільм пра Ісуса Хрыста, на які пастаноўшчыкі не паскупіліся 60 мільёнаў долараў, запрасіўшы выдатных акцёраў.

«Прыкладзена максімум намаганняў,— пісаў А. Макаёнак,— каб стварыць мастацка-пераконаўчы фільм, у аснове якога рэакцыйная ідэя — найвялікшая дабрачыннасць — цярплівасць, непрацiўленне. Дзесяткі вякоў прапаведуецца ў народных масах гэта ідэя, убіваецца ў галовы подкупам, ашуканствам, запалохваннем пеклам, карамі, кастрамі, катаваннямі і нават фільмамі.

Каб прыкрыць бесчалавечную эксплуатацыю чалавека, вякамі ахмураюць працоўнага чалавека негатыўнымі запаведзямі: «не ўбій, не ўкрадзі, не пожелай добра бліжнего, ни жены его, ни осла его» і таму падобныя. І ў той жа час забіваюць, грабяць, бамбяць і бліжняга і дальняга.

Але прыйшоў чалавек, сапраўдны месія, Ленін, і для яго запаведзяў, простых, ясных, пазітыўных: «Мір народам, хлеб галодным, зямля сялянам, уся ўлада рабочым» — даволі было і 50 гадоў, каб авалодаць масамі на ўсіх кантынентах нашай планеты. Яго ідэі сталі неперамо;жнай матэрыяльнай сілай.

Вось аб гэтым месіі мы павінны стварыць фільм, спектакль, аддаць гэтаму лепшыя хвіліны свайго натхнення, сваё сэрца, шчырасць пачуццяў, сілу праўды, свой талент, каб увасобіць гэту велічную фігуру ці то ў вобразе самога Ільіча, ці ў вобразе мускулістага, мудрага, справядлівага, усемагутнага пралетарыя, селяніна» (Макаёнак Андрэй. Выбраныя творы, т. 2, с. 363).

У асобе А. Макаёнка беларускія акцёры (пра што сведчаць шматлікія яго выступленні ў перыядычным друку, на нарадах у Міністэрстве культуры і г. д.) мелі самага заўзятага абаронцу і прыхільніка. Драматург паслядоўна выступаў за тое, каб студыя «Беларусьфільм» толькі ў крайніх выпадках звярталася да паслуг «прывазных» кіназорак: акцёрскі корпус рэспублікі дастаткова вялікі і кваліфікаваны, каб вылучыць са сваіх шэрагаў

выканаўцу любой ролі. На жаль, яму не заўсёды ўдавалася пераканаць рэжысёраў. Нават тых фільмаў, якія здымаліся па яго сцэнарыях.

У сваёй творчасці для кіно А. Макаёнак прытрымліваўся тых жа мастацкіх прынцыпаў, якія выспаведваў і ў драматургіі. Папершае, пастаноўка ў цэнтр твора значнай сацыяльнай праблемы. Па-другое, праблема гэта павінна мець актуальны характар. Патрэцяе, твор павінен не пацяшаць, а працаваць на прагрэс, на лепшае заўтра.

## ТВОЙ ХЛЕБ (с. 7—55)

Сцэнарый «Твой хлеб» А. Макаёнак завяршыў у студзені 1954 года. Гэта была першая яго спроба непасрэднага супрацоўніцтва з кіно. І калі драматург на V з'ездзе Саюза пісьменнікаў БССР крытыкаваў кінастудыю «Беларусьфільм» за няўвагу да творчасці беларускіх аўтараў, то зыходзіў і са свайго ўласнага вопыту. За доўгія месяцы вандравання сцэнарыя з кабінета ў кабінет, з адной шуфляды ў другую аўтару ніхто нічога пэўнага так і не сказаў. Сцэнарый, маўляў, добры, але не знаходзіцца рэжысёра, які загарэўся б яго паставіць. Пісьменнік і сам не лічыў сцэнарый слабым, пра гэта сведчыць хоць бы тое, што «Твой хлеб» адзін з усіх сцэнарыяў быў уключаны ім у двухтомныя «Выбраныя творы». І калі б аўтар праявіў крыху больш настойлівасці, то, магчыма, здолеў бы прабіць сцяну адчужанасці. Аднак на настойлівасць проста не хапіла часу, які цалкам выдаткоўваўся на пастановачныя клопаты сатырычнай камедыі «Выбачайце, калі ласка!». П'еса шырока пайшла па тэатрах Савецкага Саюза, і маладому драматургу даводзілася кансультаваць рэжысёраў з братніх рэспублік, ездзіць на прэм'еры і г. д.

Кола праблем, якія асэнсоўваюцца ў сцэнарыі, традыцыйнае для творчасці А. Макаёнка. Чалавек на зямлі, адносіны да асабістага і грамадскага, сацыяльныя вытокі прагрэсу і «анатомія» рэгрэсіўных з'яў... І нязменная зацікаўленасць лёсам простага працаўніка. Сцэнарый «Твой хлеб» — яскравы аргумент у спрэчцы аб некаторых светапоглядных аспектах творчасці А. Макаёнка. Па выхадзе камедыі «Лявоніха на арбіце» за драматургам пачала замацоўвацца слава праціўніка ўсякай асабістай уласнасці ў сённяшняй калгасна-саўгаснай вёсцы. І зачэпкі нібыта для такой славы былі: вунь як раскрытыкаваны Лявон Чмых за сваю прыхільнасць да ўласных кароўкі, курак, свінак ды прысядзібных сотак! Пра беспадстаўнасць падобнага абвінавачвання пісалася ўжо неаднойчы (падрабязней гл. пра гэта: Макаёнак Андрэй. Збор твораў: У пяці тамах. Т. І, Мн., 1987, с. 356—360). Не паўтараючы сказанага, варта ўсё ж зазначыць: рэзка крытыкавалі Лявона, не менш рэзка крытыкаваў і ён. І ні з чаго не вынікае, што аўтарскія сімпатыі на баку апанентаў Лявона. Што ж датычыцца сцэнарыя «Твой хлеб», то гэтыя сімпатыі яўна не на баку старшыні калгаса Цеслі, які рабіў усё магчымае і немагчымае, каб звесці нанішто асабістую ўласнасць калгаснікаў. І гэта не дзіўна: А. Макаёнак не толькі добра ведаў сельскую рэчаіснасць, але абвострана рэагаваў на кожную акцыю, якая ўшчамляла інтарэсы калгасніка. Вось і ў сцэнарыі «Твой хлеб» кожная рэпліка, кожны паварот думкі скіраваны супраць няўмек і дэма-

гогаў, якія перашкаджалі сапраўдным сельскім працаўнікам адчуць сябе гаспадарамі зямлі. Нават у практычным плане многія вывады, якія вынікаюць з развіцця сюжэта (аб матэрыяльным стымуляванні вытворчасці, актывізацыі працоўнай самадзейнасці і г. д.), не згубілі сваёй актуальнасці і сёння. Сцэнарый не згубіў цікавасць і ў чыста мастацкім плане: зграбна выбудаваны сюжэт, многія сітуацыі драматургічна распрацаваны вельмі дасканала, дзеянне развіваецца дынамічна, імкліва... Да таго ж большасць персанажаў абмалявана на добрым прафесіянальным узроўні. І хоць «Твой хлеб» не стаў фактам кінематаграфіі, але ў творчай біяграфіі А. Макаёнка яму належыць не апошняе месца.

## У АДЗІНАЙ СЯМ'І (с. 56—62)

Дакументальна-хранікальны фільм «У адзінай сям'і» быў прымеркаваны да саракагоддзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. А. Макаёнак ахвотна ўзяўся за напісанне сцэнарыя, хоць асаблівага разгарнення творчай фантазіі яно і не давала. Драматурга прывабіла магчымасць бліжэй пазнаёміцца з буйнейшымі заводамі і фабрыкамі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі і калгасамі, помнікамі гісторыі і культуры, наогул з рознымі славутасцямі заходніх абласцей Беларускай ССР. Праўда, ён не адразу згадзіўся абмежаваць сферу сваёй увагі толькі Заходняй Беларуссю: у адзінай сям'і народаў СССР значных поспехаў у розных галінах сацыяльнага і культурнага жыцця дасягнулі і іншыя рэгіёны рэспублікі. Але потым мусіў пагадзіцца, што ў кароткаметражным фільме нельга ахапіць увесь матэрыял. Жанр фільма дазваляў сцэнарысту абысціся газетна-рэпартажнай канстатацыяй цікавых фактаў, пералічэннем дасягненняў працоўных былой Заходняй Беларусі за гады савецкай улады. Тым больш што дасягненні гэтыя былі відавочныя, неаспрэчныя. Аднак А. Макаёнак не пайшоў па шляху найменшага супраціўлення, справядліва мяркуючы, што бяскрылае каментатарства прывядзе да павярхоўнасці. І якія б уражліва-грандыёзныя ні былі панарамы новабудоўляў, гмахі індустрыяльных гігантаў, аднак без чалавека ўсе яны — не больш чым цікавыя малюнкі. Вось чаму сцэнарыст пастаянна скіроўвае ўвагу аператараў, а тым самым і гледачоў на людзей заходнебеларускага краю. Вядома ж, ён не мог абысціся без згадкі актывістаў КПЗБ. Буйным планам выступаюць Міхаіл Трафімавіч Анішчык, Іван Якаўлевіч Дабрыян, Міхаіл Раманавіч Скок... Тут жа прапануецца гледачу пазнаёміцца з прывабнай постаццю Паўла Арсеньевіча Жалезняковіча, былога падпольшчыка, а цяперашняга сакратара Карэліцкага райкома партыі. Галерэю кінапартрэтаў працягвае даярка Соф'я Сап'янік, ткачы Іван, Пётр, Міхаіл, Жанна і Тамара Купрашэвічы, народны ўмелец Іосіф Бохан, студэнты Вера Дзенісюк і Пётр Сідарчук, чыгунпачніца Антаніна Шчэрба і іншыя. Толькі праз лёсы людзей можна ўражліва раскрыць лёс краю. Стваральнікам фільма гэта задача скарылася, глядач фільм прыняў. У рэцэнзіі на фільм гаварылася:

«Фільм расказвае пра людзей заходніх абласцей Беларусі, пра іх барацьбу за сваё вызваленне з-пад прыгнёту белапольскай Польшчы, пра радасныя дні ўз'яднання ў адзінай шматнацыя-

нальнай сям'і братніх народаў Савецкага Саюза, пра патхнёную працу рабочых, хлебаробаў і інтэлігенцыі, пра іх вучобу і адпачынак...

Цікавы фільм стварыла студыя «Беларусьфільм». Яго нельга глядзець без хвалявання» («Гродненская правда», 1958, 31 студзеня).

Над фільмам працавалі рэжысёры І. Вейняровіч і П. Шамшура, аператары В. Цяслюк і М. Бераў, гукааператар В. Усціменка, музычнае афармленне Я. Буніна.

А. Макаёнак сваю працу над фільмам «У адзінай сям'і» ацэньваў вельмі сціпла. Ні ў анкетах, ні ў спісах уласных твораў няма пра гэта нават упамінання. А між тым паездкі па рэспубліцы з кіназдымачнай групай мелі для яго не толькі пазнаваўчае значэнне, яны прывучалі глядзець на аб'екты мастацкага адлюстравання «вачамі» кінематографа. А такое пашырэнне дыяпазону ўспрыняцця надзвычай карыснае для тэатральнага пісьменніка.

## СЧАСТЬЕ НАДО БЕРЕЧЬ (с. 63—120)

Кінасцэнарый напісаны на аснове вядомай аповесці А. Кулакоўскага «Нявестка». Ініцыятыва экранізацыі аповесці зыходзіла з боку кінастудыі, а выбар сцэнарыста падказаў яе аўтар. Сцэнарый паступіў на кінастудыю 1 сакавіка 1957 года, хоць дагавор быў падпісаны яшчэ ў студзені 1955 года. А. Макаёнак шмат працаваў над творам, рабіў шматлікія ўдакладненні, стараўся пры пераводзе аповесці на мову кіно пазбегнуць па магчымасці страт.

«Экранізацыя «Нявесткі»,— сцвярджаюць гісторыкі кіно,— была справай яўна нялёгкай. А. Кулакоўскі, выкарыстоўваючы магчымасці празаічнага жанру, па ходу развіцця сюжэта аповесці шырока каменціраваў выказванні і ўчынкі герояў. Адмовіўшыся ад закадравага аўтарскага голасу, сцэнарыст А. Макаёнак павінен быў кампенсаваць адсутнасць аўтарскіх каментарыяў больш дэталёвай распрацоўкай характараў і сітуацый.

Сюжэтная лінія першакрыніцы падверглася ў сцэнарыі некаторым зменам, з'явіліся новыя эпізадычныя персанажы, пераразмеркаваліся функцыі асобных герояў. Сцэнарысту ўдалося пазбегнуць фрагментарнасці і ілюстрацыйнасці, якія часта спадарожнічаюць экранізацыі» («История белорусского кино». Мн., 1970, с. 52—53).

Сапраўды, у сцэнарыі з'явіліся новыя героі: кладаўшчык, Каця, культасветработнік Вася, але ўвядзенне іх не супярэчыла логіцы развіцця сюжэта першакрыніцы, не парушала яе сістэму вобразаў. Затое сцэнарый набыў большую грунтоўнасць, абагаціўся чыста сцэнічнымі выяўленчымі дэталямі.

На адным з першых пасяджэнняў мастацкага савета кінастудыі «Беларусьфільм» адзначалася, што А. Макаёнку ўдалося стварыць глыбокі, вострадраматычны твор пра людзей калгаснай вёскі, намаляваць каларытныя характары большасці дзейных асоб. Ухвалена таксама задума сцэнарыя, якая, на думку членаў савета, заключалася ў тым, што кожны чалавек заўсёды, пры любых абставінах павінен быць сумленным як у адносінах да працы, так і ў сваіх узаемадачыненнях з людзьмі. Першы прагляд чарнавога мантажу адбыўся 23 лістапада 1957 года. Камісія ста-

поўна ацаніла работу і сцэнарыста, і пастановачнай групы. Разам з тым былі выказаны і пэўныя заўвагі і прапановы:

1) Актывізаваць ролю станоўчых герояў сцэнарыя (сцэна камсамольскага сходу, сцэна клуба).

2) Узмацніць канфлікт паміж Данілам і Шандыбовічам, зрабіўшы акцэнт на супрацьстаўленні іх адносін да грамадскай працы і спраў калгаса.

3) Вызначыць матывы паводзін Шандыбовіча, мэту яго ўчынкаў.

4) Зрабіць больш пэўнымі ўзаемаадносіны Віктара і Шандыбовіча ў фінале сцэнарыя.

5) Заматываваць вяртанне Віктара дамоў у фінале сцэнарыя.

6) Сюжэтна завяршыць гісторыю з «трыма гектарамі льну».

7) Не акцэнтаваць увагі на сцэнах, якія паказваюць беднасць Данілы, і не згушчаць цёмных фарбаў быту калгаснай вёскі (самагон). Звярнуць большую ўвагу на светлыя моманты жыцця калгаснікаў (ЦДАМЛМ, ф. 112, в. 1, адз. зах. 341, с. 9—10).

На заключных абмеркаваннях аўтара папракалі за тое, што вобразы станоўчых герояў атрымаліся менш яркія за адмоўныя. Праўда, пасля выхаду фільма на экраны папрокаў паменела. Гледачу фільм спадабаўся. Крытыка таксама прыняла яго амаль без агаворак.

«А. Макаёнак,— пісаў В. Буран,— не пайшоў слепа за аповесцю і не абмежаваўся веданнем калгаснага жыцця, пачэрпнутым толькі з аповесці, а, маючы шмат уласных жыццёвых назіранняў, пераплавіў і адліў матэрыял аповесці ў новую форму.

У фільме шмат творчых знаходак, запамінальных дэталей: дзеянне яго разгортваецца імкліва і востра. Першыя ўжо кадры прыцягваюць увагу гледача» («Літаратура і мастацтва», 1958, 17 мая).

Фільм «Счастье надо беречь» расцэньваўся публікай і крытыкай як значны поспех кінастудыі «Беларусьфільм». Тамара Бушко невыпадкова назвала сваю рэцэнзію «З удачай вас, беларускія кінематаграфісты». «Трэба аддаць належнае пастановачнаму калектыву,— у прыватнасці, пісала яна,— фільм атрымаўся ўдалы, нягледзячы на асобныя пралікі, і гледачы цёпла прымаюць яго. Хвалюючая тэма барацьбы за ўздым сельскай гаспадаркі арганічна пераплятаецца ў карціне з асабістай драмай герояў, выклíканай рознымі пазіцыямі, якія займаюць яны ў гэтай барацьбе. Такім чынам, галоўная вартасць фільма ў тым, што ў ім асабістае неадрыўна звязана з грамадскім, адно абумоўлівае другое, прычым спалучэнне асабістых і грамадскіх інтарэсаў тут выступае, не ў прыклад некаторым схематычна-ілюстрацыйным фільмам мінулага, у шчаслівым аднінстве, зусім так, як гэта бывае ў жыцці» («Чырвоная змена», 1958, 17 мая).

Над фільмам працавалі рэжысёр І. Шульман, аператар Г. Удавенкаў, кампазітар Д. Лукас, мастак Ю. Булычоў, гукааператар В. Дзёмкін. Ролі выконвалі: Даніла — К. Скорабагатаў, Віктар — Ю. Саранцаў, Ларыса — Д. Сталярская, Шандыбовіч — В. Палінаймака, Вольга — Н. Дарошына, стары калгаснік — Б. Кудраўцаў, Вася — В. Іваноў, Кацця — Д. Рытэнбергс, нямы — С. Хацкевіч, Мікіта — А. Барановскі. У эпізодах таксама здымаліся: С. Станюта, К. Кулакоў, І. Дабралюбаў, А. Дзянісава, А. Клімава, Н. Гейц, Г. Макарава.

Драматург з задавальненнем успамінаў работу над сцэна-

рыем. Прычыны гэтага пачуцця шукаць далёка не даводзіцца, дастаткова толькі параўнаць ідэйна-тэматычныя параметры «Нявесткі» А. Кулакоўскага з тымі праблемамі, якія вырашаў А. Макаёнак у сатырычнай камедыі «Выбачайце, калі ласка!». А пячэ ж у сцэнарыста была камедыя «Каб людзі не журыліся», у якой маральна-бытавыя, сацыяльна-псіхалагічныя праблемы тагачаснай сельскай рэчаіснасці паказваліся не менш драматычна, абвострана-праўдзіва, чым у «Нявестцы». Наяўнасць у творчым багажы такіх твораў, як «Выбачайце, калі ласка!» і «Каб людзі не журыліся», вытлумачвае, чаму А. Макаёнак так настойліва змагаўся супраць пераводу фільма ў сферу даследавання сямейна-бытавых узаемаадносін. Так, сямейнае шчасце таксама трэба берагчы, але ці можа чалавек да канца адчуваць сябе шчаслівым нават у сям'і, калі ў сферы яго працоўнай дзейнасці пануюць разлад, безгаспадарчасць, валюнтарызм. А. Макаёнку імпанавала ў аповесці тое, што яе аўтар мог за прыватнымі, «камернымі» праявамі жыцця разгледзець праблемы вялікага сацыяльна-палітычнага гучання, напаўнення. Адной з такіх праблем была праблема барацьбы з п'янствам. І зусім невыпадкова антыалкагольная тэндэнцыя была фарсіравана А. Макаёнкам у сцэнарыі. Вядома, у сярэдзіне 50-х гадоў п'янства яшчэ не захліснула беларускую вёску, але мастак тым і адрозніваецца ад звычайнага чалавека, што ён празорліва бачыць пэўную з'яву ў перспектыве. Апрача блізкіх праблем сцэнарыста прываблівалі ў аповесці характары, іх драматургічная выразнасць, стэрэаскапічнасць, рухомасць. Ён добра разумеў, што менавіта адкрыццё такіх цікавых жыццёвых тыпаў, як Шандыбовіч, Даніла, Віктар, Ларыса і іншыя забяспечыла аповесці шырокі поспех у чытача. Таму адну са сваіх задач сцэнарыста ён бачыў у тым, каб мовай кінематографа раскрыць рагэтыя характары, а праз іх дапесці болі і турботы, клопаты і радасці тагачаснага сельскага працаўніка. Крытыкуючы непарадкі, ён думаў пра адно — каб людзі не журыліся, каб жыццё наша рабілася лепшым.

Напісанне сцэнарыя «Счастье надо беречь» хоць і не стала вяхой у творчай дарозе А. Макаёнка, але адыграла тым не менш несумненную пазітыўную ролю, пашырыўшы яго мастакоўскія далягляды.

## КАНДРАТ КРАПІВА (с. 121—138)

Фільм меркавалася зняць да 65-годдзя з дня нараджэння Кандрата Крапівы. Аднак з тэрмінамі атрымалася няўвязка. Нават сцэнарый быў здадзены амаль праз тры месяцы пасля юбілею пісьменніка: пад апошнім радком чарнільнай ручкай стаіць подпіс аўтара сцэнарыя і дата — 1.IV.1961 года. Пачатковая назва — «Народны пісьменнік». Пастаўлены Мінскай студыяй навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў у 1961 г.

У заключэнні сцэнарнага аддзела кінастудыі, у прыватнасці, гаварылася: «Беларускі драматург Андрэй Макаёнак добра ведае творчасць і жыццёвы шлях народнага пісьменніка Беларусі Кандрата Крапівы. Акрамя таго, ён асабіста добра знаёмы з нашым вядомым драматургам і сатырыкам. Усё гэта дало магчымасць А. Макаёнку стварыць праўдзівы і ў асноўным цікавы сцэнарый хранікальна-дакументальнага фільма аб народным пісьменніку. Вельмі ўдалы, па нашу думку, пачатак сцэнарыя, у якім перада-

юцца любоў і павага народа да свайго любімага пісьменніка, умела паказвасцца першае знаёмства гледача з героямі фільма. Удала падабрана і выкарыстана ў сцэнарыі творчасць пісьменніка, вядомыя байкі, урыўкі з п'ес» (ЦДАМЛМ БССР, ф. 163, в. 1, адз. зах. 17, с. 394). Запушчаны ў вытворчасць сцэнарый 19 жніўня 1961 года. Праз два месяцы здымкі цалкам былі завершаны. У акце прыёмачнай камісіі, ад 31 кастрычніка 1961 года, чытаем:

«Гэтага чысла прыняты закончаны вытворчасцю двухчасткавы чорна-белы фільм «Кандрат Крапіва».

Аўтар сцэнарыя і дыктарскага тэксту А. Макаёнак. Рэжысёр — С. Браудэ. Аператар — Ю. Іванцоў. Рэдактар — П. Прыходзька. Музычнае афармленне — І. Лісневіч. Дыктар Л. Валодзін. Дырэктар — С. Гурэвіч.

В. а. дырэктара Мінскай кінастудыі Ф. Руцкі» (ЦДАМЛМ БССР, ф. 163, в. 1, адз. зах. 17, с. 270).

Фільм не толькі здымаўся гэтак аператыўна, але не затрымаліся і водгукі на яго. Не прайшло і месяца пасля яго прыёмкі, а газета «Літаратура і мастацтва» змясціла рэцэнзію пад назвай «Старонкі творчага жыцця». Рэцэнзія цалкам ухвальная, новая работа Мінскай кінастудыі ацэньвалася вельмі высока. Адзначаны ўдалы падбор ілюстрацыйнага матэрыялу. «Значна ўзбагачаюць фільм,— пісаў рэцэнзент,— урыўкі з п'ес К. Крапівы ў выкананні артыстаў тэатра імя Янкі Купалы. Майстэрства Г. Глебава, Л. Рахленкі, Б. Платонава, Л. Ржэцкай, В. Пола, Ул. Дзядзюшкі і іншых майстроў беларускай сцэны ў спалучэнні з талентам драматурга надало дакументальнаму парысу прывабныя якасці мастацкага ігравога фільма: дакладнасць перадачы самых тонкіх пачуццяў, наяўнасць унутраных канфліктаў і г. д. Тут аўтары не паскупіліся на паказ драматургіі Крапівы. Ад сарказму да тонкай іроніі, ад публіцыстычнай просталінейнасці да мяккага спачування — увесь гэты багаты арсенал сродкаў мастака раскрывае задуму аўтараў фільма. Гэта, бадай, самыя эмацыянальныя эпізоды парыса. Зроблены яны з густам і пачуццём меры. Яны ні ў якім разе не разрываюць плынь асноўнай лініі фільма, не вырываюцца з дакументальнай тканіны жыцця сатырыка.

На высокім прафесіянальным узроўні зроблена тая частка парыса, дзе гаворыцца аб творчасці К. Крапівы ў гады Вялікай Айчыннай вайны» («Літаратура і мастацтва», 1961, 24 лістапада).

Сам А. Макаёнак фільмам у цэлым быў задаволены, аднак лічыў, што лёс старэйшага таварыша па пяру мог бы стаць асновай вялікай мастацкай кінакарціны. Неаднойчы прызнаваўся, што задума такой карціны моцна непакоіць яго.

## РОГАТЫЙ БАСТИОН (с. 139—204)

Сцэнарый поўнаметражнага, шырокаэкраннага, каляровага фільма «Рогатый бастион» напісаны на аснове папулярнай камедыі «Лявоніха на арбіце». Першае яго абмеркаванне адбылося 2 студзеня 1961 года, на якім сцэнарый хвалілі за актуальнасць праблематыкі, за цікавае вырашэнне тэмы, за наяўнасць яркіх сацыяльных тыпаў. Крытыкавалі ж яго за рудыменты тэатральнага твора, пэўную невыразнасць фіналу. 16 лютага 1962 года мастацкі савет кінастудыі «Беларусьфільм» прыняў сцэнарый з добрай ацэнкай. Праўда, запуск у вытворчасць зацягнуўся па розных прычынах да 29 лістапада 1962 года. Дарэчы будзе ска-

зацъ, што пяўвязак, пакладак і непаразуменняў пры пастаноўцы «Рогатого бастиона» з'яўлялася столькі, што іх хапіла б на здымкі добрых дзесяці фільмаў. Спачатку меркавалася, што над фільмам будуць працаваць два рэжысёры: П. Васілеўскі і С. Сплашноў. Але праз два месяцы апошні з іх адмовіўся ад супрацоўніцтва, выразіўшы такім не вельмі радыкальным чынам сваю нязгоду з агульнай пастановачнай канцэпцыяй фільма, працу над якім працягвалі апрача П. Васілеўскага аператары В. Акуліч і В. Арлоў, кампазітар М. Марутаеў, гукааператар В. Дзёмкін.

Гэта была першая самастойная работа рэжысёра П. Васілеўскага, і яму не заўсёды ўдавалася трымаць пад сваім кантролем увесь вытворчы працэс. Часта незадаволенымі аказваліся рэдактары, аўтар сцэнарыя, кіраўніцтва кінастудыі. А да ўсяго яшчэ дадалася неабходнасць пераздымаць значную колькасць адзнятага на няякасную плёнку матэрыялу. Зусім натуральна, што планавы тэрмін здачы ў студзені 1964 года быў безнадзейна сарваны. Паспрабавалі прыняць фільм у красавіку гэтага ж года, але беспаспяхова. Прычыны гэтага збольшага прачытваюцца ў радках заключэння Мастацкага савета:

«Апавядальная манера выкладання прывяла да простая лінейнасці мантажных рашэнняў, а гэта пацягнула за сабой страту дынамікі развіцця дзеяння і рытму фільма. Пагэтаму, нягледзячы на тое, што па карыснаму метражу фільм склаўся ў прымальных нормах для камедыйнай ленты, ён здаецца зацягнутым.

Трапіўшы ў палон шматлікіх і супярэчлівых парад, пярэдка прадыктаваных чыста густавымі меркаваннямі, а таксама прамых указанняў, якія зыходзілі з боку рэдактуры, аўтара і ведамасных асоб, што праглядвалі матэрыял, рэжысёр-пастаноўшчык заблытаўся, страціў правільную арыентацыю ў сваіх спробах выканаць усе патрабаванні і парады» (ЦДАМЛМ БССР, ф. 112, в. 1, адз. зах. 416, с. 442).

Фільм ратавалі, як хто мог. Прапаноўвалі запрасіць на дапамогу рэжысёра Л. Гайдая, які ў гэты час набліжаўся да зеніту сваёй славы майстра кінакамедыі. Запрашалі шматлікіх кансультантаў. Сам П. Васілеўскі слаў адчайныя пісьмы на імя старшыні Дзяржкамітэта па кінематаграфіі пры Савеце Міністраў БССР В. Паўлёнка і дырэктара кінастудыі «Беларусьфільм» І. Дорскага, у якіх прасіў даць яму большую свабоду, фармуляваў канкрэтныя прапановы, планы паляпшэння фільма (ЦДАМЛМ БССР, ф. 112, в. 1, адз. зах. 365, с. 46—49). Рэжысёра можна было зразумець. Кансультанты, у тым ліку і Л. Гайдай, былі людзьмі староннімі, не ўсім ставала жадання глыбока прапікаць у творчую задуму, дакопвацца да прычын мастацкіх пралікаў. Было б намнога лягчэй, калі б П. Васілеўскі ва ўсім знайшоў агульную мову з аўтарам сцэнарыя. Але паміж імі рознагалоссі пачаліся яшчэ на стадыі выбару акцёраў на ролі. А. Макаёнак лічыў, што лепш за беларускіх акцёраў ніхто не ўвасобіць, не перадасць, не адлюструе праблемы беларускай рэчаіснасці. А тым не менш у фільме былі заняты П. Канстанцінаў (Глуздакоў) і В. Харкова (Лушка) з Малога тэатра; А. Грыбаў (Мікалай Сяргеевіч) і С. Блінпікаў (Буйкевіч) — з МХАТа; Г. Обручава (Соня) — з тэатра імя Маякоўскага; У. Ратамскі (Максім) — з тэатра Савецкай Арміі; У. Ферапонтаў (Міхаіл) — са студыі кінаакцёра; М. Крыпіцына (Клава) — са студыі імя Даўжэнкі. І толькі дзве ролі: Лявона і Цесакова выконвалі артысты тэатра імя Янкі Купалы

Павел Кармунін і Раман Філіпаў. Ды і то П. Кармунін стаў купалаўцам толькі ў 1964 годзе.

У рэшце рэшт 30 мая 1964 года з пэўнымі агаворкамі фільм быў прыняты. У заключэнні сцэнарнай рэдакцыйнай калегіі Галоўнага ўпраўлення мастацкай кінематаграфіі, у прыватнасці, гаварылася:

«У фільме «Рагаты бастыён» у востракамедыйнай форме аўтары імкнуцца выразіць актуальныя маральна-этычныя праблемы жыцця сённяшняй вёскі. Сваім вастрыём фільм накіраваны супраць прыватнаўласніцкіх памкненняў, грамадскай інертнасці і кансерватызму.

На жаль, у кінематаграфічным рашэнні пастаўленай тэмы аўтарам не ўдалося дасягнуць поўнай мастацкай перакананасці знайсці дакладнае ўвасабленне асноўных вобразаў п'есы. Не заўсёды ўдалы падбор акцёраў, у асаблівасці на ролі маладых калгаснікаў. Рэжысёрскае рашэнне фільма часцяком грашыць павярхоўнай трактоўкай эпізодаў і характараў персанажаў. Камедыйнага эфекту ў шэрагу сцэн рэжысёр імкнецца дасягнуць чыста знешнімі сродкамі, не заўсёды вытрымліваючы пры гэтым пачуццё меры і густу» (ЦДАМЛМ БССР, ф. 112, в. 1, адз. зах. 365, с. 20).

Думаецца, фільм «Рогатый бастион» так абвострана крытыкаваўся яшчэ і таму, што ён прайграваў у параўнанні са спектаклем. Пастановачных агрэхаў у ім і сапраўды хапала, але іх было не так і многа, каб цалкам перакрэсліць твор. Пэўнага ўзроўню рэжысёр усё ж дасягнуў, пра што і гаварылася ў заключэнні мастацкага савета кінастудыі «Беларусьфільм»:

«І тым не менш фільм у цэлым уяўляецца творам арыгінальным, у многім удалым, а ў сэнсе асваення новых відаў кінематографа для беларускага кіно і павучальным. Яго безумоўнай вартасцю з'яўляецца праўдзівы паказ некаторых бакоў побыту сучаснай калгаснай вёскі. І ў гэтай сувязі вобраз Лявона — несамавітага прыхільніка ўласнасці, неабходнай або непатрэбнай, але ўласнасці, якога таленавіта сыграў артыст П. Кармунін, уяўляецца безумоўным поспехам сцэнарыста, рэжысёра і ўсяго творчага калектыву фільма. І нават той факт, што артыст не заўсёды дакладны ў перадачы нацыянальных рысаў характару, якія раскрываецца ім, не можа прыменшыць гэтага галоўнага поспеху камедыі.

Побач з Лявонам і іншыя персанажы — яго антыподы — успрымаюцца, як вобразы ў аснове сваёй жыццёвыя і праўдзівыя. Праўда, і тут маюцца грашкі, якія ідуць ад недакладнасці рэжысуры. Гэтыя персанажы тыпажна недастаткова верагодныя, іх моўная характарыстыка і манера паводзін недастаткова дакладна ўскрываюць характар жыхароў беларускай вёскі.

Галоўная думка твора зводзіцца не да праблемы прысядзібнага ўчастка ці наяўнасці каровы ў асабістай гаспадарцы калгасніка, а да таго, што пачуццё ўласнасці ў Лявона аказалася да смешнага неадпаведным, што яно пазбавіла яго нармальных кантактаў з аднавяскоўцамі і па сутнасці адлучыла ад калгаснай вытворчасці. У гэтай сувязі меркаванне сакратара абкома (гэта роля дасталася А. Грыбаву) аб тым, што змяншэнне памеру прысядзібнага ўчастка ёсць «лінія», гэтак жа, як і канцоўка фільма, якая нясе тую ж думку, уяўляюцца недакладнымі.

Да некаторых слабасцей фільма могуць быць аднесены і мно-

гія дыялогі, якія аказаліся недастаткова дынамічнымі, выразнымі, слаба гарманіруючымі з выяўленчым матэрыялам шэрагу кадраў і сцэн» (ЦДАМЛІМ БССР, ф. 112, в. 1, адз. зах. 416, с. 430).

Прыведзеныя вышэй вытрымкі з заключэнняў розных камісій не могуць, вядома, адлюстраваць у падрабязнасцях характар абмеркаванняў, сутнасць усіх прэтэнзій, выказаных у адрас фільма. І ўсё ж нават з гэтых скупых урыўкаў можна скласці дастаткова поўнае ўяўленне, чым не задавальняў фільм апанентаў. Перш за ўсё — канцэптуальнай расплывістасцю, якая была абумоўлена рэжысёрскім імкненнем да шырокіх, ледзь не глабальных абагульненняў. Менавіта па жаданні рэжысёра ў канчатковым варыянце сцэнарыя з'явіўся такі пачатак:

«Древний, сказочный лес, с древними, уму современного цивилизованного кинозрителя непостижимыми и потому почти неправдоподобными зверями, птицами, ящерями и иной млеко- и не млекопитающейся чертовщиной...

Громовым эхом разносится по лесу надрывное мычание коровы.

Звери в страхе разбегаются.

Посреди лесной поляны стоит корова (первобытная!), лианами привязанная за ноги, рога и даже хвост к деревьям. Распятая таким образом, она беспомощно косится злобными глазами на человека, прикрытого в основных местах шкурами, обнявшего ее за шею...

Это наш герой. Пока что безымянный — в те древние времена имен еще не было. (Но чтобы кинозритель XX века смог приметить его с тех доисторических времен, оставим ему... заурядную, купленую в сельпо шапку-ушанку с оборванными тесемками и потешно обвислыми ушами.) Наш безымянный герой неумело бормочет только одно понятное современному цивилизованному человеку слово:

— Муя! Муё! Моя!

Услыхав уже явственное и отчетливое: «Моя!» — корова замолкает и покорными, печальными глазами обреченно смотрит на своего покорителя. Покоритель победно ухмыляется... И в ответ ему раздается, как бы доносящийся из тьмы веков, голос:

«Эта смешная и немного грустная история началась еще в глубокой древности...»

Можна зразумець рэжысёра: без дадатковай падсветкі гісторыя Лявона Чмыха на экране магла б выглядаць занадта камернай. Але, надаўшы ёй такую глабальную абагульненасць, глыбокую рэтраспекцыю, ён не здолеў адшукаць надзейных кантрапунктаў, якія перакінулі б масткі да тых вельмі канкрэтных, пэўным чынам абумоўленых праблем, над вырашэннем якіх ламалі галаву героі п'есы і сцэнарыя. Парадокс заключаецца ў тым, што, замахнуўшыся на шырокае абагульненне, аўтары фільма звузілі «спектр» разумення, асвятлення некаторых праблем. Думаецца, залішне шчодрай была ў сваіх ацэнках І. Вішнеўская, калі сцвярджала:

«І вельмі правільна, здаецца мне, пабудаваны тыя сцэны фільма «Рогатый бастион», якія зроблены па п'есе «Лявоніха на арбіце», дзе карова гэта, прадмет асаблівай любві Лявона, зроблена ў выглядзе мультыплікацыі. Нейкая мультыплікацыйная карова з вялізнымі, па-дурному расстаўленымі ў розныя бакі рагамі мітусіцца па экране, нібы адлучаючы, «адбіваючы» сур'ёзныя эпізоды камедыі. Карова тут несур'ёзная, яна жарт, яна «муль-

цяшка», япа дзіцячая прыдумка, цацка, забава, з якой носіцца даросле дзіця, чым бы ні цешылася, абы не плакала. А калі мультыплікацыйная бела-ружовая карова знікае, на экран выступаюць рэальныя сур'ёзныя-смешныя людзі з макаёнкаўскай камедыі, якіх турбуе, непакоіць, прымушае пакутаваць нешта, нашмат больш важнае, істотнае, чым тоўстая ўласная карова» (Вишневская И. Комедия на орбите. М., 1979, с. 138).

Што праўда, то праўда: карова ў фільме і сапраўды выглядае несамавіта, але гэтак жа выглядае ў ім і Лявон. А ў п'есе ён — фігура ў нечым маштабная, таму і праблемы, да якіх ён дачыняецца, выглядалі адпаведна. У пісьмах, якія згадваліся вышэй, рэжысёр выказваў крыўду на аўтара за тое, што ён, маўляў, упарта не згаджаецца на скарачэнне «размоў» у сцэнарыі. Драматурга ж па сутнасці папракаць не варта было: для яго гэтыя «размовы», дыялогі — адзіная магчымасць прасвятліць уласную пазіцыю, вытлумачыць характары герояў. Можна з поўнай упэўненасцю сказаць, што далёка не ўсе змяненні, якія атрымаў сцэнарый у параўнанні з п'есай, пайшлі яму на карысць.

Праўда, некаторыя з іх былі арганічнымі: сцэна на рыбалцы, у сельскім клубе і іншыя. Арганічным было і пашырэнне колькасці дзейных асоб. У сцэнарыі з'явіліся наступныя персанажы: бібліятэкар, жонка Глуздакова, сяброўка Соні, кіраўнік танцаў, парыхтоўшчык у прыёмнай, калгаснік фермы, баяніст, даярка на сватаўстве, наведвальнік райвыканкома, медсястра палікінікі, артыст самадзейнасці, пажылы калгаснік на сходзе, калгасніца на сходзе. Уносіліся змяненні і ў сам сцэнарый. Напрыклад, сцэны ў бібліятэцы ў пачатковым варыянце атрымалі наступны выгляд:

«Левон вошел в вестибюль клуба. В вестибюле шли занятия хореографического кружка. Девушки, которых мы уже видели на колхозных фермах, на сватовстве у того же Левона, под руководством тощей, пожилой женщины, видимо специально приглашенной из города, разучивали народный танец.

Левон покосился на знакомых доярок и телятниц и машинальным жестом пригладил свои редкие, недосмотренные усы. Под монотонную команду руководительницы «раз-два-три» девушки выполняли упражнения. Заметив Левона, некоторые из них застеснялись. Тогда тощая руководительница грозно посмотрела на Левона, и он, предупредительно выставив ладони, торопливо засеменил...»

Некалькі разоў вар'іраваўся фінал сцэнарыя. На адным з этапаў яго дапрацоўкі тая несур'ёзная, мультыплікацыйная карова мусіла самахоць рушыць на ферму. І ніякіх праблем! А яны былі. Ды яшчэ якія! Для параўнання прывядзём урывак яшчэ з адной драмы — жыццёвай. Даярка падмаскоўнага саўгаса «Пятроўскае» Герой Сацыялістычнай Працы Лідзія Мікалаеўна Міронава ўспамінае мінавіта той час, пра які ідзе гаворка ў сцэнарыі «Рогатый бастион»:

«Мы мелі свае ўчасткі, вырошчвалі кукурузу, гародніну. Такі вялізны гарбуз аднойчы вырасцілі — на ВДНХ трапілі! Мае бацька і маці заўсёды ў павазе хадзілі. Сумленна ўсякую работу выконвалі...

Іншае памятаю. Як зводзілі са двара нашу карову Зорку (дарэчы, і Лявонаву карову звалі гэтак жа.— *С. Л.*). Карміць не было чым. У пачатку шасцідзесятых. Калі аналчыліся супраць

асабістых надсобных гаспадарак... Як плакала Зорка, якія буйныя слёзы каціліся. І як плакалі, крычалі мы, дзеці... З таго самага дня і кіпіць ува мне нянавісць да ўсякага бюракратычнага нахрапу, галавацяпства, бяздушнасці» («Правда», 1986, 22 лістапада).

Вось тыя пачуцці, якіх не хапіла стваральнікам фільма і дэфіцыт якіх не дазволіў фільму стаць падзеяй беларускага кінематографа. Асобныя ўдалыя моманты, яркія мастацкія знаходкі — у тым ліку і рэжысёрскія — не здолелі выратаваць фільм у цэлым.

## ПОСЛЕ ЯРМАРКИ (с. 205—235)

Сцэнарый поўнаметражнага тэлевізійнага каляровага мастацкага фільма «После ярмарки» напісаны па матывах славутай камедыі Янкі Купалы «Паўлінка». Першае абмеркаванне на мастацкім савеце ВТА «Тэлефільм» адбылося 13 сакавіка 1972 года. «Мастацкі савет,— гаварылася ў заключэнні гэтага абмеркавання,— з задавальненнем адзначае, што аўтар насычае сцэнарый новымі эпізодамі (кірмаш, свята Івана Купалы), імкнецца максімальна напоўніць іх дзеяннем, народнымі танцамі, народнымі абрадамі і звычаямі, уводзіць новыя асобы, якія ўвасабляюць сабой самадзяржаўе. Напрыклад, гратэскавая, велічная і тупая фігура гарадавога. Аўтар выпісвае яго са здзекам і разам з народам пацяшаецца над яго дурнотай.

Перайшоў у сцэнарый галоўны матыў п'есы — разрыў з патрыярхальным бытам, імкненне герояў да свабоды. Захавана сацыяльна-палітычнае гучанне, узмоцнена галоўная тэндэнцыя — паказ выспявання сіл рэвалюцыі ў Беларусі. Гэта выяўлена не толькі ў вобразах Якіма Сарокі і Паўлінкі, але і ў вобразе студэнта і ў паводзінах народа на кірмашы.

У поўнай меры адлюстраваны быт беларускіх сялян, іх духоўная і маральная перавага над шляхцічамі» (ЦДАМЛМ БССР, ф. 112, в. 1, адз. зах, 727, с. 27).

У час абмеркавання адзначалася, што А. Макаёнак удала выкарыстаў прыёмы камічнага, што ўсе выйгрышныя камічныя сітуацыі ён здолеў размясціць у пэўным інтэнсіўным рытме. У параўнанні з п'есай у сцэнарыі уведзена нямала вострых сатырычных момантаў (сітуацыя з партрэтам цара, з пераблытаным Агатай абозам і інш.).

На фоне агульных высокіх ацэнак амаль згубіліся крытычныя заўвагі ў адрас сцэнарыя, хоць і былі яны дастаткова сур'ёзныя. Быў выказаны, напрыклад, папрок, што сцэнарыст змяніў некаторыя характары п'есы, ды, на жаль, толькі ў бок іх павярхоўнага завастрэння. Вобразы галоўных герояў згубіліся сярод другарадных. Не ўсё дакладна прасветлена ва ўзаемаадносінах Паўлінкі і Якіма. Выказваліся таксама заўвагі наконт трактоўкі вобраза Быкоўскага. У п'есе ён яркі камедыйна-сатырычны персанаж, тупы, пыхлівы і нікчэмны шляхцюк, жаніх-няўдачнік, над якім усе пацяшаюцца. У сцэнарыі з-за скарачэння сцэн с танцамі, дыялогаў паміж Быкоўскім і Паўлінкай, Быкоўскім і музыкантамі яго вобраз набыў хутчэй рысы знешняй гратэскавасці, чым унутранай значнасці характару.

Было заўважана, што не ўсе новыя эпізоды арганічна ўплятаюцца ў агульны рытм сцэнарыя. У сувязі з гэтым крытыкаваўся і яго фінал. Зрэшты, адзначаныя недахопы, на думку мастац-

кага савета, мелі прыватны характар, таму на дапрацоўку аўтару вызначылі вельмі кароткі тэрмін — два тыдні. У пачатку красавіка 1972 года пачалася непасрэдная падрыхтоўка да здымкаў фільма. Узніклі некаторыя праблемы з выбарам акцёраў-выканаўцаў асноўных ролей. Яшчэ на абароне пастановачнага праекта была выказана незадаволенасць тым, што не змаглі, дакладней, не захацелі адшукаць беларускіх акцёраў. Самі па сабе вельмі цікавыя акцёры Б. Новікаў і М. Пугаўкін не маглі спасцігнуць нацыянальны каларыт увасабляемых характараў. Больш таго, яны не здолелі нават пераадолець маскоўскі «гаварок». І ўсё ж пасля многіх проб ролі былі размеркаваны наступным чынам: Паўлінка — Л. Сенчына, Крыніцкі — Б. Новікаў, Альжбета — Г. Макарава, Пустарэвіч — М. Пугаўкін, Агата — Л. Маліноўская, Быкоўскі — А. Мілаванаў, Сарока — І. Гаўрылюк, Студэнт — В. Турмовіч, Станавы прыстаў — С. Чэкан, Ураднік — Г. Аўсяннікаў, Поп — С. Хацкевіч. Апрача іх над фільмам працавалі: рэжысёр — Ю. Цвяткоў, аператар — М. Браудэ, гукааператар — Г. Басько, кампазітар — Я. Глебаў, мастак — С. Бжастоўскі.

Фільм у асноўным здымаўся ў Смалявічах, толькі сцэны кірмашу здымалі ў Браславе. Здымкі па розных прычынах зацягнуліся, спатрэбілася так званая пралангацыя. Некалькі эпізодаў давялося здымаць у Ленінградзе, бо Л. Сенчына катэгарычна адмовілася прыязджаць у Беларусь звыш ліміту, абумоўленага дагаворам. Здавалі фільм 23 снежня 1972 года. На яго прыёмцы думкі падзяліліся. Калі фільм у аснове сваёй прызнаваўся ўдалым, то па многіх выяўленчых аспектах выказваліся крытычныя заўвагі. Часам дастаткова вострыя. Не ва ўсім задаволіла рэжысёрская работа, былі заўвагі па касцюмах, па акцёрскім выкананні. Сур'ёзна крытыкаваўся Б. Новікаў, які, на думку многіх выступаючых, стварыў не жывы, паўнакроўны вобраз, а задаволіўся характарнай маскай, іграючы толькі п'яніцу, і больш нічога. А вобраз Крыніцкага багаты не толькі ў плане індывідуальна-псіхалагічным, але і ў сацыяльным. Акцёр здолеў бы адшукаць у характары героя шмат цікавых рысаў, калі б паспрабаваў, напрыклад, дакапацца да вытокаў палкага жадання Крыніцкага з панамі знацца, над шэрым мужыком узняцца. Шмат заўваг было выказана ў адрас А. Мілаванава, выканаўцы ролі Адольфа Быкоўскага. Нечакана прыязна была ўспрынята работа Л. Сенчынай над вобразам Паўлінкі. Абаяльная, лірычная артыстка Ленінградскага тэатра музыкальнай камедыі хутчэй інтуітыўна, чым усвядомлена (для грунтоўнай падрыхтоўчай працы проста не ставала часу) пранікласа адчуваннем вобраза сваёй гераіні, здолела заглыбіцца ў яе складаны духоўны свет. Па астатніх ролях выказвалася таксама шмат цікавых заўваг. Гэтыя рабочыя абмеркаванні мелі на мэце палепшыць (што магчыма) фільм, перад тым як пускаць яго на публіку. А пазнаёміцца з ім глядач атрымаў магчымасць у пачатку 1973 года. Грамадскасць фільм прыняла. Перыядычны друк цёпла вітаў выхад яго на шырокую глядацкую аўдыторыю. Мікола Прашковіч свае адносіны да фільма выразіў ужо і ў самой назве рэцэнзіі: «Добры дзень, Паўлінка».

«Драматург А. Макаёнак,— пісаў рэцэнзент,— выкарыстаў літаратурны тэкст Янкі Купалы, можна сказаць, далікатна. Толькі ў адным месцы заўважаеш значную змену ў параўнанні з першакрыніцай — гэта эпізод вянчання Якіма і Паўлінкі.

Прыгадаем, што і раней пазіралася тэндэнцыя змяняць кан-

цоўку славутай п'есы, хоць гэта прыводзіла да адхілення ад задумы пісьменніка. У сцэнарыі «Пасля кірмашу», які напісаны па матывах п'есы, такі адыход зусім натуральны. Магчымасці экрана значна шырэй за сцэнічныя...

Янка Купала пісаў камедыю ва ўмовах жорсткай царскай цэнзуры. Таму некаторыя матывы ім нібы прыхаваны ў «падтэксце». Экран мог больш ярка выявіць іх, паказаць герояў на багатым гістарычным фоне тагачаснага жыцця.

Спроба зрабіць гэта адчуваецца і ў тым, як «перакладаў» на экранную мову п'есу А. Макаёнак, і ў рэжысёрскіх распрацоўках масавых сцэн Ю. Цвяткова («Літаратура і мастацтва», 1973, 3 ліпеня).

Ацэнкі фільма ў перыядычным друку мала адрозніваліся ад ацэнак яго на мастацкім савеце, прыёмачных і іншых камісіях. Высока ацэнены рэцэнзентамі і гледачамі выкананне ролі Альжбеты народнай артысткай СССР Г. Макаравай, Агаты — артысткай Л. Маліноўскай. Сур'ёзныя закіды рабіліся артыстам Б. Новікаву, М. Пугаўкіну, А. Мілаванаву. Стварыўшы па-свойму яркія, каларытныя вобразы, яны не раскрылі сваіх герояў як сацыяльныя тыпы. Адзначаліся пэўныя акцёрскія знаходкі Г. Аўсяннікава ў вобразе ураднікa і С. Хацкевіча ў вобразе папа.

Фільм «После ярмарки» перыядычна дэманструецца па Беларускім і Усесаюзным тэлебачанні.

## БОЛЬШАЯ ОПАСНОСТЬ (с. 236—283)

Сцэнарый спачатку пісаўся па-беларуску і меў назву «Сем'ям пагражала небяспека». Потым у заяўках для кінастудыі паслядоўна ўзнікалі новыя назвы: «Война и семья», «Если дать им оружие», «Ты помнишь, товарищ», «Внимание, опасность»... Сцэнарый цалкам не друкаваўся. Урывак пад назвай «Сем'ям пагражала небяспека» змяшчаўся ў газеце «Літаратура і мастацтва» (1960, 7 мая). Ва ўрэзцы да гэтай публікацыі гаварылася: «Драматург Андрэй Макаёнак закончыў кінасцэнарый, прысвечаны баявой дружбе чэхаў і беларускіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар скарыстаў сапраўдныя факты баявой дзейнасці партызан Гомельшчыны». А яшчэ раней у дзень трыццацідзевяцігоддзя пісьменніка газета «Чырвоная змена» надрукавала яшчэ адзін урывак, які называўся «На адной дарозе» з уступным словам аўтара сцэнарыя. У ім А. Макаёнак паведамляў: «Навекі праславілі наш народ самаадданыя савецкія патрыёты ў гады Вялікай Айчыннай вайны не толькі на фронце, але і на акупіраванай тэрыторыі, дзе ішла цяжкая і жорсткая барацьба супраць фашысцкай навалы... У першых радах смелых і мужных, адважных і непахісных патрыётаў былі камсамольцы і моладзь. Аб іх гераічных справах, аб цяжкасцях барацьбы ў тыле ворага, аб маладых партызанах, сувязных, разведчыках і расказваецца ў маім кінасцэнарыі, дзе галоўным героем будзе камсамолец Кузьма.

У час вайны гітлераўскае камандаванне выкарыстоўвала вайсковыя часці розных еўрапейскіх краін, акупіраваных фашыстамі, для абслугоўвання сваіх тылоў на нашай зямлі. Былі тут вайсковыя часці і чэхаў. Аднак сімпатыі чэхаў былі на баку нашага народа. Салдаты-чэхі і славакі пры першым выпадку пераходзілі да нас у партызаны. І потым пляча к плячу змагаліся за вызваленне сваіх народаў ад фашысцкіх акупантаў.

Ніжэй друкуецца ўрывак са сцэнарыя, дзе расказваецца аб першай сустрэчы партызана Кузьмы з салдатамі-чэхамі» («Чырвоная змена», 1959, 12 лістапада).

Публікуючы урыўкі са сцэнарыя, аўтар спадзяваўся, што які-небудзь рэжысер загарыцца жаданнем зняць фільм. Але спадзяванні аказаліся марнымі.

Першы варыянт сцэнарыя паступіў на кінастудыю яшчэ ў верасні 1959 года. Ен меў зусім іншы пачатак.

Апрача некалькіх экземпляраў тэкстаў сцэнарыя ў архіве пісьменніка захавалася няшмат дакументаў, якія раскрывалі б гісторыю яго напісання. Есць, праўда, на асобным аркушы паперы спіс дзейных асоб: Кузьма, дзед Мікіта, Лена, Мілан, Дорык, Гюнтэр, Пашка, Васіль, настаўнік, жонка Пашкі, стараста, камандзір, немец-фельдфебель, Ганна. Складзены ён, відаць, у самым пачатку работы над сцэнарыем, бо не ахоплівае ўсіх персанажаў, якія ёсць у канчатковым яго варыянце. У гэты ж час, мусіць, складаўся і план сцэнарыя з васьмі пунктаў: у палоне /у няволі/; дзвюм смярцям не бываць; жывыя; дома /родныя людзі/; зноў са зброяй; помста; бесчалавечнасць; палонныя-саюзнікі; капкан /у сецях/; здрада; браты-славяне; адплата. Несумненную цікавасць уяўляе заключэнне мастацкага савета кінастудыі, падпісаны начальнікам сцэнарнага аддзела М. Гарулёвым:

«Представленный студии первый вариант сценария «Семьям угрожает опасность» раскрывает очень важную и актуальную тему борьбы за мир. Сюжет сценария интересен. Автору в известной мере удались образы главных героев и, в первую очередь, центральный образ Кузьмы. Однако сценарий нуждается в серьезной доработке.

Художественный совет рекомендует автору:

1. Усилить центральный образ Кузьмы, как одного из характерных представителей партизанского движения, наделив его индивидуальными чертами. Это дает возможность сделать ярче поединок Кузьмы и Гюнтера. Следует также отметить, что многие свои героические поступки Кузьма совершает без особых трудностей, слишком легко побеждает врага, действует в одиночку.

2. Более очерченным должен выглядеть комендант Гюнтер, как опытный и сильный противник Кузьмы. Пока что этот образ не получил в сценарии достаточной драматургической и сюжетной нагрузки.

3. Партизанская война должна предстать масштабной, как народная война за свободу и независимость своей Родины.

4. Необходимо продумать в сценарии образы предателей. Видимо, акцент должен остаться на образе Пашки, а полицаи и старосты должны играть в сюжете второстепенные роли...

5. Сильнее надо сделать образ жены Пашки — Ольги, подчеркнув ее честность, преданность Родине, непримиримость к мужу-предателю».

Трэба паставіць сябе на месца аўтара, каб цалкам зразумець усю няпэўнасць заўваг, абстрактнасць патрабаванняў. Чаго варта хоць бы заўвага-пажаданне: «Партызанская вайна павінна прадстаць маштабнай, як народная вайна за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы». Менавіта такой яна і прадстаўлена ў сцэнарыі. З самага пачатку, з самых першых варыянтаў. А патрабаванне «ўзмацніць» вобраз жонкі Пашкі, падкрэсліўшы яе сумленнасць, адданасць Радзіме, само па сабе рацыянальнае. Але падкрэс-

ліванне гэта, аказваецца, патрэбна для таго, каб фарсіраваць пачуцці непрымірымасці Вольгі да мужа-здрадніка. Такое патрабаванне аўтар ні ў якім разе прыняць не мог, бо гэта прывяло б да відавочнай схематызацыі вобразаў, збедніла б не толькі самі характары, але і драматызм барацьбы з фашысцкімі акупантамі.

Зрэшты, рэагаваць на заўвагі аўтару даводзілася абавязкова. Іншая справа — у якой меры. А. Макаёнак быў не з тых, хто ішоў на любыя пераробкі, толькі б паставіць свой сцэнарый. Працуючы над удасканаленнем «Большой опасности», ён ні ў чым не паграшыў супраць сваіх мастакоўскіх прынцыпаў. Канчатковы варыянт сцэнарыя аўтар здаў на кінастудыю 16 студзеня 1960 года. Больш года працягваліся перагаворы, удакладненні, узгадненні, пакуль новыя творчыя задумы не прымусілі драматурга, як гаворыцца, махнуць на сцэнарый рукой. І ўсё ж у творчым плане работа над такім матэрыялам не прапала марна. Без яе А. Макаёнку было б і складаней і, прынамсі, не так вольна і ўпэўнена працаваць над трагікамедыяй «Трыбунал».

## НЕ ПАКІНЕШ МЯНЕ (с. 284—331)

Сцэнарый быў завершаны ў студзені 1969 года. Цалкам нідзе не друкаваўся. Урывак пад назвай «Не пакінеш мяне» публікаваўся ў часопісе «Вожык» (1970, № 21). Гэта была апошняя спроба А. Макаёнка супрацоўніцтва з кінематографам. На кінастудыі адбылося традыцыйнае абмеркаванне сцэнарыя, былі зроблены адпаведныя заўвагі, дадзены тэрмін на дапрацоўку. Аднак драматург больш на кінастудыю не прыйшоў. Навучаны горкім вопытам ранейшага супрацоўніцтва з «Беларусьфільмам», ён вырашыў перарабіць сцэнарый у п'есу. Атрымалася вясёлая і вельмі сур'ёзная па праблематыцы камедыя-рэпартаж «Таблетку пад язык». Сцэнарый таксама задумваўся як своеасаблівы рэпартаж. У некалькіх серыях пісьменнік збіраўся паказаць жыццё сучаснай вёскі, асэнсаваць вынікі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў сельскім побыце. І не яго віна, што гэта задума не рэалізавалася. Калі чытаеш уступ да сцэнарыя, то без цяжкасці ўлоўліваеш сумненні пісьменніка ў магчымасці падобнай рэалізацыі.

«Быў многасерыйны фільм пра Тарзана. Былі пра шпіёнаў. Пра воінскія подзвігі, здаецца, таксама былі. А што, калі пра вёску, пра сённяшнюю? Многасерыйны? Вясёлы! Нават забаўны! А? Задума такая ёсць. Матэрыялу хапае. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя, якая крочыць па планеце, зайшла і ў нашу вёску. І цяпер там адбываюцца цікавыя працэсы. Пачынаецца нешта вельмі новае. Вось аб гэтым бы некалькі серый, а?»

Вось гэта запытальна-рытарычнае «аканне» ішло не ад позы, не ад рысоўкі, а ад шчырай няўпэўненасці. Таму і спыніўся пісьменнік на «першай серыі», пераплавіўшы матэрыял сцэнарыя ў п'есу. У сюжэтна-фабульным плане фільм задумваўся маштабным, шырокапанарамным. Зусім натуральна, што ў п'есу ўвесь матэрыял змясціцца не мог. Давялося адмовіцца і ад некаторых герояў: механік-самавучка Сцяпан, загадчыца птушкафермы Юля, бацька і маці Юлі, шафёр Аркадзь і іншыя. Рэканструяваны многія дыялогі, а сентэнцыі аб прыродзе любві і ляласкі да зямлі прамаўляе не дзед Цыбулька, а сам Каравай. Па-іншаму выглядаюць у сцэнарыі некаторыя героі і г. д.

*Сцяпан Лаўшук*

# ЗМЕСТ

## КІНАСЦЭНАРЫІ

Твой хлеб. *Сцэны сельскага жыцця* . . . . . . 7

У адзінай сям'і. *Сцэнарый дакументальнага кінафільма* . . . . . . . . . . . . . . . . . 56

Счастье надо беречь. *Литературный сценарий по повести А. Кулаковского «Невестка»* . . . . 63

Кандрат Крапіва — народны пісьменнік. *Сцэнарый дакументальнага фільма* . . . . . . 121

Рогатый бастноп. *Киносценарий по пьесе «Левониха на орбите»* . . . . . . . . . . . . 139

После ярмарки. *Литературный сценарий полнометражного художественного цветного музыкального телефильма (по мотивам пьесы Янки Купалы «Павлинка»)* . . . . . . . . . . . 205

Большая опасность. *Киносценарий полнометражного художественного фильма* . . . . . . 236

Не пакінеш мяне. *Літаратурны сцэнарый тэлевізійнага вясёлага фільма* . . . . . . . . . 284

Каментарыі . . . . . . . . . . . . . . 332

Макаёнак А.
М 15 Збор твораў. У 5 т. Т. 3. Кінасцэнарыі. /Уклад і камент. С. С. Лаўшука.— Мн.: Маст. літ., 1989.—351 с., [4] л. іл.
ISBN 5-340-00096-6.
Макаенок А. Собрание сочинений. Т. 3. Киносценарии.

У трэцім томе Збору твораў Андрэя Макаёнка чытачы пазнаёмяцца з кінадраматургіяй. Прапануюцца літаратурныя сцэнарыі фільмаў «Твой хлеб», «У адзінай сям'і», «Шчасце трэба берагчы», «Кандрат Крапіва», «Рагаты баставён», «Пасля кірмашу», «Вялікая небяспека» і «Не пакінеш мяне».

ББК 84Бел7

М $\frac{4702120203-053}{М 302(03)-89}$ 95—89

Литературно-художественное издание

*Макаенок Андрей Егорович*

СОБРАНИЕ СОЧИНЕНИЙ
В ПЯТИ ТОМАХ

Том 3

*Киносценарии*

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском и русском языках

Літаратурна-мастацкае выданне

*Макаёнак Андрэй Ягоравіч*

ЗБОР ТВОРАЎ
У ПЯЦІ ТАМАХ

Том 3

*Кінасцэнарыі*

Рэдактар *М. І. Котаў*. Мастак *Ю. М. Цюрын*. Мастацкі рэдактар *Л. Я. Прагін*. Тэхнічны рэдактар *Т. М. Сокал*. Карэктар *Л. Т. Калюжная*.

ІБ № 2700

Здадзена ў набор 17.06.88. Падп. да друку 29.12.88. Фармат 84×108 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 18,48+0,42 укл. Ум. фарб.-адб. 19,32. Ул.-выд. арк. 19,80. Тыраж 7000 экз. Зак. 1564. Цана 1 р. 60 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.